ЛіМ

Літаратура і мастацтва

газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

28 ЧЭРВЕНЯ 2002г. № 25/4159 КОШТ 3'0 · РУБ.

ЗАПІСЫ
Франца Сіўко
5

ПЯКЕЛЬНАЯ РАНА ЧАРНОБЫЛЯ
Алесь Марціновіч— пра кнігу "Прайсці праз зону"
6—7

НОВЫЯ ВЕРШЫ
Алега Салтука, Кастуся Ільюшчыца, Юрася Нератка
8

РАЗБІТАЕ СЭРЦА ВІТАЎТА
Апавяданне Сяргея Верацілы
9,12

НЕВЫНОСНЫ СВЕТ КАЛІГУЛЫ
Артыкул Вольгі Барабаншчыкавай
10—11

ГОРНЫ АРОЛ
Навела Ганада Чарказяна
13

"МАРГЕР" ПА-БЕЛАРУСКУ
Спадчына Канстанціна Горскага
14—15

БУДЗЬМА РАЗАМ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 2002 ГОДА!

Шаноўныя чытачы!
Падпіска на "ЛіМ" працягваецца.
Кошт індывідуальнай падпіскі на адзін месяц — 1 950 рублёў, на тры — 5 850 рублёў.
Індывідуальны індэкс — 63856.
Кошт ведамаснай падпіскі на адзін месяц — 3 500 рублёў, на тры — 10 500 рублёў.
Ведамасны індэкс — 63857.

Спяваюць птушкі,
не баіцца звер,
Як бы не чулі выстралаў
спрадвеку.
Забыўшыся на страх
і недавер,
Прырода давярае
чалавеку.

Ён тут законны гаспадар
адзін
І азярын,
і лесу,
і прыплоду.
Дзіця прыроды,
разумнейшы
сын,
Ён — сын яе, — не
грозны цар прыроды.

Юрась СВІРКА

Фота А. ВАШЧАНКІ

КОЛА ДЗЁН

"Я не хвалююся за наш суверэнітэт", "Я перакананы прыхільнік суверэнітэту Беларусі", "Федэратыўнай дзяржавы быць не можа", — пад такімі загалоўкамі выходзілі ў рэспубліканскіх газетах кароткія выступленні вядомых палітычных і грамадскіх дзеячаў у адказ на выступленне прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна, у якім ён гаварыў пра сваё бачанне будучай Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Толькі з загалоўкаў можна зразумець, што наша краіна ні пры якіх умовах не стане адным з суб'ектаў Расіі і гарантам гэтага з'яўляецца сённяшняе кіраўніцтва Беларусі. Дарэчы, на гэтым тыдні споўнілася 10 гадоў з дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй.

ВЫБАРЫ ТЫДНЯ

На 90-ай сесіі Міжнароднай канферэнцыі працы ў Жэневе наша краіна выбрана ў Адміністрацыйны савет Міжнароднай арганізацыі працы ў якасці намесніка пастаяннага члена тэрмінам на тры гады. Ад Еўропы разам з нашай краінай таксама выбраны Бельгія, Іспанія, Люксембург, Румынія, Славакія і Турцыя. Кандыдатура нашай краіны атрымана 171 голас пры неабходнай для выбрання колькасці — 114.

ПЕРСПЕКТЫВА ТЫДНЯ

Не за гарой выбары ў мясцовыя Саветы.

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь Лідзія Ярмошына лічыць, што "найбольш прымальным" тэрмінам правядзення выбараў у мясцовыя Саветы з'яўляецца 2 сакавіка 2003 года. У інтэрв'ю "Інтэрфаксу" Л. Ярмошына патлумачыла, што тэрмін паўнамоцтваў дэпутатаў, выбраных у 1999 годзе, заканчваецца 4 красавіка 2003 года. У адпаведнасці з Выбарчым кодэксам выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў праводзяцца не пазней за 30 дзён да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў раней выбраных дэпутатаў.

МІЛАСЦЬ ТЫДНЯ

Прэзідэнт ЗША Д. Буш падпісаў пастанову аб неўжыванні ў дачыненні да Беларусі папраўкі Джэксана-Вэніка да закона аб гандлі 1974 года. На практыцы гэтае рашэнне падаўжае для нашай краіны дзеянне рэжыму нармальных гандлёвых адносінаў у гандлі з ЗША тэрмінам на адзін год.

СТАРТЫ ТЫДНЯ

14 чэрвеня ў Маскве стартавалі чарговыя Міжнародныя спартыўныя юнацкія гульні краін СНД, Балтыі і рэгіёнаў Расіі. Наму краіну прадстаўляюць 218 спартсменаў, якія ўдзельнічаюць у 18 дысцыплінах: баскетболе, валейболе, гандболе, мастацкай гімнастыцы, конным спорце, лёгкай атлетыцы, плаванні, барацьбе грэка-рымскай, самба, настольным тэнісе, фехтаванні, футболе, тэнісе, сінхронным плаванні, сучасным пяцібор'і, спартыўнай гімнастыцы і шахматах. У Маскву беларуская дэлегацыя юных спартсменаў прыехала другі раз. У 1998 годзе, беручы ўдзел у Сусветных юнацкіх гульнях, нашы хлопцы і дзяўчаты заваявалі 5 залатых, 8 сярэбраных і 12 бронзавых медалёў сярод 137 краін свету. Ёсць усе падставы і цяпер нашым юным спартсменам вярнуцца дамоў з высокімі ўзнагародамі.

АДКАЗ ТЫДНЯ

З 14 чэрвеня наша краіна павялічыла цэны на ўсе катэгорыі ўязных віз для грамадзян Літвы на 5 долараў, а на транзітныя — на 3 долары. Цяпер аднаразовая ўязная віза каштуе 15 долараў, аднаразовая транзітная — 8 долараў. Консульская плата за выдадзеную на працягу 72 гадзін візу складзе 35 долараў (20 долараў за тэрміновую), за выдадзеную на працягу 48 гадзін — 45 долараў (з іх 30 долараў за тэрміновасць). Павелічэнне цаны на візы стала адказам на рашэнне літоўскага ўрада павялічыць кошт віз для грамадзян Беларусі.

ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ ТЫДНЯ

Згодна з пратаколам аб супрацоўніцтве паміж Гомельскім дзяржаўным універсітэтам імя Ф. Скарыны і Добрушскім раённым выканаўчым камітэтам, у мэтах папулярызацыі творчасці народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна ў Карме будзе створаны яго музей з філіялам у райцэнтры. У самой жа Карме акрамя музея будзе ўстаноўлены бюст Івана Шамякіна.

ЖАРАБ'ЁЎКА. ТЫДНЯ

У Жэневе адбылася жараб'ёўка папярэдняга раунда Лігі чэмпіёнаў. Бабруйская "Белшына" сустрэнецца з чэмпіёнам Паўночнай Ірландыі — клубам "Партадаўн". Першы матч беларускі чэмпіён правядзе 17 ліпеня ў гасцях, а 24 ліпеня прыме саперніка на сваім полі. Пераможца гэтай пары на наступным этапе згуляе з Ізраільскім клубам "Макабі" (Хайфа).

УЛІК ТЫДНЯ

На ўліку ў наркалагічных дыспансерах Беларусі знаходзяцца 7685 чалавек, якія дапускаюць немедыцынскае ўжыванне наркотыкаў. Рэальная ж колькасць наркаманаў у нашай краіне, на думку спецыялістаў, значна большая. Ускосна аб гэтай колькасці сведчыць сам рынак збыту наркотыкаў. Канфіскаваных сёлета ў нашай краіне наркатычных рэчываў хапіла б для прыгатавання 1 мільёна 300 тысяч доз.

МАРШРУТ ТЫДНЯ

Новы пасажырскі авіярэйс па маршруце Мінск—Тбілісі—Мінск у гэтым месяцы адкрыла авіякампанія "Белавія". Самалёты маркі "ТУ—134" адпраўляюцца з Нацыянальнага аэрапорта Мінск у сталіцу Грузіі кожную нядзелю ў 19 гадзін 45 мінут па мясцовым часе. З Тбілісі назад у Мінск авіялайнер вяртаецца па панядзелках. Цана білета ў адзін бок складае ад 180 долараў. Няслаба, але...

ПАДАРАЖАННЕ ТЫДНЯ

З моманту апошняга падаражання нафтапрадуктаў прайшло крыху больш тыдня, калі цэны былі павялічаны на 5—10 працэнтаў. На гэты раз светлыя нафтапрадукты падаражэлі ў сярэднім на 7 працэнтаў, цёмныя — на 10 працэнтаў. Новыя цэны на сённяшні дзень такія: бензін А-76 — 570 рублёў за літр, АІ-92 — 725 рублёў, А-95 — 830 рублёў. На дызельнае паліва — 555 рублёў.

ЗМЯНЕННЕ ТЫДНЯ

З 1 ліпеня пасажыраў сталічнага транспарту чакае змяненне відаў праязных: яны падзяляюцца на наземныя і метрапалітэнаўскія. Поўны праязны на месяц на аўтобус, тралейбус і трамвай каштуе 8400 рублёў, а на метро — 5400 (плюс 500 рублёў залогавага кошту за магнітную картку). Словам, каб мець праязны на ўсе віды транспарту трэба заплаціць 13800 рублёў (раней было 9600 рублёў). Праязныя на ліпень ужо можна купіць.

У Саюзе беларускіх пісьменнікаў

17 чэрвеня ў Грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы адбылося пасяджэнне чарговага "круглага стала" ў рамках Міжнароднага сімпозіума "Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі", падрыхтаванага Саюзам беларускіх пісьменнікаў і Прэс-Цэнтрам.

Тэмай "круглага стала", прысвечанага надзвычай важнай для беларускай інфармацыйнай прасторы праблеме, стала "Мова ў сродках масавай інфармацыі". Яе аналіз зрабіла старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Вольга Іпатава, якая назвала становішча з ужываннем беларускай мовы ў сродках масавай інфармацыі "катастрафічным" і прапанавала стварыць "Службу маўлення" пры Беларускім тэлебачанні. Выступоўцы — дырэктар Інстытута мовазнаўства А. Падлужны, загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання журфака БДУ В. Іўчанкаў, дацэнт журфака М. Карповіч, галоўны рэдактара радыё Н. Гальпяровіч, В. Дашкевіч і інш. — адзначалі неабходнасць сама пільнай увагі да праблемы ўжывання беларускай мовы ў сродках масавай інфармацыі. Прагучала таксама прапанова стварыць Каардынацыйную раду альбо "Савет па культурна-інфармацыйнай палітыцы", якія б маглі ўплываць на паляпшэнне сітуацыі.

●

Пачатая работа над размяшчэннем звестак аб Саюзе беларускіх пісьменнікаў у спецыяльным Інтэрнет-каталозе, прысвечаным грамадскім аб'яднанням Рэспублікі Беларусь. Ужо ў жніўні 300 тысячбеларусаў, якія карыстаюцца Інтэрнетам, больш за восем мільёнаў расіян, а таксама ўсе, хто ўвогуле карыстаецца Інтэрнетам ва ўсім свеце, змогуць атрымаць неабходныя звесткі аб нашай творчай арганізацыі.

●

Падрыхтаваныя і здадзеныя ў Саўмін РБ праекты Саюза беларускіх пісьменнікаў аб святкаванні юбілеяў сучасных майстроў беларускага слова — такіх, як Я. Брыль, І. Пташнікаў, А. Мальдзіс, А. Васілевіч і інш. Падрыхтаваны таксама праект аб правядзенні вечароў паэзіі народаў свету з надрукаваннем перакладаў асобным зборнікам.

С. Т.

ІМПРЭЗЫ

Джазавая хваля

Неруш нарачанскага краю растрывожылі... гукі джаза. Як гэта паўплывала на экалагічнае становішча ў запаведным кутку, можна толькі здагадвацца. Але расказваюць, што ў тых, каму давялося паўдзельнічаць у новай імпрэзе, станоўчых эмоцый паболела, настрой узняўся, колер твару пасвяжэў. А было гэта 21 чэрвеня, калі на імправізаванай воднай сцэне, уладкаванай з дапамогай пантонаў проста на хвалях возера Нарач, прайшло свята джаза, папулярнай эстраднай музыкі, сучаснай беларускай песні.

Арганізавалі імпрэзу Мінскі аблвыканкам сумесна з Дзяржаўнай прыродаахоўнай установай "Нацыянальны парк "Нарачанскі". Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта РБ, Мядзельскі райвыканкам — па ініцыятыве Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі на чале з маэстра, прафесарам М. Фінбергам.

"Нарачанскія хвалі" — так называўся фэст. Удзельнічалі ў ім біг-бэнд Дзяржаўнага канцэртнага аркестра, групы "Atava" пад кіраўніцтвам А. Боева і "Ireen Stream" пад кіраўніцтвам У. Бялова, ансамбль традыцыйнага джаза "Рэнесанс" на чале з М. Лапцёнкам. Паводле задумы арганізатараў, праграму незвычайнай вечарыны складалі дзве асноўныя часткі: гала-канцэрт з удзелам поўнага складу аркестра ды яго салістаў і выступленне джазменаў, якія ледзьве не да світання былі гатовыя імправізаваць, працягваючы свой традыцыйны джэм-сэйшн.

"Па-за хваляй" апынуліся сталічныя журналісты. Прычыны зразумелыя: з-за недахопу грошай правядзенне імпрэзы, раней задуманай як фестываль, абмежавалася адным днём і не прадугледжвала акрэдытацыю прэсы. Эх, шкада...

С. Б.

ТЭАТР

Наўздагон сезону

Май стаўся такі па-летняму спякотны, што думаць пра штонебудзь, акрамя адпачынку, было цяжка. Але для некаторых тэатраў май і пачатак лета — гарачая пара. І не толькі ў пераносным сэнсе.

Не да адпачынку, напрыклад, акцёрам ды службам сталічнага тэатра імя Янкі Купалы. Тут адбылася чарговая, трэццяя за сезон прэм'ера. "К'ёджаўскія перабрэхі" — так перакладзена назва п'есы Карла Гальдоні, якая на рускай мове больш далікатна ганаруецца як "Къёджинские перепалки". Згадзіцеся, міма афішы з такой назвай так проста не пройдзеш. І публіка не прайшла. Нягледзячы на самы разгар дачнага сезона вялікая сцэна тэатра падчас прэм'еры нязменна збірала аншлагі. Гэтую вясёлую народную камедыю купалаўскі рэжысёр Уладзімір Шчэрбань паставіў ў супрацоўніцтве з кампазітарам Уладзімірам Кур'янам, мастачкай Алесяй Снапок і балетмайстрам Марынай Філатавай. Спектакль яшчэ раз прадэманстраваў, што "фірменым" стылем тэатра становіцца выдатна падабраная і запамінальная музыка, а таксама адментая сцэнаграфія з абавязковай "разынкай". Візуальным сімвалам гэтага спектакля стала вялізная рыба-поўня, што лунала над галовамі герояў, ўвесь час нагадваючы пра мора і цёплыя італьянскія ночы. Так, дзея камедыі адбываецца ў невялічкім італьянскім гарадку К'ёджы, што непадалёк ад Венецыі. У маладосці Гальдоні сам займаў пасаду ў к'ёджаўскім судзе, і яму амаль не прыйшлося нічога выдумляць у апісанні камічнай сваркі паміж сем'ямі тутэйшых рыбакоў, сведкам якой ён быў. Дыялект, на якім была напісана п'еса, выдатна ўвасобіў у перакладзе на беларускую мову Рыгор Барадулін. Гэтая "камедыя палажэнняў" прывабіла тэатр не толькі сваім панароднаму дасціпным гумарам, але і шматлюднасцю. У спектаклі — ажно пятнаццаць персанажаў, і іграецца ён двума складамі выканаўцаў. Выйшла на сцэну амаль палова трупы — ад моладзі да адной са старэйшых актрыс тэатра Маргарыты Громавай. Але сапраўды цікавых акцёрскіх прац спектаклю пакуль бракуе. Самымі яркімі атрымаліся персанажы Вячаслава Паўлюця і Віктара Манаева, але абодва акцёры выкарысталі для стварэння вобразаў падрона Фартуната і суддзі Ісідара даўно знойдзеныя і добра вядомыя камічныя прыёмы (якія, тым не менш, спрацоўваюць бездакорна — публіка ў захапленні). У цэлым, атрымалася вясёлая, жыццярадасная камедыя без асаблівых прэтэнзій на вытанчанасць, затое з цудоўнай музыкай, жартамі і непазбежным хэпі-эндам. Вось каб усе "перабрэхі" ў рэальным жыцці заканчваліся гэтак жа...

Наступны пасля прэм'еры дзень таксама стаўся для тэатра нешараговым. На Малой сцэне Купалаўскага стартаваў новы праект — Тэатр п'есы. Прынцып дзеяння такога тэатра даволі просты: бярэцца невядомая ці малавядомая п'еса і пасля літаральна некалькіх рэпетыцый чытаецца акцёрамі пры мінімуме рэквізіту і дэкарацый. Такія чытанні не раз ладзіліся на колішняй "Вольнай сцэне" яшчэ ў бытнасць яе тэатрам — лабараторыяй нацыянальнай драматургіі. Па-сутнасці, гэта зварот да п'есы як першаасновы любога спектакля, якая зараз усё больш адціскаецца на другі план відовішчнасцю ды спецэфектамі. Такая форма рэалізацыі п'есы, як "чытка", дасць магчымасць маладым беларускім драматургам "адчуць " сцэну, а акцёрам — пазбегнуць вымушанага творчага прастою. Праект, не вымагаючы вялікага часу і амаль ніякіх фінансавых выдаткаў, дазваляе зацікаўленай тэатральнай грамадскасці аператыўна (а не праз тры-пяць гадоў, за якія п'еса можа згубіць сваю актуальнасць) пазнаёміцца з творамі сучаснікаў — не толькі беларускіх, але і еўрапейскіх аўтараў. Што патрэба ў такім знаёмстве ёсць, стала відавочна ўжо на першым прадстаўленні праекта. П'еса для першай чыткі была выбрана вельмі ўдала — гэта той самы "П'емонцкі звер" Андрэя Курэйчыка, п'еса, якую адабраў да пастаноўкі ў МХАТе сам Алег Табакоў. У спектаклі, які паставіў зноў-такі Уладзімір Шчэрбань, заняты многія акцёры Купалаўскага тэатра: С. Анікей, Г. Хітрык, Т. Міронава, Т. Пузіноўская, У. Рагаўцоў, З. Зубкова, І. Пятроў, Ю. Шпілеўская, І. Русакевіч, А. Доўгая, а таксама запрошаны са студэнцкага тэатра БДУ Багдан Швайбовіч. Імя аўтара - "рэвалюцыянера" тэатра - настолькі раскручана ў СМІ, што аншлаг на прадстаўленні яго п'есы быў забяспечаны. Але ці здолее Тэатр п'есы зацікавіць гледача творамі менш вядомых аўтараў і ці захоча глядач за немаленькія грошы бачыць голую сцэну — пакажа толькі час.

"Абкатаўшы" прэм`ерныя "К`ёджаўскія перабрэхі" дома, дзе, як вядома, і сцены дапамагаюць, Купалаўскі вырашыў прапанаваць іх разам з яшчэ сям`ю рэпертуарнымі спектаклямі брэсцкай публіцы. Гастролі тэатра ў горадзе над Бугам доўжыліся з 12 па 19 чэрвеня). Потым новы спектакль купалаўцаў чакае даволі сур`ёзнае выпрабаванне: удзел у тэатральным конкурсе, што будзе ладзіцца ў межах фестывалю "Славянскі базар у Віцебску".

Не зачыніць на лета свае гасцінныя дзверы і сам Купалаўскі тэатр. У ліпені тут будуць сустракаць Віцебскі нацыянальны тэатр імя Якуба Коласа. Ліпень увогуле абяцае быць не сумным: чакаеца, што менавіта тады будзе паказана яшчэ адна прэм'ера. П'есу "Муж для паэтэсы" Алены Паповай на Малой сцэне тэатра ставіць рэжысёр Уладзімір Савіцкі. Таксама мае адбыцца "Купалаўскі тыдзень" і святочная вечарына, прысвечаныя юбілею славутага песняра. Падчас тыдня Купалаўскі пакажа свае знакамітыя "Паўлінку" і "Тутэйшых", спектаклі паводле твораў Купалы прывязуць правінцыйныя тэатры.

Юлія Палачаніна

ВІНШУЕМ!

Наш лаўрэат

Беларускі піяніст Андрэй Паначэўны бліскуча выступіў на XII Міжнародным конкурсе імя П. Чайкоўскага ў Маскве

Чэмпіянат свету па футболе — не адзіная падзея гэтых дзён, вартая грамадскай увагі ды гарачых перажыванняў. Сапраўдным скопішчам эмоцый, амбіцый ды жарсцяў стаўся XII Міжнародны конкурс імя П. Чайкоўскага, які тры тыдні доўжыўся ў Маскве і ўрачыста завяршыўся 23 чэрвеня. Дзённікі гэтага буйнога і прэстыжнага спаборніцтва маладых спевакоў, віяланчэлістаў, скрыпачоў ды піяністаў спраўна рыхтаваў расійскі тэлеканал "Культура", які наладзіў у нядзелю і трансляцыю закрыцця конкурсу, цырымоніі ўзнагароджвання лепшых выканаўцаў. Многія нашы суайчыннікі з асаблівым пачуццём глядзелі заключны конкурсны рэпартаж: у ліку лаўрэатаў прагучала імя беларускага музыканта.

За амаль 45-гадовую гісторыю конкурсу імя П. Чайкоўскага гэта быў першы выпадак ганаравання прадстаўніка беларускай фартэпіяннай школы!

Ігра, як той казаў, — латарэя... Аднак у мінскіх "балельшчыкаў" была ўпэўненасць, што ў суровых варунках прадстаўнічага музычнага турніра ігра Андрэя Паначэўнага будзе заўважана і адзначана. Колішні выхаванец Рэспубліканскага каледжа пры Беларускай акадэміі музыкі, а цяпер — і самой акадэміі (педагогі Л. Шаламенцава, Ю. Гільдзюк), ён мае багаты і паспяховы досвед конкурснай барацьбы, пацверджаны дыпломамі ды лаўрамі ў розных краінах — ад Польшчы да Злучаных Штатаў Амерыкі.

У Маскве сярод піяністаў канкурэнцыя была надзвычай высокая. Упэўнена выйшлі ў фінал прадстаўнікі фартэпіянных школ Расіі, краін Азіі... Журы пад

старшынствам выдатнага музыканта Уладзіміра Крайнева адзначыла дыпломамі рознай вартасці выканаўцаў з Японіі, Украіны, Рэспублікі Карэя, з Расіі, Лаўрэатам 1-й прэміі і ўладальніцай залатога медаля стала японская піяністка Аяка Уэхара, 2-й прэміяй ганараваны аспірант Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі Аляксей Набіулін, а лаўрэатаў 3-й прэміі — двое: кітаянка Дзюй Дзінь ды наш Андрэй Паначэўны. Гэта, без перабольшвання, — перамога!

С. Б.

Фота А. ДЗМІТРЫЕВА

Ад падкамітэта па дзяржаўных прэміях у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры

Падкамітэт па дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры паведамляе, што да ўдзелу ў конкурсе на атрыманне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2002 года дапушчаны наступныя работы:

У галіне літаратуры:

Прэмія імя Янкі Купалы (за творы паэзіі і драматургіі)

1. Макарэвіч Васіль Сцяпанавіч. Кніга паэзіі "Квадратура круга". Прадстаўлена Крупскім раённым аддзелам культуры.

2. Тармола-Мірскі Раман Якаўлевіч. Кніга паэзіі "Прычасце". Прадстаўлена выдавецкім рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам "Мастацкая літаратура".

3. Гурыновіч Фёдар Фёдаравіч. Кніга паэзіі "Запрашаю пад дождж". Прадстаўлена рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам "Вытворчае аб'яднанне "Беларуськалій".

4. Дзялендзік Анатоль Андрэевіч. Зборнік камедый "Султан Брунея". Прадстаўлены Рэспубліканскай клінічнай псіхіятрычнай бальніцай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

5. Гардзей Віктар Канстанцінавіч. Кніга паэзіі "Межань". Прадстаўлена грамадскім аб'яднаннем "Саюз беларускіх пісьменнікаў".

Прэмія імя Якуба Коласа (за творы прозы і работы ў галіне літаратуразнаўства і крытыкі)

1. Бондар Таісія Мікалаеўна. Кніга "Імем Айца і Сына". Прадстаўлена выдавецкім рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам "Мастацкая літаратура".

2. Жураўлёў Васіль Пракопавіч. Кніга "У пошуках духоўных ідэалаў. На матэрыяле беларускай літаратуры 19 — пачатку 20 ст.". Прадстаўлена грамадскім аб'яднаннем "Саюз беларускіх пісьменнікаў".

3. Казлоў Анатоль Сяргеевіч. Кніга прозы "Незламаная свечка". Прадстаўлена грамадскім аб'яднаннем "Саюз беларускіх пісьменнікаў".

Прэмія за творы літаратуры і мастацтва для дзяцей і юнацтва

1. Пазнякоў Міхаіл Паўлавіч. Кніга вершаў для дзяцей "Дарынка-весялінка". Прадстаўлена калектывам Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі г. Мінска.

2. Ягоўдзік Уладзімір Іванавіч. Кнігі для дзяцей "Бабуліна варта", "Сем цудаў Беларусі", "Аповесць мінулых гадоў". Прадстаўлены рэдакцыяй часопіса "Бярозка".

3. Савіцкі Аляксандр Ануфрыевіч. Кніга для дзяцей "Дзівосы Лысай гары". Прадстаўлена калектывам бібліятэкі імя Л. М. Талстога г. Мінска.

4. Федарэнка Андрэй Міхайлавіч. Кніга для дзяцей "Шчарбаты талер". Прадстаўлена грамадскім аб'яднаннем "Саюз беларускіх пісьменнікаў".

Прэмія імя Кастуся Каліноўскага (за работы ў галіне мастацкай публіцыстыкі)

1. Саламаха Уладзімір Пятровіч. Кніга літаратурнай публіцыстыкі і рэцэнзій "Званыя і выбраныя" і публіцыстыка апошніх год. Прадстаўлены грамадскім аб'яднаннем "Саюз беларускіх пісьменнікаў".

Прэмія за значныя работы ў галіне журналістыкі

1. Екель Леанід Сямёнавіч, Стральцоў Барыс Васільевіч, Сакалоўскі Рыгор Васільевіч. Кніга "Публицист". Прадстаўлена факультэтам журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

У галіне мастацтва, дызайну і архітэктуры:

Прэмія за музычныя творы буйных і малых форм, а таксама за канцэртна-выканальніцкую дзейнасць

1. Ярмоленка Анатоль Іванавіч. Канцэртная дзейнасць і стварэнне сольных канцэртных праграм: "Я з вамі на развітваўся ніколі", "Переживем", "Наши песни — наша жизнь" (1998—2001 гг.). Прадстаўлены аб'яднаннем "Белканцэрт".

2. Кузняцоў Вячаслаў Уладзіміравіч. Музыка да балета "Макбет" і абрад-дзейства для народнага хору "Беларускае вяселле" (1999—2000 гг.). Прадстаўлены грамадскім аб'яднаннем "Беларускі саюз музычных дзеячаў".

3. Хадоска Алег Іванавіч. Сімфонія № 1 "Пакаянне" і "Усяночнае дбанне". Прадстаўлены грамадскім аб'яднаннем "Беларускі саюз кампазітараў".

Прэмія за шырока прызнаныя работы рэжысёраў, дырыжораў, балетмайстраў, хормайстраў, артыстаў, мастакоў, сцэнарыстаў, кампазітараў і драматургаў, аператараў у пастаноўках тэатраў, кінастудый, на тэлебачанні і радыё

1. Кучар Фелікс Айзікавіч. Дакументальны фільм "Местечко. Исход" (1999 г.). Прадстаўлены Мінскай абшчынай прагрэсіўнага іудаізму "Сімха".

2. Баркоўскі Віталь Міхайлавіч, Акружная Святлана Арцёмаўна, Крыштафовіч Аляксандр Маркавіч, Колесаў Уладзімір Пятровіч, Матросаў Уладзімір Іванавіч, Сяўко Баляслаў Іванавіч, Шацько Рыгор Іванавіч, Шмакаў Фёдар Іванавіч. Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа "Зямля" па матывах твораў Якуба Коласа. Прадстаўлены Віцебскім дзяржаўным універсітэтам імя П. М. Машэрава.

3. Аўрынская Алена Сцяпанаўна, Галубовіч Ала Купрыянаўна, Мароз Віктар Віктаравіч, Шаршульская Лідзія Уладзіміраўна, Дзёмкін Уладзімір Васільевіч, Сергушава Таццяна Васільеўна, Сабярайская Тамара Паўлаўна. Цыкл тэлевізійных перадач "Дрэва жыцця". Прадстаўлены Мінскім гарадскім цэнтрам занятасці насельніцтва.

Прэмія за творы жывапісу, скульптуры, графікі, манументальна-дэкаратыўнага і прыкладнога мастацтва, дызайну

1. Крываблоцкі Уладзімір Васільевіч. Манументальны паліптых "Рэквіем" з пяці частак "Азарычы, сакавік 1944", "Спаленыя, не народжаныя", "Генацыд", "Анёл жалобы", "Рыцар свабоды". 1996—2000 гг. (3х11, ляўкас, тэмпера, вашчэнне). Прадстаўлены грамадскім аб'яднаннем "Беларускі саюз мастакоў" і грамадскім аб'яднаннем "Беларуская асацыяцыя былых непаўналетніх вязняў фашызму".

2. Шкаруба Валерый Фёдаравіч. Серыя пейзажаў "Спрадвечнае" (1997—2000 гг.). Прадстаўлена Барысаўскім гарадскім выканаўчым камітэтам.

3. Паплаўскі Георгій Георгіевіч. Серыя акварэляў "Браслаўскі альбом" і графічны цыкл з творчых экспедыцый па Інданезіі і Кубе, выкананых у перыяд 1997—2001 гг. Прадстаўлена "Творчымі акадэмічнымі майстэрнямі жывапісу, графікі і скульптуры".

4. Дранец Аляксандр Валянцінавіч, Левін Леанід Мендзелевіч, Іўлічаў Віктар Паўлавіч, Левіна Галіна Леанідаўна. Архітэктурна-манументальны ансамбль забудовы цэнтра горада Давыд-Гарадка з помнікам князю Давыду (1998—2000 гг.). Прадстаўлены грамадскім аб'яднаннем "Беларускі саюз мастакоў" і Столінскім раённым выканаўчым камітэтам.

Прэмія за арыгінальную архітэктуру грамадзянскіх, прамысловых збудаванняў у горадзе і на сяле

1. Навумаў Мікалай Сцяпанавіч, Рушаў Юрый Сцяпанавіч, Валчэцкі Леанід Барысавіч. Аўтавакзал "Маскоўскі" ў г. Мінску. Прадстаўлены дзяржаўным прадпрыемствам "Інстытут "Мінскпраект" Камітэта архітэктуры, горадабудаўніцтва і землеўпарадкавання.

Прэмія за даследаванні па тэорыі і гісторыі мастацтва і архітэктуры, а таксама падручнікі для спецыяльных навучальных устаноў па архітэктуры і мастацтвазнаўстве

1. Смольскі Рычард Баляслававіч. Цыкл тэатразнаўчых работ "Тэатр у прасторы часу", "На скрыжаванні", "Рэха мінулага". Прадстаўлены грамадскім аб'яднаннем "Беларускі саюз літаратурна-мастацкіх крытыкаў".

Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры звяртаецца да кіраўнікоў арганізацый, устаноў, вышэйшых навучальных устаноў, прадпрыемстваў, міністэрстваў і ведамстваў з просьбай правесці грамадскае абмеркаванне пералічаных работ і аўтарскіх калектываў.

Водгукі, матэрыялы абмеркаванняў, прапановы і заўвагі па работах і аўтарам просьба накіроўваць у Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры да 1 лістапада 2002 года па адрасе: 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, пакой 421; тэл./факс 284-23-81.

АБСЯГІ

ГОМЕЛЬШЧЫНА...

АРТЫСТЫ З ЗАБАЙКАЛЛЯ

Свае лепшыя спектаклі прывёз у Гомель Чыцінскі абласны драматычны тэатр. Калектыў адкрыў гастролі пастаноўкай "Забайкальская кадрыль". Вельмі прыемна, што ў рэпертуары тэатра аж тры спектаклі па п'есах беларускага драматурга А. Дударава — "Вечар", "У змроку", "Прынц Мамабук". Рэжысёр-пастаноўшчык забайкальскага драматычнага тэатра — заслужаны дзеяч мастацтва Расіі Мікалай Беразін. У трупе — заслужаныя артысты Расійскай федэрацыі Т. Беразіна, В. Прохараў, С. Юлін...Гастролі пачаліся з 20 чэрвеня.

ЖЫВАПІСЦЫ САБРАЛІСЯ Ў БУДА-КАШАЛЁВЕ

Буда-Кашалёва стала месцам правядзення міжнароднага пленэру жывапісу імя народнага мастака СССР, акадэміка жывапісу Я. Маісеенкі, які нарадзіўся ў гэтых мясцінах (гарпасёлак Уваравічы), а пасля працаваў у Ленінградзе.

Пленэр арганізавалі Міністэрства культуры, упраўленне культуры Гомельскага аблвыканкама, Буда-Кашалёўскі раённы выканкам, абласная арганізацыя Саюза мастакоў. У ім прынялі ўдзел вядомыя жывапісцы з Мінска, Гомеля, Брэста, Буда-Кашалёва, Санкт-Пецярбурга, Чарнігава. Творы пленэрыстаў папоўняць экспазіцыю музея-галерэі ў Буда-Кашалёве.

З ГІСТОРЫІ СТАРАВЕРАЎ

Абласное Таварыства Кірылы Тураўскага, Славянская бібліятэка ў Гомелі, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны правялі пасяджэнне, прысвечанае гісторыі староверства ў Беларусі, Расіі і на Украіне. У ім бралі ўдзел выкладчыкі і студэнты ГДУ, супрацоўнікі Абласнога краязнаўчага музея і Веткаўскага музея народнай творчасці, а таксама царкоўнікі і староверы трох братніх краін. Дацэнт Гомельскага дзяржуніверсітэта, археолаг Алег Макушнікаў расказаў аб выніках раскопак Спасавай Слабады ў Гомелі, дзе на пачатку 18 стагоддзя жылі староверы.

ХОР ВЫСТУПАЕ НА БІС

Пры Гомельскай дзіцячай музычнай школе № 1 імя Чайкоўскага створана пяць харавых калектываў розных узроставых груп. Хор старэйшых класаў (кіраўнік і дырыжор Галіна Крэс) з'яўляецца ўзорным дзіцячым калектывам. Ён браў удзел у свяце славянскага пісьменства ў Кіеве. Усе канцэрты прайшлі на біс.

І НАСТАЎНІК, І ВУЧНІ

Мастак Васіль Бондараў 15 гадоў працуе дырэктарам Гомельскай дзіцячай мастацкай школы № 1. Плённа працуе ў жанрах партрэта і пейзажа. З нагоды 55-годдзя адкрыў выставу сваіх работ у карціннай галерэі Г. Вашчанкі. Тут жа прадстаўлены і жывапісныя працы навучэнцаў мастацкай школы.

Аляксей ШНЫПАРКОЎ

МАГІЛЁЎШЧЫНА...

БРАТЭРСТВА БЕЗ МЕЖАЎ

У Хоцімску адбудзецца міжнародны фестываль "Славянскае братэрства без межаў". Тут сабярэцца творчая моладзь: артысты, мастакі, студэнты, навучэнцы школ з Мінска, з Хоцімскага, Краснапольскага, Клімавіцкага і Касцюковіцкага раёнаў Магілёўскай вобласці, а таксама суседзі з Браншчыны і Смаленшчыны.

Свята пройдзе пад кіраўніцтвам Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі з удзелам прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюза Беларусі і Расіі ў нашай рэспубліцы. Мэта мерапрыемства — падтрымка таленавітай моладзі, найбольш эфектыўная рэалізацыя міжнародных творчых праграм. Ацэньваць маладыя таленты будзе прадстаўнічы аргкамітэт фестывалю на чале з народным артыстам СССР І. Лучанком.

ФЕСТЫВАЛЬ ПАШЫРЫЎ ПРАГРАМУ

На Чэрыкаўшчыне прайшоў фестываль народнай творчасці "Прысожскі карагод". Ён працягнуў традыцыі фестывалю "Вёсачка мая", ідэя якога належала колішняму загадчыку аддзела культуры мясцовага райвыканкама Мікалаю Тыманюку. Тады сяльчане прадстаўлялі толькі тыя абрады, якія былі ўласцівыя для канкрэтнай вёскі. Цяперашні ж "Прысожскі карагод" значна пашырыў сваю праграму: яго ўдзельнікі (каля 150 майстроў) вызначыліся на свяце ў самых розных жанрах нацыянальнай народнай творчасці.

Алесь ПЯТРОВІЧ

ВІЦЕБШЧЫНА...

ВЯРТАННЕ ДАМОЎ

У карціннай галерэі Оршы адкрылася выстава мастака Міколы Купавы "Вяртанне дамоў". Землякі з цікавасцю пазнаёміліся з серыяй "Выдатныя дзеячы гісторыі і культуры Беларусі",. з творамі пад агульнай назвай "Шляхамі Янкі Купалы".

Аршанцы ганарацца мастаком, які ўдзельнічаў у 50-ці міжнародных выставах, аформіў каля 30 кніг і альбомаў. На прэзентацыі Мікола Купава абвясціў, што стварае грамадскае аб'яднанне "Аршанскі замак" па аднаўленні гістарычнага збудавання на замчышчы горада.

ДАВІДУ СІМАНОВІЧУ —70

На гэтым тыдні Віцебск святкаваў юбілей паэта Давіда Сімановіча. У сераду яму споўнілася 70 гадоў. Адначасова паэт адзначае 55-годдзе творчай дзейнасці. У гарадскім цэнтры культуры сабраліся прыхільнікі паэзіі, сябры-літаратары.

Плён паэзіі Сімановіча зайздросны — 20 зборнікаў вершаў і адна кніжка эсэ.Як адзначыў у газеце "Народнае слова" пісьменнік і рэдактар Сяргей Рублеўскі, "жыццё Давіда Сімановіча — хада. Крок за крокам па абсягах тэксту, якія ён падзяляе ў дзённіку абзацамі. Так пульсуе рытм дзён. У хадзе — сэрцабіццё паэзіі. Давід Сімановіч з аднолькавым імпэтам бярэцца і за арганізацыю Пушкінскага свята паэзіі, і за адзначэнне ўгодкаў У. Караткевіча, і, вядома ж, за ўсе мерапрыемствы, звязаныя з імем любімага мастака Марка Шагала".

Грамадскія справы па душы сапраўднаму паэту.

Святлана ГУК

МІНШЧЫНА...

ШЧЫРЫЯ СПОВЕДЗІ

У выдавецтве Беларускага таварыства "Кніга" выйшаў першы выпуск унікальнага выдання — кніга "Шчыра, як на духу. Споведзі вядомых людзей Беларусі". На 450-ці старонках на пытанні анкеты адказваюць вядомыя навукоўцы, пісьменнікі, артысты, спартсмены, грамадскія і дзяржаўныя дзеячы краіны. У гэтых шчырых споведзях — асаблівасці характараў і захапленняў герояў кнігі, іх погляды на творчасць, на сістэму каштоўнасцяў асобы і будучае краіны.

Кніга выйшла пад рэдакцыяй народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча.У Мінскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Янкі Купалы адбылася прэзентацыя выдання. Зрэшты, наклад яго — абмежаваны. Набыць рарытэт можна ў кнігарнях Мінска і іншых гарадоў Беларусі. Даведкі можна артымаць па тэл. 227-07-57, 226-10-39, а таксама ў мясцовых арганізацыях Беларускага таварыства "Кніга" і кніжнага гандлю.

Наш кар.

Высокая ўзнагарода

На жаль, беларускія сродкі масавай інфармацыі пакінулі без увагі той факт, што Патрыярх Маскоўскі і Усяе Русі Аляксій II падчас свайго нядаўняга знаходжання ў Беларусі ўзнагародзіў, сярод іншых, Ордэнам Прападобнага Сергія Раданежскага III ступені пісьменніка і філолага-навукоўца Івана Чароту.

А ўдастоены гэтай высокай узнагароды прафесар Чарота за працу па асэнсаванні беларускай хрысціянскай літаратуры і ўдзел у падрыхтоўцы "Праваслаўнай Энцыклапедыі".

Для калег-літаратараў нагадаем, што І. Чарота — аўтар манаграфіі "Беларуская мова і Царква", выканаўчы рэдактар беларускамоўнага часопіса "Праваслаўе", адзін з перакладчыкаў на сучасную беларускую мову Бібліі, а таксама укладальнік дзвюх неардынарных зборнікаў пад агульнай назвай "Насустрач Духу". Гэта "Анталогія беларускай хрысціянскай паэзіі" і "Анталогія беларускай хрысціянскай прозы", выпушчаныя выдавецтвам "Ураджай" адпаведна ў 2001 і 2002 гг.

У. І.

Па ім смуткуюць Юшавічы

Іван Гурбан не дажыў да свайго васьмідзесяцігоддзя. Сын расказваў, што бацька збіраўся запрасіць на свой юбілей самых дарагіх і блізкіх яму людзей. Не паспеў. Але свята адбылося, радаснае і крыху сумнае, бо — прысвечанае памяці паэта. Пра гэта паклапаціліся дзеці Івана Гурбана — Анатоль, Ларыса і Людміла, Нясвіжскі раённы аддзел культуры, мясцовая інтэлігенцыя.

Іван Яфімавіч Гурбан нарадзіўся ў вёсцы Юшавічы, што на Нясвіжчыне. Тут пражыў увесь свой век.

У канцы мая вяскоўцы, госці, родныя і блізкія сабраліся каля сядзібы паэта. Пра яго жыццёвы і творчы шлях прыгадвалі сын Анатоль Іванавіч, сусед-пенсіянер Іосіф Іосіфавіч Падамацька, паэт Паўлюк Прануза... Агучаныя музыкай, гучалі задушэўныя радкі Івана Гурбана.

Кажуць, што душа не памірае,
Не гарыць, не тоне у вадзе.
Мы не бачым, а яна, жывая,
Прылятае ў госці да людзей.
Мо і праўда — ціха прылятае
Да свайго ранейшага жытла,
Ды, відаць, не кожная, а тая,

Што бязгрэшнай на зямлі была.

Вочы міжволі скіроўваліся ў неба. Здавалася, не воблачка замерла над хатай, а светлая Іванава душа.

Хвілінай маўчання землякі і госці ўшанавалі памяць паэта на вясковых могілках. Кветкі і словы ўдзячнасці ляглі да помніка, на якім увекавечаны радкі Паўлюка Пранузы:

Родны кут — прыгожы, маляўнічы,
Ён любіў яго палі, лугі.
І па ім смуткуюць Юшавічы:
Быў паэтам любым, дарагім.

У 1994 годзе Іван Гурбан стаў сябрам Саюза пісьменнікаў Беларусі. Ён пакінуў нашчадкам не багатую, але па-свойму адметную паэтычную спадчыну: кніжачку вершаў "Чубаценькі будзільнік", нізкі вершаў у калектыўных зборніках "Калі ветрык спачывае", "Пахі вясны", "Пяром і сэрцам з Нясвіжам", "Нясвіжскія вытокі". Радкі яго — жывыя, надзённыя, метафарычныя, у іх добра адчуваецца пульс шчырага сэрца і цяпло мазольных рук аўтара.

Свята працягвалася ў сельскім Доме культуры. Пісьменнікі Уладзімір Ліпскі, Мікола Чарняўскі, Казімір Камейша, Мікола Маляўка згадвалі пра свае сустрэчы з Іванам Яфімавічам, чыталі вершы, прысвечаныя юбіляру, а таксама новыя свае творы. Цёпла сустракалі на сцэне дзяцей, якія чыталі вершы Івана Гурбана. Свята ўпрыгожыў канцэрт самадзейных артыстаў: гучалі песні, гумарыстычныя сцэнкі з вясковага жыцця.

Прэзідэнт Беларускага дзіцячага фонду Аляксандр Васільевіч Трухан падарыў землякам Івана Гурбана цэлую бібліятэку кніг, госці-пісьменнікі пакінулі свае кнігі з аўтографамі.

Паэт мінулага аблічча помніць
І будучае туліць да грудзей.
Радкі яго, як сонечныя промні,
Вітаюць, абнадзейваюць людзей.

Старшыня сельсавета Ванда Іосіфаўна Азарка падзякавала ўсім, хто ўшанаваў памяць паэта-юбіляра. На яго хаце неўзабаве з'явіцца мемарыяльная дошка. А яшчэ землякі будуць хадайнічаць, каб Юшавіцкай базавай школе або сельскай бібліятэцы было нададзена імя Івана Гурбана.

М. М.

ВЕКАПОМНАЕ — *3 ЛІПЕНЯ 1944*

Незагойная рана

Цяжка падлічыць, колькі трывожных начэй выпала на долю былой партызанкі Марыі Сцяпанаўны Трыбушэўскай. Вось і на гэты раз страшны сон выклікаў у яе горкія ўспаміны, і перажытае праплыло перад вачыма. Асмужаны месяц пазіраў у акно. Ён выразна асвятляў два партрэты, якія вісяць над ложкам. Вось яны — любыя муж Віктар і сынок Маік, былыя радасць і надзея, якія ў яе назаўсёды адняла вайна. Марыя Сцяпанаўна глядзіць на іх, і слёзы самі цякуць з вачэй.

Немцы з'явіліся ў вёсцы на шосты дзень вайны. У Капылі стварылі жандармерыю і паліцэйскі гарнізон. Ужо з першых дзён вайны Марыя Сцяпанаўна з мужам уключыліся ў барацьбу супраць акупантаў. Яны ўвайшлі ў падпольную групу на чале з заатэхнікам саўгаса Валянцінам Кляпко. Спачатку збіралі зброю і патроны, у калодзежы схавалі знойдзеныя кулямёт і дзесяць вінтовак. Ад знаёмых Віктар даведаўся, што ва ўрочышчы Кабрынец у старожцы лесніка Шабуні хаваюцца раненыя чырвонаармейцы. Усяго 15 чалавек, якім патрэбна дапамога. У хуткім часе з імі ўстанавілі сувязь. Марыя Сцяпанаўна насіла параненым ежу, разам з фельчарам Арэхавым рабіла перавязкі. На базе гэтай групы планавалася стварыць партызанскі атрад.

А праз нейкі час немцы арыштавалі Кляпко і Арэхава. Даведаўшыся пра іх арышт, чырвонаармейцы своечасова пакінулі сваё сховішча. Пасля лютых катаванняў Кляпко і Арэхава расстралялі. Тады ўпершыню Марыя Сцяпанаўна адчула, як смерць прайшла зусім побач, кінуўшы на яе свой халодны позірк.

Другі раз сустрэча са смерцю была яшчэ больш страшнаю. Яна пакінула на душы незагойную рану на ўсё жыццё.

Гэта здарылася 23 лютага 1943 года. У тую ноч яна дапамагала сваёй сяброўцы з суседняй вёскі прымаць ацёл. Калі раніцай вярнулася дахаты, убачыла як карнікі зганяюць усіх жыхароў на плошчу. Марыя Сцяпанаўна непрыкметна заскочыла ў невялічкі куратнік. Праз шчыліну ў сцяне яна бачыла барак, плошчу і людзей на ёй. Гэта былі жыхары з цэнтральнай сядзібы саўгаса імя Дзяржынскага і вёскі Дусаеўшчына. Фашысцкі афіцэр пачаў па спіску выклікаць людзей. Прагучала і яе прозвішча. Усяго назвалі каля 70 чалавек. Астатнім загадалі разысціся. Затрыманых загналі ў барак і забілі дзверы. Калі пачалі цягаць да яго сцен салому, толькі тады людзі па-сапраўднаму зразумелі, што задумалі каты.

Дашчатыя сцены барака ўспыхнулі як запалкі. Людзі пачалі выломваць дзверы, але фашысцкі кулямёт літасці не меў... Толькі пасля таго як карнікі пакінулі месца свайго злачынства і стала цямнець Марыя Сцяпанаўна вылезла са сховішча. Увайшла ў сені роднай хаты і замерла ад жаху. На падлозе ляжалі скрываўленыя трупы. Маік — зверху, Віктар — пад ім з разбітым чэрапам і сякерай у руцэ. У адкрытых вачах Маіка застылі слёзы. Гэта засталося ў памяці на ўсё жыццё. Астатняе яна памятае як у сне. Некалькі разоў страчвала прытомнасць, калі з дапамогай родзічаў і суседзяў адпраўляла ў апошні шлях мужа, сына і свякруху. Пахавалі іх той жа ноччу, каля хаты ў садзе. Пасля чаго ёй параілі схавацца ў лесе, што яна і зрабіла. Пасля доўгіх пошукаў яна нарэшце сустрэлася з дазорнымі партызанскай групы. Марыю Сцяпанаўную залічылі сувязной і санітаркай.

Аднойчы, нечакана для Марыі Сцяпанаўны, выклікаў да сябе камандзір і паведаміў, што ёй даручаецца знішчыць здрадніка Радзімы ўрача Мяцельскага, які супрацоўнічаў з немцамі і жыў у Капылі.

Праз некалькі дзён Марыя Сцяпанаўна адправілася на заданне. З вялікай рызыкай для жыцця ёй удалося пранесці міну праз нямецкі блок-пост. У чатыры гадзіны раніцы моцны выбух скалануў ранішнюю цішыню. Здраднік быў знішчаны.

Восенню 1943 года іх спецгрупа атрымала заданне рухацца далей на Захад у тыл ворага. Пры пераходзе шашы Масква-Варшава яны натыкнуліся на нямецкую засаду, а потым на міннае поле. Некалькі чалавек загінула, а Марыя Сцяпанаўна была паранена асколкам у грудзі. У цяжкім стане яна была дастаўлена ў партызанскі лагер. Толькі дзякуючы вопытнаму ўрачу і маладому арганізму, разведчыца засталася жывою.

Прыход Чырвонай Арміі мужная жанчына сустрэла ў Уздзе, якую іх партызанская брыгада імя Варашылава вызваліла і ўтрымлівала да падыходу савецкіх войскаў. А 16 ліпеня 1944 года ёй пашчасціла ўдзельнічаць ў гістарычнай падзеі — парадзе партызанаў Беларусі.

Але радасць вызвалення ў Марыі Сцяпанаўны азмрочвалася думамі пра тое, што няма ў жывых сына і мужа. Гэта не давала ёй спакою. Тады яна звярнулася ў ваенкамат з просьбаю адправіць на фронт. Аднак урачы адмовілі ёй. Ды што гэта рана ў параўнанні з тою, якая і сёння мучыць успамінамі яе сэрца.

Марыя Сцяпанаўна пражыла ў мужавым доме яшчэ два гады і не вытрывала: усё вакол напамінала пра Маіка і Віктара. Таму вырашыла вярнуцца да бацькоў у вёску Вяззе, што на Асіпоўшчыне. Думала, што, можа, хоць тут супакоіцца яе боль. Але і сцены бацькоўскага дому не дапамаглі загаіць душэўную рану.

С. ЛУКАШЭВІЧ

Дзеля роднага краю

Не думаў звычайны хлопец з вёскі Кабылічы (пераназванай потым у Пцічанскае) Пухавіцкага раёна Мікола Іванцоў, што яму давядзецца вочы ў вочы сустрэцца і змагацца з прыхаднямі-захопнікамі, якія наявяцца і абрынуцца на родны край — Беларусь. Вось і пайшоў бараніць юнак ад фашыстаў любімую рэчку Пціч, навакольныя лясы ды лугавіны ў атрад імя Суворава 2-й Мінскай партызанскай брыгады, дзе да самага вызвалення роднай старонкі будзе змагацца з ворагам у падрыўной дыверсійнай групе. Пасля ж знакамітага Параду партызанаў-пераможцаў у Мінску, у якім ён удзельнічаў, Міколу залічылі ў склад брыгады знішчальнай супрацьтанкавай артылерыі. Гэтак і дайшоў беларускі хлопец разам з сябрамі з розных куткоў былога СССР, неаднойчы страціўшы ў жорсткім супрацьстаянні з ворагам ні адну 76-міліметровую гармату, праз польскую ды нямецкую зямлю да Берліна, а потым і да Эльбы. Камандзірам гэтай самай гарматы, старшым сяржантам і закончыў ён вайну.

І не думаў Мікола, здабыўшы Перамогу, і "адбухаўшы", як кажуць, на службе ў Германіі яшчэ пяць гадоў, што вернецца дахаты і выбера прафесію паліграфіста-выдаўца, скончыць Маскоўскі паліграфічны інстытут. А праз які час, займеўшы жыццёвага ды прафесійнага вопыту, ажно дзесяць гадоў Мікола Аляксандравіч будзе кіраваць кніжна-часопісным выдавецтвам "Полымя", якое мы назвалі б цяпер нянаскім словам "холдынг". (Дарэчы, у яго ўваходзіў тады і "ЛіМ".)

І сёння ў сям'і Мікалая Аляксандравіча Іванцова найшаноўныя святы — Дзень Перамогі і Дзень Вызвалення. Дык са святам вас, паважаны калега.

Н. К.

На здымку: (злева направа) беларус Мікола ІВАНЦОЎ, рускі Васіль СІНІЦЫН і грузін Рыгор ГВІНІЯШВІЛІ. 1945 г., Германія.

"Роднае слова", № 4

Вопыт літаратурна-краязнаўчай працы ў Гомельскай беларуска-славянскай гімназіі № 36 імя Івана Мележа разглядае Н. Колтышава ("Жыве на Гомельшчыне дух асветніцтва"). Творчасць Я. Пушчы, Т. Кляшторнага, У. Жылкі і іншых даследуе І. Багдановіч ("Паэтычны авангард і багема 1920-х гг."). "Лісты да сабакі" Язэпа Пушчы ў кантэксце паэзіі 1920-х гг." — развагі В. Максімовіча. Да гэтых публікацый прымыкае артыкул Н. Заяц "Ясенінскія традыцыі ў творчасці Язэпа Пушчы". Змешчана і падборка вершаў Я. Пушчы "Мая песня ў палёх заначуе...". Алена Яскевіч ("У святле высокага ідэалу") разважае пра творчасць У. Глушакова. У "Анталогіі старабеларускай літаратуры" Т. Казакова прапануе творчы партрэт Г. Цамблака ("Сярэднявечны аратар-мастак"). Можна пазнаёміцца з адным з твораў гэтага пісьменніка — "Слова на адсячэнне галавы святога і слаўнага прарока і папярэдніка і хрысціцеля Іаана". Пра жыццё і творчасць М. Канапніцкай піша Е. Лявонава ("Дзе ж тая песня, што нібы прысяга..."). У рубрыцы "Шматгалосае рэха" Я. Міклашэўскі знаёміць з перакладамі верша А. Пушкіна "Я помню чудное мгновенье". Можна прачытаць таксама артыкулы М. Молаха "Ягады ў фразеалогіі і народнай культуры беларусаў", Т. Шамякінай "Культура эпохі ранняга Сярэднявечча", заканчэнне артыкулаў Г. Ісакава "Пра мастацкае жыццё віцебскага краю (канец XIX — пачатак XX стст.)", Ю. Захарынай "Адлюстраванне нацыянальнай ментальнасці ў беларускай мастацкай культуры 1970—1990-х гг." і іншымі публікацыямі.

ЗАПІСЫ

Франц СІЎКО

●

Суседка, баба Марылька, вырашыла праверыць нявестку на трываласць сваяцкіх пачуццяў. Вяртаючыся ў спякотны поўдзень ад пастаўніка з даёнкаю, акуратна адставіла яе ўбок, а сама павалілася на сцежку — нібыта страціла прытомнасць. Звыклая да свякровіных выбрыкаў нявестка як ішла, так і пайшла сабе міма.

— Во дык нявестачка! — выгукнула наўздагон старая. — А каб млека разлілося?!..

●

Дзед Юлісь і баба Гілена заўсёды замест "чорт" прамаўлялі "хорт". Няйначай, змена аднаго гуку рабіла ў іх свядомасці д'ябальскую істоту не такой злавеснай.

●

Сённяшні час на Беларусі — час чакання. Усе чакаем... учынкаў ад іншых...

●

Колькі гадоў таму адзін даволі вядомы літаратар настойліва даводзіў:

— Пісаць трэба, як рука павядзе. Чым менш дбаеш пра ўсе гэтыя філалагічныя нюансы, тым лепш.

Перачытаў нядаўна ягоныя творы. Ну, не ведаю, не ведаю...

●

У глухой, запаветнай вёсачцы побач з Панізнікавым Лявонпалем. Хлопчык тузае дзеўчанё за коску, а тая яму:

— Не руш, бо скажу тату!

А цётка-аднавяскоўка:

— Ой, дзяцёнак, да таты даехаць і ста даляраў, пэўне, не хопіць.

●

Беспадстаўна пакараны напярэдадні сямікласнік сядзіць на ўроку моўчкі, не ўсміхаецца.

— Федзя, мы ж усё высветлілі, — кажу, каб неяк расшавяліць вучня. — Дык чаму не адпусцішся?

— А каб потым не расчароўвацца, — адказвае.

●

Суседнія з маім Мізарэчам вёскі Сташулі і Каснарэўшчына называюць Абісініяй і Кітаем. Мізарэча таксама мае другую назву — Куба. Па-першае, наводшыбе. Па-другое, свой Фідэль ёсць — у асобе дзядзькі Петрака. Дакладней, быў, бо ўжо колькі год спачывае на мясцовых кладах. Як, дарэчы, і многія з "кубінцаў", "абісінцаў" ды "кітайцаў". Большасць недарэчна палегла, не дацягнуўшы да шасцідзесяці. Зараз з усіх трох вёсак адна "Абісінія", радзіма Галіны Тычкі, сяк-так яшчэ ліпіць.

●

Пры паступленні ва універсітэт, паспяхова здаўшы тры першыя экзамены, на апошнім, па гісторыі, "паплыў". Два маладыя, гадоў па трыццаць пяць, экзаменатары, чую, раяцца між сабою:

— Што будзем рабіць?

І пачынаюць шукаць штосьці ў нейкім даўжэзным страхавітым спісе. Не знайшоўшы, што шукалі, вырашаюць:

— Ат, паставім пяцёрку, хай чалавек вучыцца.

Усе гады з удзячнасцю памятаў тую неспадзяваную спагадлівасць і ніяк не мог уцяміць яе прычыну. І толькі папрацаваўшы колькі гадоў у інстытуце, нарэшце даўмеўся: пашукалі хлопцы ў "блатным" спісе прозвішча, не знайшлі — і зрабілі, як сумленне падказала.

●

На чацвёртым курсе, закахаўшыся па вушы, каб звярнуць увагу "аб'екта", бразнуўся нападпітку галавой аб дзверыну. Крыві было шмат, павезлі ў бальніцу. Там сшылі рану, пакінулі на тыдзень у палаце. На другі дзень, яшчэ слабы ад "умяшчальніцтва", пабрыў да ўрача прасіць, каб не паведамлялі ў дэканат.

— Не будзем, — адказаў усміхаючыся. — Вы нам гэтулькі песень наспявалі на аперацыйным стале, што грэх было б на вас даносіць.

●

У студэнцтве захапляўся экзістэнцыялізмам. І не заўважыў, як асобныя пастулаты гэтай моднай тады ў Еўропе, а ў нас амаль невядомай філасофскай плыні ператварыліся ў жыццёвае крэда. Атрэсці цяжар іх уплыву ўдалося ўжо падчас працы ў школе. Дзякуй Богу! Жыццё само па сабе дастаткова спраўны разбуральнік, каб яму яшчэ ў гэтым дапамагаць.

●

Спробы пабудаваць паўнавартасную беларускую дзяржаву яшчэ доўга будуць трушчыцца аб звышпільнасць адных і звышасцярожнасць другіх.

●

З прафесарам Іванам Штэйнерам вучыліся ў адной групе. І так склалася, што пасля універсітэта 25 гадоў не бачыліся.

Спаткаліся нядаўна ў Віцебску на адной канферэнцыі.

— Гэта Іван Фёдаравіч, доктар навук, — знаёмячы, кажу цікаўным. — Мы вучыліся разам.

— Так, і спалі ў інтэрнаце на адным ложку, — штораз дадае дасціпны Ваня.

Падчас развітальнай вячэры ўсе кажуць тосты. І я падняўся. Вядома, пачаў з таго, як рады спатканню з сябрам юнацтва. Маўляў, вучыліся разам...

— І спалі на адным ложку, — удакладняе гучным, выдатна пастаўленым голасам прафесар.

— Але арыентацыі не мянялі!

— Не, — аўтарытэтна пацвярджае Іван Фёдаравіч. — Не мянялі.

●

Вакол бацькавага і суседніх котлішчаў — трава ў чалавечы рост. А касіць няма каму. А не так даўно, помніцца, сварыліся за тыя пожні. Згадваю, як напрыканцы сямідзесятых, падчас дзяльбы, дзед укленчыў і, перажагнаўшыся, са слязьмі на вачах стаў даводзіць, што дзелячова кавяла на паўкрок не туды. Маўляў, трэба перамераць.

Усім хапіла.

●

Увайшоў у аднапакаёўку, ледзь даўшы "дзень добры", прагрукаў бруднымі чаравікамі на покуць, трубным голасам сказаў:

— Могло бы быть и получша, но ничаво. Здесь расположимся, племяш.

І, ні згоды не атрымаўшы на часовае пасяленне, не падзякаваўшы, пакінуў свайго пляменніка, якога прывёз уладкоўваць у медінстытут, а сам знік за дзвярыма.

Саноўны, райкамаўскае гадоўлі.

●

Утойваць праўду ад невылечна хворага — няварта. Робячы гэтак, мы, хай сабе і з найлепшых меркаванняў, міжволі пазбаўляем блізкага чалавека магчымасці давесці да ладу апошнія зямныя справы, якія, паводле ягонага меркавання, ён адзін можа зрабіць як след.

Мы з сястрою і братам без малога год хавалі ад маці страшную праўду. Не ўпэўнены, што той высакародны падман яна не ўспрыняла напрыканцы як здраду...

●

Матчыны вочы неўзабаве па скананні — невымерны калодзеж. Семнаццаць гадоў мінула з тае часіны, як у іх зазірнуў, а ўсё не знайду слоў, каб апісаць. І ніколі ўжо, мабыць, не знайду.

●

Слова — адказнейшая рэч. Лішні раз пераканаўся ў тым нядаўна, выступаючы ў турме перад непаўналетнімі злачынцамі.

У зале — сотня чалавек з гакам. Усе ў робах, галовы — аднолькавыя, бы стаўбуны на плоце.

Каб латвей завалодаць увагай, іду на хітрасць: апавядаю праўдзівую гісторыю пра стрыечную сястру, што некалькі год адбывала пакаранне за забойства. Стаўбуны імгненна ажываюць, на тварах з'яўляюцца ўсмешкі.

Напрыканцы сустрэчы абступаюць цесным колам, задаюць пытанні.

А праз пару тыдняў атрымаў з турмы ліст з запрашэннем наведацца яшчэ.

Цяпер сяджу і думаю: ісці ці не? Наблізіў наўмысна да сябе, як роўных, але ці меў на тое права?

●

З усіх дзедавых і бабіных рэлігійных кніжак узяў сабе адну — "Катахізм трэцяга закону Францішка Асізкага". А праз колькі гадоў трапіў на радзіму святога, у Асізі. Шляхі гасподнія?..

●

На шляху з Францыі заначавалі ў вясковым гатэльчыку ў Шчэцінскім ваяводстве ў Польшчы. "Можа, дзядзькава хата дзе недалёка?" — мільгнула думка. Памкнуўся ісці ў рэцэпцыю, каб распытаць, дзе ды што, але сусед па пакоі спыніў: "Кінь дурное, такіх супадзенняў не бывае". Паслухаў яго, не пайшоў. А ўранку, ад'ехаўшыся ад гатэля вёрст пяць, глядзь у вакно — Kszymow. Дзядзькі Ільдэфанса, бацькавага брата, вёска! Адно палюбаваўся тым указальнікам.

●

Нішто не пакідае ў душы такога следу і не лучыць так моцна дваіх, як супольна перажытая ў раннім юнацтве фізічная блізкасць. Таму цяжка даць веры Фаўлзу, калі ён апісвае абсалютнае расчараванне героя пры спатканні з пасталелай і ўжо не такой вабнай, як калісьці, каханкай. Зрэшты, у кожнага свой досвед.

●

Падчас вучобы ў Летнім універсітэце ў Рыме трапіў у адну групу з амерыканскімі студэнтамі польскага паходжання. Праз колькі дзён пасля знаёмства прачнуўся сярэдначы ад дэкламавання ды спеваў на верхняй тэрасе. Аказалася — рэпетыцыя. Заўтра экскурсія на Монтэ-Касіна, дык рыхтуюць літмантаж у гонар пахаваных там воінаў-супляменнікаў.

І ўсё прачула, годна, на бездакорнай польскай мове. Быццам і не было двух дзесяткаў гадоў удалечыні ад гістарычнай радзімы.

Міжволі падумаў: а са сваіх студэнтаў ці выціснуў бы ў такіх абставінах хоць слоўка на мове продкаў?

●

Вёска мая, Мізарэча, — без адзінага карэннага жыхара. Усе з наваколля, пабраўшыся, на панскую зямлю папрыходзілі. Ці не таму гэткі разнабой у маўленні: нада — набе — надабя; саўсім — сусім — сусём; узноў — знова — зновака. І толькі запаволена-думнае "гэта водзека" — як сімвал тутэйшае лучнасці.

●

Апавядае пра заўчасна памерлых сясцёр: як захварэлі, як пакутавалі перад скананнем. І ўсё — нібы жартам, са смешкамі, хі-хі ды ха-ха. На кладах магілак тых сясцёр амаль не відно — удзірванелыя, каб табе кветачка. Дачка нішчымніка. Пры Польшчы бацьку зямлю ля самага балота нарэзалі. Ведалі, каму што можна даць.

●

За пару дзён да мамінай смерці суседка-выпівоха завітала — адведаць. Села ва ўзгалоўі і давай дэчыць, як ёй жыць неахвота. "Саўсім не хачу, Стэфценька, да душы". Можа, суцешыць гэткім чынам хацела?

●

З Васілём Сахарчуком, Валерам Кастручыным і Анатолем Літвіновічам некалькі год падчас вучобы ў БДУ жылі на Паркавай у адным пакоі. Пакойчык вясёлы быў — ні дня без прыгод. Пасля адносна сціплых пагулянак парожнія бутэлькі закідвалі да часу на антрэсолі над дзвярыма.

Аднаго разу — пярэпалах: камісія з дэканата шнырае. Уваходзяць да нас і, як на тое, ад грукату дзверыны адна бутэлька скочваецца з антрэсоляў на падлогу і разбіваецца. Схрон выяўлены, прысуд — выселіць з інтэрната.

На перыяд пошуку кватэр расселяемся "зайцамі" па іншых пакоях. Мне ў чатырыста другім, у знаёмых дзяўчат, выпадае прыпыніцца.

Праз пару дзён — зноў непярэліўкі: намдэкана Лазоўскі ловіць прагульшчыкаў. Я — пад коўдру, накрываюся з галавой.

— Ану, адкрыйце мне яе! — загадвае дзяўчатам.

Адкрываюць.

Ва Уладзіміра Міхайлавіча твар такі, быццам алігатара ўбачыў. І разам з тым усё — удаванае, ненатуральнае, як загадзя ведаў, куды і чаго ішоў.

Відаць, без засланцаў не абышлося.

●

На 3-м ці 4-м курсе, начытаўшыся Сартра ды іншых экзістэнцыялістаў, а больш — пра іх па выданні Ярашэўскага, выступіў на камсамольскім сходзе групы ў абарону індывідуалізму. І не так светапогляд быў у тым выступленні, як юнацкага куражу.

Назаўтра пад шклом у фае перад актаваю залай — верш "Я, Франц Сіўко..." – ананімны, вядома.

Цяпер бы, пэўна, і абразіўся, тады ж адно пасмяяўся ды памылкі зверху на шкле асадкаю выправіў. Можа, і правільна зрабіў: раптам той вершык для аўтара першым крокам на шляху да паэцтва стаў.

●

Неўзабаве па сканчэнні універсітэта ў краслаўскай кнігарні. Касцюмчык сталічнага крою і валасы доўгія — не паспеў выпетрацца налёт студэнцкае вольніцы. Магазіншчыца-латышка з цікаўнасцю:

— Поляк, няйначак?

— Беларус.

І цікаўнасць, і ветлівасць — бы карова языком злізала.

●

У нас праваслаўны — значыць "левы" ці зрэдку "правы", але амаль ніколі не нацыяналіст; каталік — значыць "правы" ці нацыяналіст і калі-нікалі "левы"; уніят — значыць амаль заўжды нацыяналіст і "правы", але ніколі не "левы". Ці дачакаемся, што кожны можа быць і першым, і другім, і трэцім — беларускім?

Фота А.КАЛЯДЫ

ЧАСАПІС

За архіўным парогам...

У Музеі Янкі Купалы адбылася прэзентацыі кнігі Язэпа Янушкевіча "За архіўным парогам: Беларуская літаратура XIX — пачатку XX стагоддзяў у святле архіўных пошукаў". На прэзентацыі выступілі рэдактар кнігі Наталля Давыдзенка, якая 10 гадоў таму натхніла аўтара сабраць свае архіўныя росшукі пад адной вокладкай. І такой бяды, што за "выдавецкім парогам" рукапіс адляжаў ні многа ні мала — 7 гадоў! Сапраўдныя рукапісы з каштоўнымі, невядомымі старонкамі, здабытымі ў архіўнай цішы пра нашых папярэднікаў — Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, ягоную дачку Камілу і ўсё радаводнае дрэва гэтага знакамітага роду гербу Лебедзь, пра Францішка Багушэвіча і легендарнага Паўлюка Багрыма, Вайніслава Суліму Савіча-Заблоцкага, Янку Купалу, Максіма Гарэцкага, Вацлава Ластоўскага, Браніслава Эпімаха-Шыпілу, Лявона Гмырака, Сцяпана Александровіча, Сакрата Яновіча і шмат каго іншых заўсёды будуць надзённыя і запатрабаваныя шырокім чытацкім колам. Што і пацвердзіла выдавецтва "Мастацкая літаратура", выдаўшы кнігу даследчыка немалым па сённяшнім часе накладам — 2 тысячы асобнікаў.

Пра гэта на прэзентацыі гаварылі навукоўцы — акадэмікі, дактары і кандыдаты навук Радзім Гарэцкі, Генадзь Кісялёў, Уладзімір Конан, Зміцер Санько, Міхась Шумейка, Мікола Хаустовіч, Алесь Яскевіч, Казімір Янушкевіч, прадстаўнікі татарскага таварыства "Аль-Кітаб" Ібрагім Канапацкі і Айша Александровіч, празаік Алесь Наварыч, мастацтваўца Валерый Буйвал, землякі аўтара з Валожыншчыны — акадэмік Іван Ліштван і дырэктар ДАМЛіМА Ганна Запартыка.

Вёў прэзентацыю даследчык-энцыклапедыст Янка Саламевіч.

Ян БАРЗДЫНЬСКІ

Дом з дзвярэй — новага лета пачатак

Пачатак лета, традыцыйна, бард Алесь Камоцкі сустракае канцэртам для сяброў. Сёлета прыхільнікі таленту паэта з гітарай сабраліся на ўтульную вечарыну ў сталічным Доме літаратара. Гучалі песні на словы Барадуліна, Караткевіча... Назву канцэрту даў уласны верш Камоцкага.

Цікава, што яшчэ адзін праект пад такой назвай у гэтыя дні адбываецца на творчай прасторы Беларусі. Малады мастак Павел Татарнікаў паказвае сваю графіку ў М-галерэі Гётэ-Інстытута Інтэрнацыёнас. Павел — удзельнік і пераможца многіх еўрапейскіх конкурсаў і выставак кніжнай графікі, аднак гэта яго першая персанальная выстаўка на радзіме. Стварана яна па матывах вершаў Алеся Камоцкага.

Вольга КЛЯШЧУК

Маладыя галасы

У Горках падведзены вынікі трэцяга па ліку конкурсу маладых паэтаў, празаікаў, сцэнарыстаў пад назвай "Дэбют". Арганізатары — упраўленне адукацыі і аддзел культуры. На суд журы прадставілі свае творы больш за 50 чалавек. На выніковым пасяджэнні, дзе прысутнічалі і самі канкурсанты, і члены журы, а таксама ўдзельнікі літаратурных аматарскіх аб'яднанняў "Роднае слова" і "Парнас", гучалі віншаванні, вершы, песні. Лепшым былі ўручаны ўзнагароды. Па выніках конкурсу плануецца выданне літаратурнага альманаха "Маладыя галасы з Горацкага "Парнаса".

С. СКАРОМНАЯ

"Беларуская думка", № 3

Пра тое, чым жывуць сёння культурна-асветныя работнікі Асіпоўшчыны, пра загадчыка Асіповіцкага раённага аддзела культуры В. Налівайку расказвае ў нарысе "Работа без выхадных" А. Марціновіч. Змешчаны вершы Н. Маеўскай і працяг "Ненапісанай аповесці" І. Пташнікава. Творчы партрэт У. Глушакова "У згодзе з міласэрнасцю і высакароднасцю" напісала А. Яскевіч. Э. Скобелеў ("Усёматугнасць і бяссілле прарокаў") рэцэнзуе кнігу С. Князева "Кіраванне: мастацтва, навука, практыка". Прарэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры Р. Бузук выступае з артыкулам "Праблемы ўспрымання спектакля". "Бульбяная школа" М. Шэлехава — магчымасць пазнаёміцца з думкай расійскіх настаўнікаў пра 12-гадовую школу. Прапануюцца палемічныя нататкі А. Рогалева "Свабода і дэмакратыя: карлікі і гіганты". Галоўны рэдактар "БД" У. Вялічка выступае з публіцыстычным роздумам "Спружыны бяздоннай смуты". А адкрываецца нумар словам старшыні Беларускага саюза жанчын Н. Ермаковай "Жанчына — гарант здароўя нацыі".

КНІГАРНЯ

Пякельная рана Чарнобыля

Споўнілася шаснаццаць гадоў з той жудаснай часіны, што падзяліла гісторыю чалавецтва на дачарнобыльскую і паслячарнобыльскую эру. Здавалася б, можна і звыкнуцца, бо шляху назад няма. Але як змірыцца, калі паміраюць тыя, хто мусіў хоць крыху ўтаймаваць неўтаймоўную стыхію, а дзеці, ледзь не паспеўшы нарадзіцца, трапляюць пад нагляд дактароў. Як супакоіцца, ведаючы, што на смяротна хворай зямлі сеюць, збіраюць ураджаі. Дый як заставацца абыякавым, калі нават аўтарытэтныя сусветныя арганізацыі ўжо на ўвесь свет заяўляюць, што куды большую шкоду нанесла не сама радыяцыя, а радыёфобія.

Не маўчыць і літаратура. Сведчанне таму — і творы пісьменнікаў розных пакаленняў, у якіх закранаецца гэтая балючая тэма. Пацвярджэнне гэтаму асобныя кнігі, сярод якіх паэтычная Міколы Мятліцкага «Бабчын», што стала з'явай у сучаснай беларускай паэзіі і была адзначана Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь імя Янкі Купалы. Нарэшце, з'яўляюцца калектыўныя зборнікі. Адзін з іх, што нарадзіўся дзякуючы нястомнасці таго ж М. Мятліцкага — "Прайсці праз зону" — выйшаў у выдавецтве "Мастацкая літаратура" да дзесяцігоддзя гэтай трагедыі. А пасля і Дні літаратуры, прысвечаныя яе з'яўленню, прайшлі на Гомельшчыне. Было шмат сустрэч з людзьмі, якім лёс наканаваў жыць у раёнах, дзе ўздзеянне "мірнага" атама па-ранейшаму вельмі моцнае, і спатканні з тымі, хто мусіў пакінуць родныя мясціны. Гучалі вершы, публіцыстычныя выступленні.

Мікола ж Міхайлавіч, памятаю, па прыездзе ў Мінск, неяк сказаў: "Абавязкова трэба складваць і другую кнігу". Прадчуваючы маё ўнутранае пярэчанне, што сродкі знайсці няпроста, дадаў: "Калі на першую грошы знайшліся, знойдуцца і на наступную". Сапраўды: знайшліся. І толькі сам М. Мятліцкі ведае, колькі сіл яму каштавала гэта, як настойліва давялося грукацца ў розныя кабінеты, даказваючы неабходнасць працягваць чарнобыльскі мастацкі летапіс. Зразумелі, падтрымалі. І вось зноў зборнік прозы, паэзіі, публіцыстыкі "Прайсці праз зону" перада мною на стале. Выпушчаны той жа "Мастацкай літаратурай", а ў выхадных даных пазначана, што гэта другая кніга.

Па сутнасці, вытрымана тое ж мастацкае афармленне і паліграфічнае выкананне. Што да апошняга, дык добры друк, адпаведная папера. Вядома, ілюстрацыі, а гэта карціны мастака В. Шкарубы маглі б быць больш якаснымі, калі б для іх узялі мелаваную, але прычына зразумелая — давялося эканоміць. Дый ілюстрацыі і так шмат гавораць. Гэта дакладна схопленыя пэндзлем новыя краявіды новага Палесся. Магчыма, правільней словы "новага", "новыя" ўзяць у двухкоссе, бо лепш у такім сэнсе іх не ўжываць. А што адбылося непапраўнае — нагадваюць вершаваныя подпісы М. Мятліцкага. Лаканічныя, усяго па чатыры радкі пад кожнай карцінай. Адзін з іх — да выявы дарогі, што губляецца за гарызонтам:

Гэты шлях, нагамі утаптаны,
Коламі парэзаны, — знямог
У чаканні звычных крокаў ног,
У пяску залётным пахаваны.

Пахаваны і цэлыя вёскі. І нешта пахавана ў душы кожнага з нас. Нам ўжо ніколі не быць такімі, якімі былі да Чарнобыля. Можна супакойваць сябе, што да яго далёка. Можна цешыць спадзяваннем, што ў мае мясціны радыяцыі не так лёгка дайсці. Можна... Але ж — паветра адно. І вада — адна. Дый і Беларусь — адна на ўсіх, а гэта ж — бяда Беларусі, таму і бяда кожнага з нас:

Больш не радуюць кветкі
І не клічуць грыбы.
Не магу я быць гэткім,
Як да гэтага быў.
Роздум змрочным тыранам
Будзе роспач цвяліць.
Незагойнаю ранай
Мне Чарнобыль баліць.

Што пакіну я ўнуку?
Што я сыну скажу?
На людзей і навуку
Я іначай гляджу.
І віной дараванай
Гора не адбяліць.
Невылечнаю ранай
Мне Чарцобыль баліць.

Гэта радкі з верша Г. Бураўкіна, змешчанага ў першым раздзеле "Сполахі зарніц". Ёсць яшчэ і раздзел "Зона павышанай радыяцыі", а ў кожным з двух падраздзелы — укладальнік І. Бутовіч паклапацілася, каб як мага паўней ахапіць самыя розныя аспекты гэтай тэмы, таму ў кнігу ўвайшлі творы, што дазваляюць як бы прасачыць свой шлях, пройдзены ад самой катастрофы да дня сённяшняга. Безумоўна, прамаўляецца ўсё гэта, як кажуць, не напрамую — выключэнне толькі публіцыстыка, бо ў прозы, а тым больш у паэзіі іншыя магчымасці. Але, дзякуючы майстэрству аўтараў, яшчэ раз яскрава ўсведамляеш, што Чарнобыль — бяда, якой, на жаль, неадлучна быць не з адным пакаленнем беларусаў. І як бы не хацелася заставацца аптымістамі, супраць ісціны не пойдзеш, а яна такая, што ад яе нікуды не дзенешся:

Ад выбуху чарнобыльскай бяды,
Як цені чорныя, бягуць гады.
Ды кожны дзень, нібы апошні дзень,
Жывём і дзякуем за жыццё Богу.
І ўсё часцей перарывае цень
Людзям жыццёвага святла дарогу.
Здаецца, трэба ж уцякаць хутчэй
Адсюль, каб ратаваць хаця б дзяцей,
Але сядзім, заложнікі бяды,
Бо Тут Айчына, нашы Тут Магілы
І нам яшчэ цвітуць вясной сады,
Хаця для нас нішто падчас няміла.

Такая чарнобыльская праўда ў В. Шніпа. Інакшай яна і быць не можа, бо чарнобыльскі прысак дайшоў і да яго роднай Валожыншчыны, таму падборка "Дым над Айчынай" і адкрываецца такім вершамі: "Ёсць на Валожыншчыне чорная трава — // З Чарнобыля занесена вятрамі. // І ў лесе плача, як чыясь душа, сава // Самотнымі, як гэты свет, слязамі". А што ўжо казаць пра П. Вераб'ёва?!

Я вырас ту і вось амаль крадком
Іду туды, адкуль навечна выбыў.
Паглядам сумным змераў бацькаў дом
Мяне цераз запыленыя шыбы.

У Г. Чарказяна ("Чарнобыльская цішыня") боль за тое, што здарылася, набывае сусветны размах: "У чарнобыльскай цішыні, // Перапоўнены мальбой і журбою, // Творца Сусвету, // Сам я плачу без слёзаў // Разам з Табою..." (пер. Р. Барадуліна). Сам жа Р. Барадулін у вершы "Жалоба" задае пытанне, актуальнасць якога сёння, пасля таго, як, паўтараю, некаторыя сусветныя арганізацыі пачалі сумняваецца ў жудаснасці Чарнобыля, становіцца яшчэ больш відавочнай: "Як стронцый трашчыць // У нашых касцях, // Ці чуе свет?".

Творы каторага паэта ні прачытаеш — В. Зуёнка, У. Паўлава, Б. Спрынчана, Г. Пашкова,

Хочаш цуд? Калі ласка!

Зусім нядаўна яшчэ давялося мне паразважаць на лімаўскіх старонках пра кнігу Анатоля Бутэвіча «У гасцях у вечнасці», выпушчаную Выдавецкім таварыствам з абмежаванай адказнасцю «Кавалер Паблішэрс». Тады ж і выказаў пажаданне, што вельмі добра было б, каб менавіта А. Бутэвіч прадоўжыў цікавую, вельмі змястоўную і гэткую патрэбную сёння дзецям серыю «Сем цудаў Беларусі». І не ведаў таго, што Анатоль Іванавіч ужо працуе над яе працягам. Не прайшло і некалькі месяцаў, як з'явіўся яшчэ адзін зборнік — "Званы Нямігі". У тым жа самым "Кавалеры" з гэткім жа цудоўным афармленнем мастака Паўла Татарнікава. І няменш цудоўным паліграфічным выкананнем — гэта ўжо заслуга калектыву Мінскай фабрыкі каляровага друку.

Але ж, як і ў выпадку з папярэдняй кнігай, канечне ж, вельмі шмат папрацаваў сам А. Бутэвіч, каб, прытрымліваючыся праблематыкі згаданай серыі, чарговы раз павесці з чытачамі (кніга найперш адрасуецца малодшаму і сярэдняму школьнаму ўзросту) гаворку аб тых старонках нацыянальнай гісторыі, якія грэшна не ведаць, а пазнаёміўшыся з імі, не толькі пашырыш свой кругагляд, а і ўпэўнішся: шмат цудоўных куткоў на планеце, а Беларусь — адна. Са сваёй багатай даўніной, з тым непаўторным, што знаходзіцца менавіта тут, якраз на гэтай зямлі.

Вельмі ўдалая назва кнігі. Звычайна паняцце "званы" асацыіруецца з вечным нашым болем — Хатынню. З фашысцкай навалай, якая забрала, па ўдакладненых звестках, не кожнага чацвёртага, а трэцяга беларуса. Дарэчы, пра Вялікую Айчынную вайну А. Бутэвіч таксама згадвае. Нарыс "Брэсцкая крэпасць" — пра тое месца, дзе "заўсёды застаюцца ўтраіх — ПАМЯЦЬ, МУЖНАСЦЬ, ВЕЧНАСЦЬ..." Брэсцкая крэпасць — таксама адзін з "сямі цудаў Беларусі". Але цуд — і Нямігa. Як слушна заўважае аўтар у звароце да чытача, "званы далёкай Нямігі, як і голас ссівелых летапісных замкаў, што былі некалі гняздоўямі беларускай славы, праз стагоддзі вечнасці далятаюць да нас, поклічным памкненнем абуджаюць душу, варушаць прысак памяці".

Нарыс "Нямігa" карысна прачытаць не толькі дзецям, бо ў ім нямала цікавага фактычнага матэрыялу. І не толькі такога, які, як кажуць, у шырокім ужытку. А. Бутэвіч, як бачна са зместу і гэтай кнігі, і "у гасцях у вечнасці", перш чым узяцца за напісанне таго ці іншага нарыса, шмат працуе над першакрыніцамі. А гэта дазваляе яму прыводзіць звесткі, якія, несумненна, для сяго-таго стануць і першаадкрыццём. Ва ўсякім разе, не баюся прызнацца, пакуль не прачытаў "Нямігу" А. Бутэвіча і не ведаў, што некалі "адзін свой выток Нямігa, або ў старажытнасці Няміза, брала ва ўрочышчы Мядзвежына на паўднёвым захадзе Мінска". А гэта ж амаль поруч з вуліцай Янкі Маўра, на якой жыву цяпер, акурат там, дзе толькі пасля снежнай зімы дый у выніку дажджоў зарослы раўчук напаўняецца вадой.

Прыемна перажываць падобную радасць першаадкрыцця. А колькі такіх момантаў будзе ў дзяцей, якія пазнаёмяцца са "Званамі Нямігі"? Што ні нарыс, змешчаны ў ёй, абавязкова прысутнасць невядомага пра вядомае, а то і зусім шлях у нязведанае. Як у нарысе "Жыровіцкі абраз Божай Маці", у якім расказваецца аб тым, як цудатворны абраз гатовы тварыць сапраўдныя цуды. Прасочваючы гісторыю "адной з найбольш шанаваных хрысціянскіх святынь на Беларусі", А. Бутэвіч таксама заглыбляецца ў сівую даўніну. Адлік у дадзеным выпадку бярэцца ад аднаго з летніх дзён 1470 года, калі і быў знойдзены гэты абраз. Далейшая гаворка — развагі, якія спалучаюць у сабе самыя розныя факты, якія і дазваляюць пераканацца, што сапраўдныя цуды знходзяцца сярод нас і яны часам на мяжы магчымага.

Кнігі, падобныя "Званам Нямігі", тым і цікавыя, што абуджаюць нацыянальную свядомасць, ненавязліва пераконваюць: любіць самааддана сваю Радзіму — найперш ведаць дасканала яе гісторыю, бо гісторыя, пры ўважлівым стаўленні да падзей даўніх, шмат што можа сказаць і расказаць. Важна толькі, каб аўтар не толькі даходліва падаў неабходны матэрыял, а і змог па-належнаму заінтрыгаваць. А гэта А. Бутэвіч і ўмее рабіць. Ён не проста расказвае, ён напамінае: уважліва аглядзіся наўкола і нешта для сябе цікавае абавязкова адкрыеш.

З падобным намерам напісаны і нарыс "Кітабы: "Калі верыць народным паданням і легендам, то Беларусь ці не самая багатая ў Еўропе краіна на схаваныя ў яе нетрах скарбы. Аднак мала каму з шукальнікаў удалося адкрыць гэтыя зачараваныя схроны. Відаць, не мелі яны чароўнай папараць-кветкі ў руках, якая паказвае шлях да тых падземных сховаў". Дый, як вядома, ёсць і іншыя багацці: "Назоў гэтым скарбам — духоўнае заможжа нашых далёкіх і больш блізкіх продкаў, што ў сукупнасці складае багатую і размаітую беларускую культуру". А памнажалі гэтае "Духоўнае заможжа" "...рукапісныя кнігі, створаныя на беларускай мове арабскім пісьмом. Называюцца яны Кітабы, або Аль-Кітабы, Ай-Кітабы".

Цуды зямлі беларускай — гэта і Камянецкая вежа, і Мірскі замак, і Смаргонская мядзведжая акадэмія, пра якіх расказваецца ў аднайменных нарысах. А. Бутэвіч застаецца нязменным прыхільнікам таго, што для дзяцей трэба пісаць гэтаксама, як і для дарослых, але яшчэ лепш. Таму і імкнецца, каб прамоўленае слова лёгка западала ў душу, несучы важкасць і важнасць інфармацыі і застаючыся пры ўсім высокамастацкім. А наколькі вынікі відавочныя, добра відаць па кнізе "Званы Нямігі", якая, несумненна, хутка стане запатрабаванай чытачамі, а для яе аўтара — штуршком для напісання яшчэ адной, гэтым разам трэцяй па ліку.

Анатоль Бутэвіч не напісаць яе проста не мае права. Яму ёсць што сказаць юнаму чытачу. А рабіць гэта ўмее, як можна было ўпэўніцца, надзіва адметна.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

У. Скарынкіна, К. Камейшы, В. Гардзея, А. Камароўскага, М. Пазнякова, С. Давідовіча, В. Лукшы, Я. Хвалея, Л. Рублеўскай, А. Канапелькі, Э. Акуліна, А. Пісьмянкова і іншых (называю аўтараў па чарзе публікацый), адчуваеш далучанасць да болю народа, бо перажытае не дае спакою. А калі боль гэты крыху і праходзіць, з'яўляюцца светлыя матывы, дык гэта з'ява часовая. У дадзеным выпадку да месца параўнанне з сардэчным болем. Ён можа знікаць, але пройдзе пэўны тэрмін, і абавязкова нагадае аб сабе.

Тэма Чарнобыля нарадзіла і паэмы. У кнігу ўвайшлі "Не хварэй!" Н. Гілевіча, "Зязюля" С. Законнікава, "Няходжанае поле" М. Мятліцкага, урывак "Зона" з паэмы А. Камароўскага "Пагоня".

Асобна прадстаўлены вершы пачынаючых паэтаў, аб'яднаныя ў падборку "Чарнобыль грымнуў пасярод вясны..." Празаічны ж раздзел увабраў у сябе афарызмы Г. Марчука, апавяданні І. Навуменкі, В. Карамазава, А. Казлова, Б. Пятровіча, І. Канановіча, Н. Рыбік, А. Ждана, аповесць І. Шамякіна "Зона павышанай радыяцыі".

У раздзеле публіцыстыкі "Чорны бусел — белы цень" вылучаецца выступленне Паўнамоцнага і Надзвычайнага Пасла Італіі ў Рэспубліцы Беларусь (сакавік 1997 — люты 2001) Д. Чаруці "Падарожжа ў страчаны свет", у якім ён дзеліцца думкамі, што з'явіліся падчас наведвання чарнобыльскай зоны ў выніку паездкі, арганізаванай Міністэрствам замежных спраў РБ у верасні 1999 года для дыпламатычнага корпуса Мінска, а таксама расказвае аб тым, што робіць Італія, каб дапамагчы Беларусі перажыць гэтае гора.

Завяршаецца ж кніга вершамі М. Мятліцкага (ён прадстаўлены і вялікай падборкай сваіх твораў) "На полі страт", напісаным з позіркам у перспектыву:

Падступяцца наступнікі-стагоддзі
Няспешлівай хадою, спакваля,
Ізжіўным днём зашчодра жыта ўродзіць
Тут, дзе ляжыць пад цэзіем зямля.

Хочацца спадзявацца, што так і будзе, а пакуль не адпускае ад сябе ўжо згаданы верш Г. Бураўкіна:

Той чарнобыльскай ноччу,
Як у жудасным сне,
Напамінам прарочым
Скаланула мяне —
Бліскавіцай урану
Можна свет спапяліць.
І пякельнаю ранай
Мне Чарнобыль баліць.

Кніга "Прайсці праз зону" — частка гэтага болю. Болю кожнага з нас. Болю ўсёй Беларусі.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Часопіс аднаго пісьменніка

У Маскве літаратурны музей-цэнтр Канстанціна Паустоўскага — у парку "Кузьмінкі". Даследчыкі і прыхільнікі творчасці вялікага рускага пісьменніка выдаюць і часопіс — "Мир Паустовского". Пабачыла свет болей як дваццаць нумароў.

Прыкладам, змест аднаго з нумароў: публікацыя без купюр артыкула К. Паустоўскага "Каму перадаваць зброю?", а следам — пра акалічнасці напісання артыкула па просьбы газеты "Литература и жизнь" у 1956 годзе (першая публікацыя — пасля смерці аўтара ў 1982 годзе ў часопісе "Юность"). Друкуецца і "Запіска ў ЦК КПСС аб настроях сярод пісьменнікаў". Наступны раздзел "Успаміны" (Уладзімір Цендракоў, Іосіф Дзік, Іна Гоф, Юрый Казакоў, Макс Брэменер, Міхаіл Коршунаў, Рыгор Бакланаў, Мікалай Воранаў, Вольга Кожухава, Уладзімір Шорар). У "Школе Паустоўскага" выступаюць Рычы Дасцян, Юрый Бондараў, Барыс Балтэр, Леў Крывенка, Наталля Тарасенкава, Анатоль Злобін, Галіна Карнілава, Анастасія Пярфільева, Уладзімір Коблікаў. Да творчых лёсаў згаданых пісьменнікаў так ці іначай спрычыніўся Канстанцін Паустоўскі.

Па традыцыі друкуюцца ў часопісе "Мир Паустовского" хроніка, пісьмы ў музей і рэдакцыю. Пазнаёміўшыся з часопісам аднаго пісьменніка, хацелася б памарыць. Мо ў Беларусі з'явіцца часопіс "Свет Караткевіча"?.. Альбо — "Свет Мележа"... Будзем верыць у лепшыя часы айчыннай літаратурна-мастацкай перыёдыкі.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

АЛЬФА-БЭТА

Маладзее наша літаратура, маладзее наша навука, маладзее і сама Беларусь. Ірыне Пархоменцы ўсяго 16 гадкоў. Яна навучэнка 4 курса Гуманітарнага Коласаўскага — імя Якуба Коласа, сёлетняга песняра, і Уладзіміра Коласа, стваральніка і нязменнага дырэктара ліцэя, дарэчы, аўтар тэксту ліцэйскага гімна. Гэты артыкул не першая яе спроба ў жанры літаратурнай крытыкі. У яе запасніках ёсць цікавы артыкул пра паэзію Яўгеніі Янішчыц. Яна піша апавяданні, нарысы пра людзей цяжкага лёсу, перакладае. Наогул жа збіраецца стаць журналісткай. Калі атрымаецца стаць літаратарам, то што ж! Яна не мае нічога супраць. Да ўсяго сказанага дадам, хоць гэта ў нас пакуль што не вельмі прынята рабіць, што Ірына з'яўляецца пляменніцай нашай знанай спявачкі Валянціны Пархоменкі, якая цяпер знаходзіцца ў Злучаных Штатах: гены, радавод таксама нагадваюць аб сабе. У нашым ліцэі гэта не рэдкасць, калі менавіта бацькі, сваякі і іх адданасць беларускасці вызначае далейшы шлях дзяцей. Шлях самой Беларусі.

Міхась Тычына,
выкладчык літаратуры НДГЛ імя Якуба Коласа

"Распяў душу за маці-Беларусь..."

ЗАПІСЫ НА ПАЛЯХ ЗБОРНІКАЎ ТОДАРА КЛЯШТОРНАГА

Зборнікі вершаў "Кляновыя завеі", "Светацені", "Ветразі", "Палі загаманілі", "Праз шторм на штурм" падпісаны імем і прозвішчам, якія ўжо сваім гукапісам выдаюць паэта: Тодар Кляшторны. Але ці адзін і той жа гэта чалавек?

Адзін з гэтых Тодараў піша прачулыя радкі, прысвечаныя любай, няхай сабе і дужа песімістычныя, нават безнадзейныя:

Хто распяў з каханнем сэрца на крыжы, —
Раскажы мне праўду, любая, скажы?!
І маўчаць пацёмкі... Любая маўчыць...
Ледзянеюць словы, і душа баліць...

А другі — з незразумелай лютасцю накідваецца на былых сяброў па "беларускай справе": "І побытаў сівых больш непатрэбна нам. Стары паганскі міт мы выкінулі ў хлам", "І што пра іх сказаць? Імкнуцца яны краіну адагнаць на рэйкі Скарыны", "магільных спраў майстры", "У вас і папа Пій напэўна беларус? Ён так жа супраць нас заўжды", "нацыянальныя Іуды" і г.д.

Адзін — выяўны імажыністы, любіць Ясеніна і не чужаецца "ясеніншчыны". У Кляшторнага: "Калі пад цінаю імшараў Засвішча волат гарадоў, Я разаб'ю пустую чарку На полі выпітых гадоў". У Ясеніна: "І каб свет, як келіх гэты, Лёгкай пенаю не згас — Пі, каханая, без мэты: На зямлі жывём мы раз" (пераклад мой).

Другі, лёгка гуляючы рыфмамі і рытмамі, піша ў футурыстычнай манеры, сугучнай з вершамі Маякоўскага:

Гуляй, фашыст,
крышы,
ламі,
грамі.
Балюй свой баль
апошні і крывавы.
Германія ў агні,
Германія ў крыві —
Арэна дзікай катаўскай расправы.
Што крок —
пагром,
разгром
і турмаў лес...
Жывое ўсё зацята
ў смерці нерат...

Адкуль такі напал страсці ў паэта? Ад Маякоўскага — хіба толькі "лесвічка", асанансныя рыфмы (галосныя супадаюць, а зычныя расстаўлены вельмі прыблізна), часам гэта агульнасць думак ("Хай нераўня мы Еўропам, Амерыкам, — Заўтра дагонім і іх", — несумненна перагукаюцца з вядомымі радкамі рускага "будзетляніна": "Вашу хутканогую знакамітую Амерыку мы і дагонім, і перагонім"). Германія, — можа, гэта горшае ў сталінскай эсэсэсэрыі? А Амерыка — жаданая будучыня?.. На гэта пытанне мог бы адказаць сам Кляшторны.

Так званая багемшчына, разгульная кабацкая рамантыка, схільнасць да мяшчанскіх уплываў — колькі пушчана савецкімі паэтамі, у тым ліку і сапраўды "лепшымі і таленавіцейшымі", вострых стрэлаў у гэтую мішэнь?! Думаю, што Тодару Кляшторнаму добра дасталося б і ў 60-70-я гады за вобразы "ледзяных гітар", "кілішкаў", "ружовых хмар" і інш. Наўрад ці прайшлі б нават выдавецкую цэнзуру, не кажучы ўжо пра Галоўліт, вершы "Кляновыя завеі" ("Як сумна, любая, дакоры з твайго кілішка дапіваць"), "Зацвілі сярэбраныя росы"("Зацвілі сярэбраныя росы ў кілішках выцвілых лістоў"), "У вёсцы"("Дзяўбнеш паўчарачкі, — святлей на свеце жыць"), "Ліст у Сібір"("З пунсовай шклянкі белая зіма частуе Мінск наліўкай ледзяною"), "Калі часы астудзяць жыцця хвалі"("Стары карчмар нас разлічыцца просіць за п'янае юнацкае віно"). Паралелі з Ясеніным відавочныя. Аднак у Кляшторнага пераважаюць выразныя песімістычныя настроі, у той час як Ясенін імкнецца прыхаваць свае пачуцці пад вобразам бесклапотнасці і нават бадзёрасці.

Тодар Кляшторны не вельмі верыў у магчымасць будаўніцтва светлай сацыялістычнай будучыні, аднак мусіў падпарадкоўвацца тагачасным законам, часта забываючы або не жадаючы стрымліваць свае пачуцці ў творчасці. Як сімвал прадбачання жахлівых наступстваў савецкіх часоў гучаць, на маю думку, у Кляшторнага халодныя матывы верша "Зазімак":

Мёрзлы месяц з-за гор васількамі
Перасыпаў азёрную сінь.
Стыне ўсё...
Ледзянымі сярпамі
Выйшла восень рабіну касіць.

Тоўпы зор снегавым пералівам
Разматалі ў палях павады.
Быццам коні з намыленай грывай,
У пацёмках застылі сады.

Надзвычай трапныя і арыгінальныя метафары ("выйшла восень рабіну касіць", "мёрзлы месяц з-за гор васількамі перасыпаў азёрную сінь", "тоўпы зор снегавым пералівам разматалі ў палях павады") сімвалічна ўжытыя ў вершах дзеля стварэння вобразу і ўзмацнення экспрэсіі выказвання, арганічна спалучаюцца са словазлучэннямі і эпітэтамі "мёрзлы месяц", "ледзяныя сярпы", "снегавы пераліў" і параўнаннем "сады быццам коні з намыленай грывай". Гэтымі таленавітымі мастацкімі прыёмамі паэт стварае ў чытача ўражанне навакольнага холаду, адзіноты, стану змярцвення, у якім знаходзіцца прырода і людзі.

Не менш яскрава падобныя думкі Т. Кляшторны перадае нам у вершы "Белыя паляны, белыя гаі..." Апошнія радкі яго гучаць песімістычна і безнадзейна:

Белыя паляны, белыя гаі,
Пчолы ледзяныя кружацца ў галлі.
І мярцвеюць змрокі між сівых завей,
Прытуліся бліжай, сэрца абагрэй...

Зноў і зноў сустракаюцца ў вершы "ледзяныя" вобразы, створаныя пад уплывам імажынізму і сімвалізму; сівыя завеі, ледзяныя пчолы і мёртвыя змрокі надаюць твору столькі тугі і безнадзейнасці, што Т. Кляшторны здаецца, губляе веру ў будучыню і жыццё. На змену вясёлай юнацкай бесклапотнасці і закаханасці прыходзіць чорная скруха, нават адчай, які бязлітасна нішчыць у шматлікіх вершах **паэта светлыя пачуцці маладосці. Тодар Кляшторны шукае паратунку ў вёсцы, настальгія** па якой прымушае яго ледзве не варожа ставіцца да гарадскога быту. Паэт піша пра палі і палеткі, на прасторах якіх ён адчувае сябе вольным душою:

А за вокнамі цені скакалі
Табунамі ліхіх рысакоў...
Ціха таялі
Ў звонкія далі
Пераліўныя хвалі палёў.
Бедных ніў
Залатое прыволле
Задрамала ў тынянай цішы...
Эх ты, поле,
Бязмежнае поле!
Люба мне беларуская шыр!
Хай сягоння кавалкамі вёсен
Сее смуту ў палёх недарод...
Нашы дні —
Не журботная восень,
Нашы дні —
Грамавы веснаход.

Гэта былі радкі з паэмы "У дарозе", напісанне якой, на маю думку, з'яўляецца своеасаблівай спробай Т. Кляшторнага пазбавіцца чорнай славы "ледзянога гітарыста". Сваім мастацкім стылем і заклікамі аўтар паказвае, што яго паэзія не ўпадніцкая і не мяшчанская, хаця матывы "разбуральнай ясеніншчыны", якую не вельмі паважалі ў беларускіх літаратурных колах, зноў гучаць у паэме вельмі выразна. Для параўнання прывяду ўрывак з верша Ясеніна "Заспявалі цёсаныя дрогі" (у маім перакладзе):

О Русь, — малінавае поле
І сінь з рачною цішынёй.
Люблю да радасці і болю
Азёрны смутак вечны твой.
Я не хачу жаданай волі,
А ты схавалася ў смугу.
Ды не любіць цябе ніколі
Я навучыцца не змагу.
Я скінуць кайданоў не мару,
Не развітаюся са сном,
Калі гучаць мае абшары
Малітваслоўным кавылём.

Заўважым, што ў вершах абодвух аўтараў прысутнічаюць вобразы роднага поля, абшараў, прастору і, безумоўна, любові да Радзімы. У Ясеніна тэма Радзімы гучыць пранізліва-журботна, з адценнем аскетызму і скрухі, а ў Т. Кляшторнага — бадзёра і аптымістычна. Ствараецца ўражанне, што Кляшторны зрабіў гэта наўмысна, паспрабаваўшы падпарадкавацца савецкім законам напісання вершаў. Але, калі я чытаю радкі "Нашы дні — не журботная восень, нашы дні — грамавы веснаход", чамусьці ў думках узнікае параўнанне грамавога веснахода з разбуральнай сілай савецкай улады, якая пад гукі бадзёрых і ўзнёслых лозунгаў знішчала людзей. Ці не быў вобраз грамавога веснаходу своеасаблівым прадбачаннем Т. Кляшторнага свайго лёсу і лёсу вялікай часткі тагачаснай творчай інтэлігенцыі?

Адчуваецца, што абодва паэты вельмі моцна любілі сваю Радзіму і абодва паклалі жыцці на алтар нацыянальнай ідэі і культуры. Часам я думаю, што Кляшторны — гэта наш беларускі Ясенін, талент якога, на жаль, не паспеў рэалізавацца ў поўнай ступені. У вершы "Задыміўся імжою сыр-бор" Т. Кляшторны нават пісаў:

І пад новай жалезнай страхой
Дзе спляліся світальныя цені,
Нарадзіўся Шэкспір і Талстой,
Заспяваў беларускі Ясенін...

Аднак, называючы Кляшторнага беларускім Ясеніным, нельга сказаць, што авангардны стыль яго творчасці выяўляецца толькі ў імажынізме і сімвалізме. Трэцім накірункам паэзіі Кляшторнага, больш характэрным для яго апошніх зборнікаў вершаў "Праз шторм на штурм", "Май над сусветам", "Красуй, ордэнаносная" быў футурызм. Варта адзначыць, што лідэры плыняў імажынізму і футурызму Ясенін і Маякоўскі моцна сапернічалі адно з адным, але Тодар Кляшторны здолеў паспяхова ўжыць у сваёй лірыцы рысы гэтых абодвух супрацьлеглых накірункаў. Паколькі паэт пачаў пісаць у юнацкім узросце, то не дзіўна, што яму хацелася паспрабаваць сябе ў розных плынях, а, можа, і адкрыць нешта новае, сваё. У футурыстычнай манеры аўтарам былі напісаныя вершы "Памяці тав. Куйбышава", "Веснаход", "У вянок памяці таварыша Кірава", "Рукі прэч", "Сляды дарог" і інш. Ужо па назвах можна меркаваць, што ў гэтых творах актыўна прапагандаваўся сацыялізм, бо без такой прапаганды ў 30-я гады ні мог існаваць не адзін паэт.

Апошнія месяцы жыцця Кляшторнага ўсё больш і больш клапаціла пытанне зададзенае ў адным з яго вершаў: ці варта сёння быць паэтам? Неспрыяльны час, неспрыяльныя ўмовы — усё было супраць Тодара Кляшторнага, але ў гэтай бітве ён перамог і стаў сапраўды таленавітым творцам, хаця і не паспеў нам цалкам раскрыць свайго багатага паэтычнага таленту. Заўчасная смерць — вось вынік раптоўнага павароту лёсу і такога кароткага жыцця.

Мабыць Тодар Кляшторны прадчуваў гэткі канец, але, нягледзячы ні на што, заўсёды меў свой суб'ектыўны погляд на свет, імкнуўся выявіць у паэтычным слове "хворасці чалавецтва" і дапамагчы людзям у сітуацыі, калі з-за ціску таталітарнай ідэалогіі ім не заставалася месца ў гэтым свеце. У маім сэрцы заўсёды будуць гучаць неўміручыя радкі паэта, у якіх выявілася яго асоба:

Хто над шляхамі ў сонечнае ранне,
Дзе шапаціць бярозавы абрус,
Аддаў душу за вечнае змаганне,
Распяў душу за маці-Беларусь.

Ірына Пархоменка

Беларусь: далейшае ўпарадкаванне

Пабачыла свет кніга Вадзіма Круталевіча "Рэспубліка Беларусь: адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўпарадкаванне". Аўтар, які, дарэчы, 4 ліпеня адзначыць сваё 80-годдзе, вядомы беларускі юрыст, гісторык, сацыёлаг, мае навуковую ступень доктара юрыдычных навук, а працуе галоўным навуковым супрацоўнікам Інстытута дзяржавы і права Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. В. Круталевіч даўно зарэкамендаваў сябе дасведчаным і ўдумлівым даследчыкам, які ў сваёй навуковай дзейнасці надае вялікае значэнне вывучэнню тэорыі і гісторыі дзяржавы і права. Вывучае таксама гісторыю беларускага нацыянальнага руху. У цэнтры ўвагі яго пастаянна знаходзяцца і пытанні нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння. Сярод навуковых інтарэсаў Вадзіма Андрэевіча і сістэматызацыя заканадаўства, канстытуцыйнага права ў нашай суверэннай дзяржаве.

Згаданая манаграфія і закранае шэраг актуальных праблем, вырашэнне якіх стала магчымым дзякуючы набыццём Беларуссю незалежнасці, а гэта, зразумела, не магло не выклікаць змен у арганізацыйна-тэрытарыяльнай арганізацыі рэспублікі, што адбыліся ў апошняе дзесяцігоддзе. "Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўпарадкаванне, — як сведчыць В. Круталевіч у прадмове, — адзін з важнейшых элементаў дзяржаўнай структуры. Дзяленне дзяржаўнай тэрыторыі на адміністрацыйныя адзінкі розных узроўняў — з'ява ў цэлым уласцівая дзяржавам усяго свету. У суадносінах з ёй знаходзіцца і сістэма мясцовых органаў кіравання і самакіравання. "Прымацаванасць" да тэрыторыі асобнага грамадзяніна, суб'екта дзяржаўнай і грамадскай жыццядзейнасці ёсць аб'ектыўны зыходны пачатак упарадкаванасці грамадскай жыццядзейнасці".

У прадмове В. Круталевіч аргументуе і вытлумачвае сутнасць свайго падыходу да пытання, што вынесена ў загаловак манаграфіі: "Аўтар дадзенай работы імкнуўся прытрымлівацца прынцыпаў матэрыялістычнай дыялектыкі. Разуменне арганічнай перакрыжаванасці аб'ектыўнага і суб'ектыўнага ў развіцці форм адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўпарадкавання — у метадалагічных адносінах, пытанне зыходнае і для тэарэтыка і для практыка. Безумоўна, на трактоўку паняццяў кнігі наклала адбітак аўтарскае разуменне кардынальных пытанняў тэорыі дзяржавы і права, паліталогіі, эканомікі і іншых навук, якія атрымліваюць цяпер новае тлумачэнне, ачышчанае ад "камуністычнай класавасці".

Кола пытанняў, якія закранаюцца ў кнізе, вельмі шырокае, у чым можна ўпэўніцца нават па назвах главаў: "Прызначэнне адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўпарадкавання", "Пачатковыя крокі абнаўлення заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сферы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўпарадкавання", "Раздзяленне паўнамоцтваў дзяржаўных органаў і вырашэнне пытанняў адзміністрайна-тэрытарыяльнага ўпарадкавання", "Найменаванне і перайменаванне населеных пунктаў і іншых суб'ектаў", "Тэрыторыі спецыяльнага прызначэння", "Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўпарадкаванне і месяцовае самакіраванне".

Манаграфія пры ўсёй яе спецыфічнасці, несумненна, зацікавіць не толькі спецыялістаў, а каб у гэтым упэўніцца, дастаткова ўважліва пазнаёміцца з главой "Найменаванне і перайменаванне населеных пунктаў і іншых суб'ектаў". Не лішне ведаць, як кажуць, саму працэдуру гэтага няпростага працэсу. Як і тое, як "дзейнічае" ў дадзеным выпадку заканадаўства: "Перайменаванне адміністрацыйна-тэрытарыяльных і тэрытарыяльных адзінак можа рабіцца толькі ў выключных выпадках. Забараняецца пераймяноўваць населеныя пункты, назвы якіх звязаны з гістарычнай, нацыянальнай і культурнай спадчынай рэспублікі".

З няменшым інтарэсам можна даведацца і пра нацыянальныя паркі, запаведнікі, заказнікі, прачытаць пра тэрыторыі гісторыка-культурнага прызначэння. А ўвогуле, кніга В. Круталевіча "Рэспубліка Беларусь: адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўпарадкаванне" — з выданняў, значэнне якіх цяжка пераацаніць. Тым больш прыемна, што аўтар гэтай манаграфіі, не зважаючы на паважаны ўзрост, паранейшаму знаходзіцца ў актыўным навуковым страі.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

ПАЭЗІЯ

Алег САЛТУК

Ля храма

Званы маўчаць — яны нямыя —
Ніжэй вады, цішэй травы.
Ляціць задумліва Сафія,
Спакон вякоў ляціць увысь.

Арган у водпуску, у храме
Пануе толькі дух святы.
Сінее даль пад купаламі.
І вусцішна ад нематы.

Зірне задумлівае вока
І ўбачыць, хто і што мы ёсць.
Лунае воблачка высока,
Глядзіць на гэту прыгажосць.

Мы прыйдзем некалі з табою
У белы, бы анёлак, храм,
З душою, радасцю і болем
Сваім памолімся багам.

Стаю, гляджу і недаўмею,
І рады сам сабе не дам:
Ці хмарка лебедзем бялее,
Ці белым лебедзем стаў храм?

Твае акно

Сястры ВІЦІ

Добры дзень, руплівая сястра,
Ты мяне малога даглядала.
Стрэцца нам даўно была пара,
Ды заўсёды часу не хапала.

Вось прыехаў, на цябе гляджу,
А ў падумках у Рыжэнькі крочу.
І, відаць, не толькі ад дажджу
У мяне павільгатнелі вочы.

Мне ўсё чыста ўспомніцца з табой.
Я паплачу тут і пасмяюся.
Для мяне былі вадой жывой
Ты і Міхаліна, і Кастуся.

Цёткі ўжо на могілках даўно.
Шмат радні там разам з нашай маці.
Ні прычым да слёз маіх віно —
Мне сябе век цэлы вінаваціць,

Што даўно не прыязджаў сюды,
Што не там і не таму маліўся...
Але ўсё я помніў праз гады,
Пра сваю радзіну не забыўся.

Ходзіш ты на могілкі адна,
Ды не злуйся на мяне, нябогу.
І няхай святло твайго акна
Мне заўсёды свеціць на дарогу.

Крэўнае

У косы русявага жыта
Ўплялі сваю сінь васількі.
Над рэчкай вясёлка, нібыта
Звісаюць з нябёс ручнікі.

Ружовы, блакітны, зялёны —
Вачэй не адвесці ніяк.
Дык будзь жа павек блаславёна
Пад гэтай вясёлкай зямля!

На ёй мне спакойна і люба,
І дорага ўсё ад любві.
І шэпчуць салёныя губы:
— Свяціся,
Красуйся,
Жыві!

Хаты

На вокнах хацінаў — крыжы ды крыжы,
Ля плоту дзядоўнік пад слівай,
А воддаль асінка стаіць і дрыжыць
І ноччу, і днём палахліва.

Завея, залева, спякота, мароз —
Хаціне адно сіратліва.
Яе не рашылі, нябогу, пад знос:
Навошта — і так дажывае імкліва.

Няма гаспадыні, гаспадара,
З унукамі дзеці далёка.
Не стала калісьці ў жывога двара
Ні плачу, ні смеху, ні клёку.

А колькі дамовак такіх і хацін
Маўкліва свой век дажываюць?..
Сыходзіць знямоглая вёска на клін
І клін у душу заганяе.

Зямля нараджэння і смерці зямля,
Адной я табою багаты.
Таму па хацінах і плачу здаля,
І зблізку, нібы вінаваты.

Кастусь ІЛЬЮШЧЫЦ

Вайскоўцу

Не пытай у сябе, што знайшоў
На армейскіх шляхах за жыццё.
Покуль імі грымотна ішоў —
Ты сваё адшукаў забыццё.

Не пытай у сябе, што нажыў,
І багацця ці шмат накапіў, —
Ты задарма ў астрозе пражыў,
Хоць нікога крывёй не крапіў.

Лепш спытай у сябе, што згубіў
У жыцці па даброце сваёй, —
Сам сябе ты забіў, загубіў
І акопнай засыпаў зямлёй.

Шынель

Свабоду райскага адзення
Змяніў на панцыр шыняля
І страхавалася надзейна
Ад бед зямных душа мая.

Я пераняў лагоднасць продкаў,
Аднак удзячны шынялю,
Што спачываў на ім салодка
І сагграваў сукном зямлю...

●

Як жыць далей? На сэрцы — пуста,
Душа — не прагне вышыні.
Ідзеш-брыдзеш праз шэрань пустак
Быцця
да вечнай цішыні...
Ты сёння — геній ці нябога,
Назаўтра — ўсё наадварот...
Твой лёс ад роду — лёс ад Бога,
І доўжыць ён кругаварот
Жыцця твайго ў жыцці Сусвету,
Дзе ў Судны час, упаўшы ніц,
Згадай, як добрую прыкмету,
Святло намоленых зарніц...

Імпрэсія

Брыду, як лось, праз лес густы,
Па пояс грузну я ў сумётах
І з нейкай тайнаю самотай
Тапчу альховыя кусты.

Пакутна гасне белы дзень,
Змяняюцца штоміг узоры,
Паркаль аснежанай прасторы
Запэцкаў вечаровы цень...

Юрась НЕРАТОК

Цемра

Водбліск неба разбіў,
і наслала ўздагон
вераб'іная ноч свае хеўру.
...Адляцеў, як не быў,
растрывожаны сон...
І наткнуліся вочы на цемру.

Дождж не хлышча ракой,
не скуголіць гайня,
не шабашыць нячыстая сіла —
толькі змрок і пакой,
цемра і цішыня...
Што ж за трасца мяне разбудзіла?

І не помню, што сніў.
Ці жывы, ці памёр?
Без дыхання і пульса ляжу я...
Хто ўвесь свет зачарніў,
хто той злосны грымёр,
што маю недалужнасць віжуе?

Ад жахлівай жарствы
нечакана хрыплю...
І кляну сваю псіхіку-сцерву!
А па тым, што жывы,
вызначаю, што сплю —
і глыбей акунаюся ў цемру.

Пераходны ўзрост

Гасцей — не так каб і багата.
Хоць джынсы цёртыя надзень!
Бо для мяне такое свята,
як для мінтая — рыбны дзень.

Без праўды — млосна, з праўдай —
посна,
і факт любы — не адкрыццё...
Ужо, здаецца, марыць позна
і марна — планаваць жыццё.

Яшчэ, здаецца, хопіць сілы,
каб бараніцца ад няўдач.
Пакуль далёка да магілы,
хоць крылы распрастаў крумкач.

Ужо няёмка ў бойку лезці,
ды соромна падціснуць хвост.
І маладосць, і старасць — дзесьці...
Няйначай, пераходны ўзрост!

Падводзіць вынікі — заўчасна,
рабіць высновы — сэнс які?
Як бы ўскараскаўся на прасла —
і ногі ў розныя бакі!

Віно ці воцат, пыл ці порах?
Звон ці ныццё, смоўж ці пчала?
...Я адзначаю сёння сорак.
Час падавацца да стала...

Ты такая ж

То бязвольнаю трэскай плывеш,
то свабоднаю птушкай лятаеш,
то здаволішся тым, як жывеш,
то чагосьці чакаеш.

То заныеш бяссільна ў руках
і бязглузда на лёс наракаеш.
...Я нядаўна цябе напаткаў.
Ну, а ты ўсё такая ж.

Падзяліўся, бы ў некага скраў,
кампліментам тужліва-нахабным:
ты такая ж, якой цябе знаў,
нават стала прывабней.

Дзе і як, хто куды і адкуль —
ну нашто нам пра тое размова?
Я табе спавядаўся, пакуль
не запнуўся аб слова.

А як толькі мой голас заціх,
знесла гонар мой думкай цвярозай:
пасмяялася з вершаў маіх
і пакпіла над прозай.

А як толькі ліхтар заблішчэў,
"Час ісці па дамах", — намякаеш.
Я, здаецца, кахаю яшчэ —
ну, а ты ўсё такая ж...

Рака

Як рака веснавая
крыгаход усчынае,
так душа мая рвецца
са смугі кіцюроў.
Не шкадуй ты Радзіму,
ёй шкадоба — не дзіва,
Ёй патрэбны трэск пугі,
каб з запечку ўспароў.

Мне душу залівалі,
то крынічныя хвалі,
то заводскія сцёкі,
то калгасны смурод...
Не шкадуй ты прыроду,
ты не знойдзеш з ёй згоду.
Не шкадуй ты народа —
дзе ты бачыш народ?

Плынь душы маёй, рэчкі, —
ад пустышкі да свечкі.
Дзе ў бязмежжа ўвальецца?
Дзе вытокі бярэ?
Не шкадуй небараку —
ён забудзе, што плакаў.
Не шкадуй недалугу —
усё роўна памрэ.

ПРОЗА

Усялякае падабенства герояў з рэальнымі людзьмі прашу лічыць выпадковым[2]
АЎТАР

РАЗБІТАЕ СЭРЦА ВІТАЎТА[1]

Сяргей ВЕРАЦІЛА

НАЗВА

Звычайна з назвамі для сваіх тэкстаў я меў некаторыя праблемы, а ў дадзеным выпадку назва выплыла неяк сама сабою і адразу прыйшлася мне даспадобы. Хаця я і меў некаторыя сумневы наконт другое ейнае часткі, а некаторыя (ці не ўсе) знаёмыя нават раілі яе прыбраць, але тады назва стаецца занадта ўжо банальнаю. Але, з іншага боку, другая палова паказвала б на цяпер існуючага носьбіта падобнага імя і прозвішча, і магла б выклікаць не зусім пажаданыя паралелі і меркаванні. У той жа час мне не хацелася мяняць назвы: на маю думку, яна вельмі арганічна дапасоўваецца да тэксту. І пасля некаторых ваганняў я пакінуў усё, як было. А выбар імені лірычнага героя прашу лічыць выпадковым, як і астатнія супадзенні, сыходзячы з прынцыпаў тыповасці ці непаўторнасці людзей і сітуацый.

АБГРУНТАВАННЕ ТЭКСТУ

Спачатку сам тэкст я планаваў рабіць у форме і манеры, да якое прызвычаіліся і якую ў пэўным сэнсе можна лічыць традыцыйнай. Тады ўсё выглядала б прыкладна гэтак: лірычны герой робіць учынак станоўчы альбо адмоўны (у прынцыпе, дял сюжэтаў гэта не мае істотнага значэння), а потым я паказваю на прычыны, што прывялі лірычнага героя да падобнага ўчынку. Альбо яшчэ існуе такі варыянт: спачатку я паказваю прычыны ў дынаміцы і паслядоўнасці паводле іхняе значнасці, а потым паказваю на вынік — адмоўны ці станоўчы — паводле прычынаў. Але я рашуча адкінуў падобныя думкі, грунтуючыся на тым, што любое дзеянне пазбаўлена логікі і мае незавершаны характар. А таму гэтая незавершанасць ёсць падставаю для наступнага дзеяння, якое здольнае перакрэсліць сабою ўсе папярэднія.

РАСКОЛІНА ПЕРШАЯ

Першы раз сэрца майму лірычнаму героя разбіла ягоная ўласная маці. Так ужо здарылася. Калісьці, яшчэ па вайне, яна прыехала ў Менск. Ад ейнае вёскі да вялікага горада цягніком было недзе паўтары гадзіны. А гэты горад паклікаў і забраў да сябе не адну сялянскую душу сваёй звабліваю загадкавасцю. А тым больш дзяўчына і сама разумела, і сям'я ёй гаварыла, што працаваць у калгасе яна не здужае: не тое здароўе, не тая сіла. Але вучыцца ў горадзе яна не стала, і на тое, відаць, мелася шмат прычынаў, і не апошняю з іх было паўгалоднае жыццё паваеннае краіны і беднаватасць, калі не сказаць галеча, вясковых сваякоў. А некалі сям'я валодала ўсёй округаю, праўда, надта ж у далёкім мінулым. У горадзе яна ўладкавалася на адзін з гігантаў новае беларускае індустрыі і стала атрымоўваць штомесяц жывыя грошы, толькі вось з жытлом неяк не шанцавала: усё тулялася па людзях, спачатку арандуючы куткі, а потым ужо і асобныя пакойчыкі — калі крыху стала на ногі. І толькі значна пазней неяк дайшлі рукі займець уласную двухпакаёўку ў кааператыўным пяціпавярховіку. Дарэчы, гэты апошні факт дзесьці непасрэдна спрычыніўся да першае расколіны ў сэрцы майго лірычнага героя.

І вось, калі не браць да ўвагі жыллёвыя праблемы, то жыла яна звычайным дзявочым жыццём. Сама яна — жвавая, спеўная, кемлівая, з бліскуча-сінімі вачыма, хутка абзавялася гуртам сяброўак, з якімі разам бегала ў кіно, на танцулькі, а то і раз-пораз у каго-небудзь збіраліся і абмяркоўвалі сваю дзявочую долю ці нядолю, хваліліся новымі сукенкамі, спявалі песні: і свае вясковыя, і новыя гарадскія, што спявала ўся краіна ад Буга да Курылаў; ну і бывала, што выпівалі на кампанію пляшку-другую салодкага віна. І зразумела, што былі ў яе знаёмыя і сярод асобаў процілеглага полу, і быў у яе сапраўдны раман з маладым чалавекам — курсантам вайсковае вучэльні. Я мала ведаю пра тыя акалічнасці, што прывялі да з'яўлення на свет майго героя, але ведаю, што раман шлюбам не завяршыўся, а курсант так і не стаў афіцэрам. Нібыта ён зараз жыве недзе ў адным з заходніх раёнаў краіны, якраз на самым памежжы, не так ужо і далёка, але мой герой ніяк не выбраўся з'ездзіць туды, на тую радзіму, дзе назва вёскі супадае з бацькавым прозвішчам, якое зусім натуральна гучала б у якой-небудзь Ніжняй Саксоніі. Карацей, мой герой нарадзіўся бязбацькавічам, і прозвішча яму перайшло ад маці, але не гэта сталася тою расколінай, пра якую я меўся казаць.

Нарадзіўся мой герой на самым пачатку шасцідзесятых, калі космас прыадчыніў свае цьмяныя прасторы, а страх пакрысе вымываўся з чалавечых душаў. У часопісах ішла барацьба паміж фізікамі й лірыкамі, Салжаніцын надрукаваў свой "Адзін дзень з жыцця Івана Дзянісавіча", Хрушчоў разграміў абстракцыяністаў і загадаў выдаваць калгаснікам зарплату грашыма. Усе гэтыя ды яшчэ шмат якія падзеі, можа, хіба акрамя апошняе, мала паўплывалі на пачатковы перыяд жыцця майго лірычнага героя. А ён сабе рос, як і належыць здароваму дзіцяці: её, спаў, пэцкаў пялюшкі, плакаў па начах, гугушкаў, гуляўся, здзіўлена, радасна, пакрыўджана ўзіраўся ў навакольны свет і, канешне ж, рос. І калі вырас настолькі, што ўжо ваўсю тупацеў па падлозе сваімі ножкамі, а лыжку з дакладнасцю нёс не ў вуха, а да рота, маці аддала яго на вёску, "у дзярэўню" — на малако, на прыроду, на бясконцую дабрыню бабулі і цётак. І са слоў майго героя магу зазначыць, што гэта былі найшчаслівейшыя гады ягонага жыцця, цуд непасрэднага сутыкнення з прыродаю, той цуд, якому ўжо не дадзена паўтарыцца. Праўда, я дакладна не ведаю, колькі год ён там пражыў, але здаецца, калі я не блытаюся ў чужых успамінах, у дзесяць гадоў сапраўдная вясковая ідылія, георгіка і буколіка скончылася для майго героя вяртаннем у горад, які хоць і з'яўляўся ягоным месцам нараджэння, але быў незнаёмы і арганічна чужы сваім рытмам, імпэтам, формаю і зместам патрыярхальна-запаволенаму вясковаму жыццю. Я не ведаю, што паслужыла прычынаю матчынага рашэння, можа, была нейкая канкрэтная падстава, а можа, рашэнне было спантанным і сведчыла хутчэй на карысць капрызлівага жаночага характара, хаця я схіляюся, што меліся куды як важкія прычыны, каб радыкальна змяніць жыццё майму лірычнаму герою: па-першае, сын павінен быць каля маці; па-другое, менскія школы былі куды лепшыя ад вясковых, а ідэя даць сыну лягчэйшага хлеба праз адукацыю магла нарадзіцца і з вопыту ўласных назіранняў, і з падказкі каго з аўтарытэтных дарадцаў; па-трэцяе, такою прычынаю мог стацца характар майго героя, — мусіць, ужо і ў тым узросце праяўляліся ягоныя імклівасць і неўтаймана васць. Як бы там ні было, але ён апынуўся чарговым першым вераснем на прыступцы аднае менскае школы, і не проста школы, а школы-інтэрната. Вось тут і прайшла першая расколіна на сэрцы, вось тут і адбыўся першы разлом у душы. І тут можна было б сказаць, што і былі пасеяныя першыя калівы зла, і з іх мог бы вырасці страшны ўраджай, але нашага героя чакала наперадзе зусім іншая дарога, зусім іншы незвычайны лёс для большасці людзей, але я не хачу пакуль апярэджваць падзеі, а дам ім разгортвацца адпаведна часавае паслядоўнасці. Можна толькі ўявіць шок дзесяцігадовага чалавека, вырванага з індывідуалістычнага вясковага жыцця і кінутага ў воўчую зграю з воўчымі ж законамі. Уявіць, вядома можна, а вось перажыць... Але ў кожнага — свае асабістыя драмы дзяцінства. Тым больш я не маю на мэце аналізаваць і параўноўваць лёсы розных людзей, я маю толькі прасачыць за феноменам разбітага сэрца Вітаўта. І мне, прызнаюся, было адначасова дзіўна і радасна даведацца, што мой герой не зламаўся, не даў раструшчыць тыя светлыя ўспаміны, што ляглі на ягоную душу сярод лясоў і гоняў роднае прыроды і добразычлівых да дзіцяці вяскоўцаў. Хаця, калі трымацца адное з версіяў, то менавіта добрыя сваякі і спрычыніліся да пераезду ў горад майго лірычнага героя. Але гэтую версію я не прымаю, бо яна не адпавядае майму бачанню першае расколіны.

І вось наш герой апынуўся ў адным з менскіх інтэрнатаў, і хоць я глыбока не знаёмы з побытам у падобных установах, але вазьмуся сцвярджаць, што жыццё майго героя не было там афарбавана толькі чорна-шызымі танамі — былі і светлыя палосы, былі прыгоды, гульні, забавы, хоць, можа, і не заўсёды небяспечныя, але заўсёды такія неад'емныя ад дзяцінства і ранняга юнацтва. Але, акрамя гэтага, была і жорсткая барацьба, калі не за выжыванне (за савецкім часам,у сямідзесятыя гады, дзеці ў інтэрнатах не галадалі, можа, з высмакамі асабліва не выпадала), то была не менш важная, а таму не менш жорсткая барацьба за годнасць, барацьба за захаванне аўтэнтычнасці асобы. Вайна ішла і з дужэйшымі пагодкамі і старэйшымі інтэрнатаўцамі, якія імкнуліся здушыць малодшых сваім брутальным аўтарытэтам. Вось тут на ўсю моц і праявіўся неўтаймаваны дух майго героя і ягоная воля да першынства: ён не толькі паспяхова супрацьстаяў ціску з боку і вучняў, і выхавацеляў, але й стаўся арганізатарам групоўкі, якая правяла шэраг вельмі рызыкоўных авантураў, поспех якіх падняў аўтарытэт майго лірычнага героя і часткова спатоліў ягоную прагу да незвычайнага. Можна сказаць, што мог герой падсвядома, калі не інстынктыўна, намацваў той шлях, які яшчэ прывядзе яго ў свет друкаванае паперы. І ў той жа час там гартаваўся дух, які здолеў захаваць душу ад расчалавечання. Хаця я, можа, ізноў перабольшваю.

РАСКОЛІНА ДРУГАЯ

Пасля школы-інтэрната жыццё майго героя перайшло на звычайную для большасці з нас каляіну. Сярэднюю адукацыю ён атрымаў ужо ў нармальнай гарадской дзесяцігодцы. І свой атэстат з іншымі неабходнымі паперкамі ён аддаў на гістарычны факультэт педагагічнага інстытута, — яму здавалася, што гэта найбольш адпавядае ягоным схільнасцям і захапленням. Але студэнтам мой герой не стаў. І гісторыя пра гэта вылікае прылівы скептычна-іранічнага настрою ў маіх суразмоўцаў, бо не суадносіцца з іхняю рэчаіснасцю. Мой герой адмовіўся ехаць на сельскагаспадарчыя работы, абвясціўшы, што паступіў у ВНУ вывучаць гісторыю, а не капаць бульбу, і забраў дакументы. І тут няўдалага студэнта чакала ліцейка, якую некаторыя вельмі справядліва параўноўваюць з пеклам, потым была служба ў войску, дзе таксама хлеб мёдам не намазвалі. Але акурат у войску, далёка ад Радзімы, у тым мілітарным інтэрнацыянале, Вітаўт адчуў сябе беларусам, менавіта там яму захацелася адрознасці і аўтэнтычнасці сваёй, а не навязанай. Пасля службы ў войску ён вярнуўся ў ліцейку. Але мая задача палягае не ў тым, каб выдаваць факты чужое біяграфіі, хай і прыдуманай, а каб распавесці пра яшчэ адно разбітае сэрца. Хаця ў каго з тых, хто прачытае гэтыя радкі, яно — цэлае? Я мяркую, што маё пытанне і не патрабуе доказу, тут усё і так ясна.

Яшчэ скажу, што мой лірычны герой не пакінуў свае гістарычныя штудыі, і ўдзячная Кліо агучыла ягонае імя не толькі на некалькі сотняў прафесійных аматараў, а незразумелая моц падзеяў павярнула майго героя на той незваротны шлях, які называюць лёсам ці жыццём. Вітаўт адчуў сябе беларусам і стаў служыць Бацькаўшчыне, што ва ўмовах таго, ды і гэтага, часу было нечым сярэднім паміж самаахвярніцтвам і самагубствам (закранутая тэма больш тычыцца трэцяе расколіны, але і да гэтае таксама мае непасрэднае дачыненне), але тады мой герой, як і большасць з нас, пра гэта не здагадваўся. Ды і што казаць: маладосць не верыць ні ва ўласную смерць, ні ў нядолю, а няшчасці здаюцца часовымі і толькі надаюць імпэту. А ў астатнім жыццё маладога беларуса не так ужо і адрознівалася ад жыцця астатніх маладых людзей. І вельмі важнае месца ў жыцці любога маладога чалавека займала каханне. І мой герой у гэтым сэнсе быў вельмі далёкі ад аскетызму, хутчэй назіраўся адваротны працэс. Ды і як можна было захавацца, калі дзяўчаты, што называецца, самі чапляліся за шыю, ногі, рукі, плечы... А яшчэ магу дадаць, што мой герой меў прывабную знешнасць: правільна складзены, з бліскучымі сінімі, крыху вар'яцкімі, вачыма, густыя чорныя валасы з ранняй сівізной — атрымоўваецца даволі рамантычны партрэт. А калі да партрэта дадаць некаторае ўменне сябе падаць, ды яшчэ някепскія па тых часах заробкі ліцейшчыка, да яшчэ заняткі літаратурай, ды яшчэ модная вопратка, — карацей, дзеўкі млелі і падалі долу. Але вось якраз на шляху любоўных прыгодаў і перамог Вітаўтава сэрца чакала яшчэ адна расколіна. І другім разам сэрца майму герою разбіла жанчына — юная, высокая, прыгожая і бязлітасная. І было ў тым каханні столькі лютасці і болю, што часам мроіцца мне нейкай злою чужою прыдумкаю. І потым, калі мне самому выпадала знаёміцца з якою жанчынаю, то перад вачыма прывідам ці папярэджаннем паўставалі жывыя карціны таго кахання. Але, папраўдзе, гэтыя жахлівыя ўспаміны не здолелі адштурхнуць мяне ад пошуку жаночае прыхільнасці, тым больш, вопыт належаў не мне, а прыдуманаму літаратурнаму персанажу.

А мой лірычны герой тады літаральна сохнуў ад свайго кахання, ён счарнеў тварам, у валасах пабольшала сівізны і толькі вочы блішчэлі сінім полымем, якое знутры выпальвала душу. Ён гаварыў толькі пра яе і пра сваё каханне, гаварыў і на сустрэчах, і па тэлефоне, адбіраючы без дазволу мой час. А я быў змушаны трываць, даваць парады, выслухваць споведзі і прамовы. Я нават абмяркоўваў нейкія грандыёзныя планы па акупацыі жаночага сэрца. А часам я спрабаваў заклікаць Вітаўта да разважлівасці і самадысцыпліны, каб хоць неяк аберагчы яго ад учынкаў, што маглі стацца непапраўна-згубнымі. Але якое абачлівасці можна было чакаць ад вар'ята? А менавіта вар'ятам бачыць закаханага ўсходняя традыцыя, што нават і патрабуе ад закаханага ірацыянальных паводзінаў. А мой герой як бы і стараўся адпавядаць падобным запатрабаванням. Ён паўсюдна ішоў за ёй, ён гадзінамі чакаў яе, ён адганяў ад яе ейнага кавалера, а пра кветкі і падарункі я ўжо і не кажу. Былі таксама тэлефонныя размовы, дзе праклёны ўраўнаважваліся замовамі. Дайшло нават да рэзання венаў. І гэта ўсё былі ўчынкі мужчыны, а не хлопчыка, Мужчыны, які меў за трыццаць год і які сам займаўся даследаваннем стракатых лёсаў рэальных і прыдуманых з рэальнасці людзей.

Усе гэтыя ўчынкі сведчылі пра моцнае і глыбокае пачуццё і маглі павярнуць да яго сэрца шмат якіх жанчын, але майму герою патрэбна была не якая іншая, а менавіта тая; яна спачатку аддала яму сваё каханне, а потым бязлітасна і беспаваротна забрала. Але, на жаль, межы, якія я сам сабе азначыў, не дазваляюць прывесці падрабязны разбор усіх акалічнасцяў працэсу, і ўсё ж дазволю сабе паказаць на некалькі версіяў: 1) каханне ёсць настолькі тонкаю рэччу, што вымагае беражлівага і надзвычай асцярожнага стаўлення; 2) жанчына разумела, што, у першую чаргу, мой лірычны герой — ваяр, які ваюе за ідэю, што на аглядную будучыню калі і дасць на хлеб, то масла, пэўна, да гэтага хлеба не будзе. Вось, хацеў сказаць нешта глыбокае і трапнае, а выдаў дзве расхожыя банальныя рэчы, якія да таго ж цалкам спрэчныя.

Мне могуць сказаць, што каханая была не вартая майго героя, як Марыля Верашчак была не вартаю Адама Міцкевіча. Сказаць могуць, я нікога не магу пазбавіць такога права. Але і я магу сказаць, што сэрца ёсць сляпым органам, яно жыве паводле сваіх сляпых законаў. Яму, як вядома, не загадаеш, яно само кіруе, яно само выбірае, і ягоны выбар можа быць спрэчным толькі з пункту гледжання розуму, а таму яно нічым не застрахавана ад чарговае расколіны, як, між іншым, розум — ад вар'яцтва. І магу сцвердзіць, што любы, каго кахаюць, варты гэтага кахання, бо здолеў выклікаць яго да сябе.

РАСКОЛІНА ТРЭЦЯЯ

А трэці раз сэрца майму лірычнаму герою разбіла... Радзіма. Мне было даволі нескаладана падаць першых дзвюх жанчын, што разбілі сэрца майму лірычнаму герою: некалькі штрыхоў і плямак фарбы зараз лічыцца дастатковым, каб намаляваць партрэт. Усё астатняе даваршае чытацкая фантазія. З трэцяю жанчынаю, інакш кажучы з Радзімаю, я напаткаў праблему, бо колькі тых, хто мае справу з напісаным словам, а сярод іх былі і найсапраўднейшыя майстры, прыдумвалі ёй азначэнні, параўнанні. Зразумела, паўтарыць іх усе не выпадае, як не выпадае выбраць нешта, каб не пакрыўдзіць астатніх. Вось узяць да прыкладу хаця б кветкі. Якою кветкаю будзе Беларусь: шыпшынаю, лілеяю, валошкаю... Іх жа ў нас паўтары тысячы!І гэта толькі ў дзікае прыродзе. Амаль тое самае — з дрэвамі. А таму я вырашыў абмежавацца толькі ўказаннем на

(Заканчэнне на стар. 12)

ЧАСАПІС

Павел Саковіч — аўтар гімна

У адным з сакавіцкіх нумароў "ЛіМа" прачытала, што сёлета Літаратурная прэмія К. Крапівы прысуджана Паўлу Саковічу, і шчыра парадавалася за нашага земляка. Міжволі ўспомнілася сустрэча з ім у бібліятэцы імя А. С. Пушкіна. Усіх прысутных Павел Паўлавіч уразіў сціпласцю, інтэлігентнасцю, вернасцю роднай Оршы. Многія з удзельнікаў вечарыны ўпершыню пазнаёміліся з яго разнастайнай і цікавай творчасцю.

Зусім нядаўна, у чэрвені, П. Саковіч зноў наведаў наш горад разам з вядомым кампазітарам, народным артыстам Рэспублікі Беларусь Эдуардам Зарыцкім. Яны — аўтары першага гімна г. Орша, якая святкуе сваё 935-годдзе. Кампазітар і паэт правялі заняткі з хорам, які ўпершыню выканае гімн на ўрачыстым гарадскім вечары, прысвечаным юбілею.

У чытальнай зале бібліятэкі імя Пушкіна адбылася імправізаваная сустрэча аўтараў гімна з чытачамі, бібліятэкарамі, работнікамі гараддзела культуры, школы мастацтваў.

Упэўнена — новы гімн спадабаецца аршанцам!

Зоя МАКАРЭВІЧ, выкладчыца беларускай мовы і літаратуры Аршанскага чыгуначнага тэхнікума

"Табакерка" без Табакова, але ...

21 чэрвеня ў мінскім Тэатры юнага гледача адбыўся грамадскі прагляд новага спектакля тэатра пад назвай "Сярэбраная табакерка". Пісьменнік Змітрок Бядуля напісаў казку, драматург Мікола Матукоўскі з казкі зрабіў п`есу, а рэжысёр Юрый Вута паставіў яе ў ТЮГу.

Адвечная мара чалавецтва — перамагчы смерць. Героям навага ТЮГаўскага спектакля гэта ўдаецца. Завабіць Смерць, дачку першабалотнага цара Дрыгвана, у сярэбраную табакерку і зачыніць яе там аказаліся проста. А вось што рабіць з ёй далей? Можна спакусіцца на яе абяцанкі багацця і даўгалецця, можна пашкадаваць няшчасных царскіх сынкоў, якія са знікненнем смерці так і не дачакаюцца сваёй чаргі "пакіраваць"... А можна і трэба падумаць не толькі пра сябе, але паклапаціцца пра шчасце ўсіх жывых істот: і людзей, і лясных жыхароў. Жыццё — найвялікшая каштоўнасць. Менавіта гэтаму ў вясёлай і музычнай казцы вучаць зайцы Дзіда-Дзед з пляменнікамі Чэсікам і Жэўжыкам, Доктар, Міхась Таптыгін, закаханыя адзін у аднаго Воўк з Авечкай і Ліса з Пеўнем.

Некаторую дыдактычнасць п'есы рэжысёр-пастаноўшчык Юрый Вута вырашыў кампенсаваць яркай сцэнаграфіяй, хуткім танцавальным тэмпам і завароднымі спевамі, музыку да каторых напісаў вядомы кампазітар Уладзімір Кур'ян. Мастаку-пастаноўшчыку Сяргею Антонаву ўдалося перадаць сродкамі сцэнаграфіі казачную, напоеную цудамі атмасферу пекла-дрыгвы, дзе жывуць цар Дрыгван, яго дачка, Чорны прынц, шкодная Сарока. Сцэнічныя эфекты, выкарыстаныя ў спектаклі, ствараюць выдатную канкурэнцыю нават лепшым віртуальным гульням, дзе магчымасці мастака-графіка абмежаваныя толькі яго фантазіяй. Тэатр ужо даўно зразумеў — дзяцей вучыць можна толькі ў самай нязмушанай форме.

Юлія ПАЛАЧАНІНА

З пашанай да рэжысёра

8 чэрвеня ў Беларускай дзяржаўнай тэатральнай акадэміі мастацтваў адбылася вечарына, прысвечаная памяці рэжысёра Міхаіла Пташука.

Малая зала БДТАМ была поўная. Прысутнічалі супрацоўнікі акадэміі, студэнцкая моладзь, творчая інтэлігенцыя, акцёры, прыхільнікі творчасці рэжысёра.

Дэкан тэатральнага факультэта БДТАМ Уладзімір Мішчанчук распачаў вечарыну хвілінай маўчання.

Прысутным быў прапанаваны відэафільм "Апошняя місія ў Косаве" зроблены сербскімі сябрамі, які дэманстраваўся ў Разані на кінафестывалі "Залаты Віцязь".

Тут жа на фотавыставе можна было пазнаёміцца з хронікай жыцця і творчасці рэжысёра. Экспазіцыя будзе папаўняцца новымі матэрыяламі.

Арганізавалі і правялі вечарыну прысвечаную светлай памяці Міхаіла Пташука яго вучні, студэнты 3-га курса рэжысуры мастацкага фільма тэатральнага факультэта БДТАМ — Андрэй Голубеў, Люся Дуброўская, Аляксандр Кахановіч, Дзмітрый Лось, Дзяніс Скварцоў, Яўгенія Сяцько, Максім Субоцін.

Ларыса ІЎЛІЕВА

ВЫСТАВЫ

КАРДЭН, ШАГАЛ І БЕЛАРУСКАЕ МАСТАЦТВА

15—21 красавіка ў Парыжы адбыліся дні беларускай культуры, у рамках якіх прайшла выстава сучаснага беларускага мастацтва ў знакамітым цэнтры Кардэна на Елісейскіх палях. Побач з творамі беларускіх мастакоў па ініцыятыве Кардэна былі выстаўлены шэсць жывапісных работ і літаграфій Марка Шагала. Апошні стаў класікам сусветнага і беларускага мастацтва. Кардэн жа — рэвалюцыянер у свеце моды, куцюр'е "Бітлз", стваральнік адзення унісекс, стыль яго распаўсюджваецца на аксесуары, мэблю, мастацтва, апранаў Маю Плісецкую, ствараў касцюмы для стагадовага юбілею МХАТА, паказваў мадэлі на Чырвонай плошчы, у 1991 г. сродкі ад продажу сваёй новай ювілернай калекцыі "Чарнобыль" перавёў на патрэбы ахвяраў трагедыі. Часткай імперыі "Pierre Cardin" з'яўляецца вялікі культурны цэнтр у Парыжы на Елісейскіх палях, дзе заўсёды адкрыты дзверы для маладых творцаў. За апошняе дзесяцігоддзе там адбылося нямала выставаў вядомых мастакоў свету, прайшлі дні культуры Расіі, Украіны, цяпер і Беларусі. У мерапрыемстве прымалі ўдзел салісты Опернага тэатра, ансамбль "Класік-Авангард" і віцебскі тэатр імя Якуба Коласа. Вялікі поспех мела выстава "Сучасныя мастакі Беларусі", сфарміраваная супрацоўнікамі Музея сучаснага мастацтва ў Мінску. Былі прадстаўлены больш за семдзесят твораў жывапісу, графікі і скульптуры апошніх двух дзесяцігоддзяў. Да выставы выдадзены каляровы каталог на дзвюх мовах з уступным словам кандыдата мастацтвазнаўства, прарэктара Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў МІХАЛА БАРАЗНЫ, які быў адным з арганізатараў выставы, суправаджаў яе ў Парыж.

—Цэнтр Кардэна — шматфункцыянальны культурны комплекс з сучасным абсталяваннем для паказу відовішчных дзеянняў і экспанавання унікальных твораў мастацтва, для чаго маюцца адпаведныя ўмовы. Вызначальна, што дні беларускай культуры праходзілі не на перыферыйных пляцоўках горада, а ў самым цэнтры дзелавога і культурнага жыцця Парыжа.

— Беларусь, нават на дзяржаўным узроўні, наўрат ці "пацягнула" адна без дапамогі Кардэна матэрыяльны бок такога мерапрыемства...

— Для мастакоў (і не толькі беларускіх) кошт арэнды памяшканняў у цэнтры Парыжа нерэальны. Але мяне больш цікавіла не бухгалтэрыя. Мы везлі выставу, потым яе разгарнулі, давалі тлумачэнні гледачам, прадстаўнікам прэсы, якіх было нямала. Залу мы ведалі загадзя, мелі ўсе планы памяшканняў, фарміравалі экспазіцыю пад канкрэтныя ўмовы. Арганізатарам раней былі накіраваны здымкі плануемых твораў. Пярэчанняў да нашагу выбару яны не выказалі. Не было рэкламацый і падчас правядзення выставы.

— Не думаю, што было так проста сфарміраваць выставу сучаснага беларускага мастацтва, тым больш пры абмежаваным у некалькі месяцаў тэрміне і невялікіх сродках, выдаткаваных Міністэрствам культуры на падрыхтоўку.

— Гэта складанейшая задача вырашалася калегіяльна. Я займаўся гэтай справай як член савета Музея сучаснага мастацтва, што меў даручэнне ад Міністэрства культуры сфарміраваць адметную калекцыю, якую можна было б паказваць і на Беларусі і за яе межамі. Вырашыць такую задачу не можа вольны ці прыватны куратар, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый. У Музеі сучаснага мастацтва існуе адпаведны фонд, з якога пераважна і была складзена выстава. Шкада, добрых мастакоў на Беларусі значна больш, чым магчымасцяў паказаць іх у вядомых выставачных залах свету. Жарты жартамі, але сапраўды беларускае мастацтва сёння знаходзіцца на ўздыме, і ёсць вельмі многа мастакоў, якіх варта было б прадстаўляць не на калядным еўрапейскім базары, а на такіх вось дзяржаўных мерапрыемствах. І калі твор кагось з мастакоў не быў прыняты на выставу, гэта не азначае, што яму была дадзена адмоўная ацэнка...

— У каталозе падкрэслена, што адной з галоўных задач выставы ў Парыжы было паказаць пэўны зрэз беларускага мастацтва апошніх дзесяцігоддзяў. Якія крытэрыі адбору былі асноўнымі?

— Выстава не была тэматычная, на яе падрыхтоўку арганізатары мелі паўтары месяцы, а не паўтары гады. Але пры гэтым мы адразу распрацавалі пэўны фармат будучай экспазіцыі. Найперш — яе мастацкая вартасць. Гэта не павінна быць мастацтва непрафесійнае, няякаснае. Фарміравалася выстава на аснове калекцыі Музея сучаснага мастацтва, некаторыя творы дадаваліся "з майстэрняў". На выставе былі прадстаўлены старэйшыя мастакі Г.Вашчанка, Л.Шчамялёў, А.Бараноўскі, таксама моладзь — напрыклад, выпускнік Акадэміі мастацтваў 2001 года Раман Сустаў; сярэдняе пакаленне — В.Славук, Ф.Янушкевіч, В.Альшеўскі, М.Кірэеў, У.Кожух, іншыя. Не абмінулі мы і мастачак: З.Літвінаву, творы якой рэпрадуцыраваны на вокладцы каталога,

ПРЭМ'ЕРЫ

НЕВЫНОСНЫ СВЕТ КАЛІГУЛЫ

"Не, Калігула не памёр. Ён тут і там. Ён у кожным з вас. Калі б у вас была ўлада, калі б вы любілі жыццё, вы ўбачылі б, як лютуе гэта пачвара альбо анёл, якога вы носіце ў сабе", — адзначаў некалі мэтр экзістэнцыялізму А. Камю. У прэм'ерным спектаклі "Калігула", што ідзе цяпер у Рускім тэатры, рэжысёр Вітаутас Грыгалюнас спрабуе абудзіць вядомага бунтара ў кожным гледачы...

В. Грыгалюнас прыкметна папрацаваў з драматургічным тэкстам. У спектаклі з п'есы А. Камю зніклі не толькі дробныя персанажы (яны ўвайшлі ў зборны вобраз Муцыя), сцэны, змяніўся і сам фінал драмы, які перайначыў у нейкай ступені задуму драматурга. Тэкст, што гучыць з вуснаў акцёраў, здаецца больш жорсткім, дынамічным, сціслым, увогуле, прыдатным да незвычайнай сцэнічнай "абалонкі". Бо ў спектаклі, зробленым у стылі "HARD" (у перакладзе з англійскага — "цяжкі") дзеянне адбываецца ў гуртку сучасных байкераў. Рымскія патрыцыі з'яўляюцца на сцэне на матацыклах, апранутыя ў чорнае скураное адзенне. Яны п'юць піва, хрумкаюць чыпсамі, вырашаючы праблемы казны і ўлады. Вялікія жалезныя ланцугі на авансцэне, раскінутыя па сцэне гумовыя колы (мастак У. Чарнышоў) ствараюць змрочную, сапраўды цяжкую атмасферу. Атмасферу, народжаную душэўным неспакоем, тугой, роспаччу самотнага чалавека.

Ад зменendaga фіналу п'есы ўзнікае іншая трактоўка вобраза Калігулы. Калі ў п'есе перад уласным забойствам цэзар крычыць "Калігула! У гісторыю!", то ў спектаклі ён высакародна канчае жыццё самагубствам (Калігула ускрывае сабе вены), прызнаючы сваю віну. Пастаноўшчык спектакля бачыць у цэзары не столькі тырана, сексуальнага маньяка, садыста, вар'ята (у адрозненне, напрыклад, ад кінарэжысёра Т. Браса), колькі няшчаснага чалавека, у якога жыццё "зруйнавалася ў адну секунду".

Што самае невыноснае для чалавека ў дваццаць з гакам гадоў (а менавіта столькі Калігулу напачатку п'есы)? Тое, што многае ў гэтым свеце нельга змяніць, што трэба прыстасоўвацца. "Свет, такі, які ён ёсць, невыносны. І вось я хачу месяц, альбо шчасця, альбо бяссмерця, альбо яшчэ чаго-небудзь ілюзорнага, але не ад гэтага свету", — кажа малады цэзар. Калігула ўпэўнены, што людзі плачуць таму, што гэты свет не такі, якім павінен быць. Людзі няшчасныя, таму што смертныя. Адчуваючы боль ад страты любай Друзілы, цэзар шукае вытлумачэння адбыўшамуся. Толькі ці ёсць гэтаму свету справа да адчаю, тугі максімаліста?! Няма.

Звяртанне ў тэатры да вобраза тырана Калігулы можа падацца сёння рызыкоўным. Але ў сваім спектаклі В. Грыгалюнас не праводзіць ніякіх аналогій. Хаця, вылучыўшы ў п'есе Камю ў першую чаргу канфлікт пакаленняў, рэжысёр, на мой погляд, вызначае адну з самых галоўных праблем нашага цяперашняга жыцця. Супрацьстаянне маладога Калігулы (А. Ждановіч) і сталага Херэі (А. Корчыкаў) — гэта супрацьстаянне узвышанай мары ідэаліста і здаровага сэнсу абывацеля. Мудры, разважлівы Херэя мусіць забіць цэзара толькі таму, што той адабраў у людзей магчымасць спакойна жыць і быць шчаслівымі. Калігула ж не разумее, як можна сапраўды жыць, не прагнучы чагосьці недасягальнага. "Як і ўсе, хто не мае душы, вы не пераносіце тых, у каго яе занадта многа. Вы чуеце, занадта многа! Вось што не дае вам спакою,.." — абараняе Калігулу перад Херэяй яго палюбоўніца Цэзонія (Г. Маланкіна). Рускі тэатр працягвае гаворыць са сцэны пра галоўнае, тут не ўзнікае пытання, навошта пастаўлена цяпер п'еса А. Камю. Сёння якраз многія з нас хочуць стабільнага жыцця і таму прымаюць любыя правілы гульні. Бунт, апазіцыйнае мысленне ў сённяшніх умовах здаюцца абсурднымі. Вось чаму стваральнікі спектакля сімпатызуюць апантанаму Калігуле.

В. Грыгалюнас прапаноўвае гледачу зразумець прычыну жудаснага бунта цэзара. Бунта супраць абывацельскага свету, у якім пытанні фінансаў ці дабрабыту могуць значыць больш, чым жыццё чалавека. Як Гамлет (а рэжысёр лічыць Калігулу Гамлетам XXI стагоддзя), ён помсціць канфармістам, ствараючы для іх невыносныя ўмовы жыцця, поўныя болю, адчаю, якія адчувае сам цэзар. Канешне, Калігула агідны, брыдкі, невыносны, калі гвалціць на вачах у Муцыя (Э. Гарачы) ягоную жонку (Н. Чамадурава), калі бязлітасна забівае сваіх падначаленых ці вымушае іх пакорліва пакланяцца сабе як багіні Венеры, упіваючыся пры гэтым страхам, самым вялікім з пачуццяў. Але цэзар здаецца такім безабаронным, няшчасным у сваіх намаганнях змяніць немагчымае, зразумець незразумелае, увогуле, перарабіць свет. В. Грыгалюнас шукае крупінкі добрага ў чалавеку-пачвары. І за гэтай рэжысёрскай задумай старанна ідзе акцёр А. Ждановіч. Праз тонкія рэфлексіі, бясконцую і няўлоўную змену настрою свайго персанажа ён вымушае гледача спачуваць Калігулу. А. Ждановіч робіць вобраз тырана прыцягальным.

Увогуле, на паступовым раскрыцці вобраза цэзара трымаецца ўвесь спектакль, які доўжыцца больш за дзве гадзіны. На жаль, астатнія персанажы (прынамсі, Гелікон А. Суцкавера, Сцыпіён А. Душачкіна, Сенект І. Мацкевіча, Мерэйя В. Быкава) не такія запамінальныя ў "Калігуле". Хаця відавочна, што кожны акцёр вядзе сваю ролю старанна, натхнёна.

Не зусім зразумела, навошта В. Грыгалюнас перанёс дзеянне п'есы ў наш час (няўжо даніна модзе, бо зараз многія любяць пераносіць гістарычныя п'есы, напрыклад, Шэкспіра, у XX ці XXI стагоддзі?!). Мне падалося, што атрыбуты субкультуры байкераў ніяк не абыгрываюцца на сцэне, з'яўляючыся, так бы мовіць, "мёртвым" рэквізітам. Іграючы "Калігулу", акцёры адчуваюць сябе ніякавата ў чорным скураным адзенні. З майго гледзішча, калі б п'еса А. Камю ставілася ў класічных

А.Малышаву, Г.Гаравую, Л.Макатун. Імкнуліся прадставіць мастакоў фігуратыўнага метаду — Г.Вашчанку, Л.Шчамялёва, У.Тоўсціка, Р.Сітніцу, і мастакоў нефігуратыўнай манеры — М.Бушчыка, В.Герасімава, А.Кузняцова. Важна было замежнаму гледачу паказаць і каларыстыку беларускага мастацтва. Прадстаўлены быў на выставе беларускі краявід (творы А.Бараноўскага і В.Шкарубы), тэма Чарнобыля (Г.Вашчанка). Мы імкнуліся адлюстраваць панараму нашага мастацтва — тэматычную, узроставую, творчых метадаў, падыходаў; паказаць, што наша мастацтва не замкнута ў межах толькі Мінска ці толькі аднаго грамадскага аб'яднання. У экспазіцыі ёсць прадстаўнікі Оршы (Б.Іваноў), Гродна (У.Грыневіч, У.Панцялееў, Ю.Якавенка), маладыя графікі, якія цяпер выстаўляюцца на Захадзе (А.Малышава, Э.Пешкаў). Усё гэта сцвярджала, што беларускае мастацтва дынамічнае, жывое, з шырокай геаграфіяй, еўрапейскае.

Цікавы факт, у адной зале дэманстраваліся беларускі сучасны жывапіс і творы Марка Шагала. Калі рыхтавалася выстава, мы пра гэта не ведалі. Толькі падчас развешвання работ эксперты прынеслі шесць твораў Шагала — жывапіс і літаграфіі з акварэльным запісам, зробленыя мастаком не для продажу, а толькі для выставак. Можна расцэньваць гэта па-рознаму, але эксперты і сам Кардэн дапусцілі магчымасць і сам факт такой сумеснай дэманстрацыі.

— Ці адчуваліся падчас правядзення выставы зацікаўленыя адносіны наведвальнікаў і прэсы?

— Мы і чакалі, што прэса будзе цікавіцца не толькі глыбінёй вобразаў, а агульнымі падыходамі да фарміравання выставы. І былі да такога інтарэсу падрыхтаваныя. Французскія крытыкі і мастакі падкрэслівалі відовішчнасць нашага маствацтва, мастацкую своеасаблівасць школы і агульных творчых падыходаў. Было ацэнена, што нашаму мастацтву не ўласціва агрэсіўнасць, адчуваецца высокая каларыстычная культура, увогуле майстэрства. Вельмі цёпла гаварылі пра графіку, адзначалі работы В.Славука, П.Татарнікава, А.Шалімы, Р.Сустава, Ю.Алісевіча. Спадабаўся і жывапіс. Былі і наіўныя пытанні, адчувалася, што інфармацыя пра мастацтва Беларусі не вельмі шырокая. Напрыклад, адна рускамоўная француженка запыталася, чаму не выстаўлены Ісачоў... Такіх штампаў пра наша андэграўнднае жыццё на Захадзе існуе багата.

На выставе акрамя французаў было шмат рускамоўных гледачоў, часта наведвалася і беларуская эміграцыя, напрыклад, Барыс Забораў. Нам актыўна дапамагала беларускае пасольства, выдатныя ўмовы прапанаваў нам і сам Кардэн.

— Навуковыя вывады і параўнанні дзвюх культур за такі кароткі тэрмін зрабіць цяжка. Але эмацыянальныя ўражанні, думаецца, засталіся...

— Што бы мы ні казалі пра агульнаеўрапейскую прастору, мастацкія падыходы ў краінах Еўропы розныя. Траплялася ў Парыжы на вочы вялікая колькасць галерэй, дзе прадаецца класіка — напрыклад, Дэга, Утрыла. Такі рынак не можа не ўздзейнічаць на псіхалогію сучаснага французскага мастака, а мастацтва мінулых стагоддзяў становіцца актыўным фактарам сённяшняга дня. Светлыя фарбы, ясныя вобразы, адсутнасць складаных метафар, нязмрочная каларыстычная гама, пэўная карнавальнасць, нават залішняя відовішчнасць мастацтва французскай сталіцы. Нельга сказаць, што сучаснае французскае мастацтва не ўздымае надзённых праблем, напрыклад, я з задавальненнем у майстэрні Богдана Канопкі на Манпарнасе глядзеў яго фотаальбом "Парыж у шэрым". Гэта фотаздымкі знікаючага Парыжа, настальгічныя перажыванні старых французаў, калі урбанізацыя знішчае знаёмыя асяродкі. Але Парыж — гэта не толькі французскае мастацтва, гэта агульнаеўрапейскае шоу. Для французскіх мастакоў вялікую ролю адыгрывае перыферыя. Гэта вельмі сур'ёзнае непадабенства Парыжа і Мінска, бо ў нашай сталіцы можна, дзень пагайсаўшы па праспекце, амаль усё даведацца пра стан і сучасныя тэндэнцыі беларускай графікі і жывапісу.

Беларуская "каманда" працавала вельмі зладжана, выстава была добра падрыхтавана яшчэ ў Мінску. Спадабаўся французам і каталог, які вольна распаўсюджваўся сярод наведвальнікаў. Усе работы адразу пасля закрыцця Дзён беларускай культуры вярнуліся ў Мінск і хуткім часе "парыжская" выстава будзе паказана ў Гомелі. Хацелася б, каб такімі намаганнямі складзеная калекцыя засталася нерасфарміраванай. Пажадана, каб яна была паказана і ў Мінску, бо ў сталіцыя была разгорнута толькі на адзін дзень перад адпраўкай у Парыж. Выстава ў цэнтры Кардэна стала вялікім поспехам беларускага мастацтва, і яго хаваць няма сэнсу.

Падрыхтавала
Наталля ШАРАНГОВІЧ

касцюмах старадаўняга Рыма, дзеянне на сцэне ўзрушала б значна больш. Але рэжысёр звярнуў увагу на тое, што ў п'есе "Калігула" шмат гістарычных недакладнасцяў, акрамя гэтага А. Камю загінуў на матацыкле — усё гэта падштурхнула В. Грыгалюнаса да своеасаблівага тэатральнага эксперымента. Першая (і доўгачаканая) прэм'ера сезона ў Рускім тэатры мо невыпадкова прэтэндавала стацца сенсацыйнай...

В. Барабаншчыкава

На здымках: сцэны са спектакля

Фота А. Дзмітрыева

Тэатральны салон

У тэатральным салоне клуба аматараў тэатра "Таленты і прыхільнікі" адбылася незвычайная сустрэча прафесійных акцёраў Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача і артыстаў народнага тэатра "Жывая планета". Галоўны рэжысёр ТЮГа А. Андросік расказаў аб рабоце тэатра над новым рэпертуарам для дзяцей, падлеткаў і дарослага гледача. Гэта "Рыцар сонца", "Антыгона", "Сярэбраная табакерка"; паскардзіўся на фінансавыя цяжкасці, якія ствараюць дадатковыя складанасці, і прадставіў цудоўную актрысу Таццяну Жданаву. "Я вінаваты, што не змог цалкам скарыстаць творчы патэнцыял гэтай дзівоснай актрысы з яе багатымі ўнутранымі і знешнімі дадзенымі. І калі яна на сцэне, то дыялог паміж ёю і гледачом узнікае імгненна".

Вядома, мы павінны ўлічваць спецыфіку дзіцячага тэатра, дзе ў вобразе котачкі, сабачкі, рамонка або птушачкі немагчыма раскрыць усё багаце псіхалагічнай прыроды акцёра, таму і патрэбны дарослы рэпертуар. І тэатр ідзе на тое, каб ставіць вячэрнія спектаклі для больш дарослага гледача, хоць аснова рэпертуару — дзіцячыя спектаклі.

Таццяна Жданава, якую мы запомнілі па ролі Місіс Эрол у спектаклі "Маленькі лорд Фаунтлерой", тэмпераментна расказала пра сваё жыццё і тэатральны лёс. Знешне яна падобна на тыповую іспанку -—Кармэн. І ўдзельнікі салона засыпалі яе пытанні аб яе паходжанні. Выявілася — Таццяна, у дзявоцтве Глінская, вядзе свой радавод ад найстаражытных князёў Глінскіх. Актрыса была прыемна здзіўлена, што наш клуб запрасіў яе на салон, дзе ў даверальнай абстаноўцы яна падзялілася самым патаемным. "Гэта цудоўна, што ёсць такі клуб, у якім да асобы акцёра падыходзяць не фармальна, а па-чалавечы цёпла і душэўна".

Гаворку пра роль тэатра ў лёсе чалавека, калі ён імкнецца быць акцёрам, прадоўжыў артыст народнага тэатра "Жывая планета" А. Тлусты, а рэжысёр гэтага тэатра А. Забалотнікаў расказаў пра п'есу В. Розава "У пошуках радасці", што ідзе ў тэатры, якая ў цяперашні час аказалася вельмі патрэбнай гледачу.

Сваё слова сказалі і студэнты філфака БДУ (удзельнікі 2-й тэатральнай студыі БДУ), якім спадабаўся наш салон і якія запрасілі нас на прэм'еру "Бенефіс 5 курса".

На заключэнне маладая паэтэса Таццяна Сямірская, якая вучыцца ў магістратуры філфака БДУ і піша вершы з 17 гадоў, прачытала свае лірычныя вершы на беларускай мове.

Наступныя сустрэчы ў салоне адбудуцца ўжо ў верасні. А хто пажадае прыйсці ў клуб, тэлефануйце: 228-10-39 і 262-49-85. Палац "Юнацтва" — вул. Фабрыцыуса, 5, пакой 201 — па панядзелках з 17 да 18.30 гадзін.

Г. МАХАЕВА,
прэзідэнт клуба "Таленты і прыхільнікі"

Таццяна ЖДАНАВА:

Любы акцёрскі лёс мог бы стаць нагодай для напісання рамана, а лёс актрысы — тым больш.

Мой бацька быў акцёрам ад прыроды. Вялікае дзіця з дзівоснай непасрэднасцю. Калі і ёсць ува мне што-небудзь цікавае — гэта ад яго.

Нарадзілася і вырасла ў Маладзечне. Думаю, мне вельмі пашанцавала. Паступіла без усялякіх намаганняў у Тэатральна-мастацкі інстытут. Цудоўныя педагогі, цудоўныя аднакурснікі. Юнацтва засталося ў памяці захапляльным, рознакаляровым святам. Мне вельмі шанцавала на людзей. ТЮГ — і гэта таксама лёс. Не бяруся меркаваць, які. Сёння ўспамінаецца толькі добрае. Прынцэсы, царэўны, камсамолкі, малпа, конік, сарока. Увогуле, звычайныя тюгаўскія ролі. Але колькі цікавых партнёраў, колькі таленавітых рэжысёраў, колькі гастроляў, фестываляў!

Са сваім тэатрам я крыху папрацавала ў Германіі разам з нямецкімі акцёрамі. Потым В. Анісенка прапанаваў сыграць каралеву Маргарыту ў "Рычардзе" на "Вольнай сцэне". Для мяне гэтае запрашэнне было не толькі цікавай работай, але і выратаваннем ад вялікага гора. З гэтым спектаклем я трапіла ў Эдынбург. А праз год Анісенка паставіў "Макбета", дзе мне зноў жа пашанцавала сыграць Ледзі Макбет. Можна спрачацца пра тое, наколькі гэты спектакль быў таленавіты, але для мяне гэта было ва ўсіх сэнсах вяршыняй. Мы ігралі гэты спектакль у замку шатландскіх каралёў. М. Пташук зняў фільм паводле гэтага спектакля. На першым Міжнародным фестывалі ў Брэсце я, на сваё здзіўленне, атрымала Гран-пры за лепшую жаночую ролю. Я не выхваляюся, проста шчыра лічу ўвесь гэты ланцуг падзей шчаслівым шанцаваннем.

З вялікай удзячнасцю ўспамінаю акцёраў "Вольнай сцэны" — дзівосныя, таленавітыя людзі.

Ну, і як звычайна ў добрых п'есах, пасля бурных поспехаў настаў час забыцця. І яшчэ раз пашанцавала — з'явілася работа ў сваім родным ТЮГу. А. Андросік заняў мяне ў "Маленькім лордзе", "Палачанцы". А работа з В. Салюком і Н. Шыйкам! Мае ролі ў іх спектаклях зусім не галоўныя, але для мяне яны вельмі дарагія.

Сёння настаў зноў-такі складаны момант у маім творчым жыцці, але я веру ў свой лёс. І чакаю, чакаю, чакаю!

Будзе музычны маладзёвы!

Першае выкананне невялікай камічнай оперы Моцарта "Дырэктар тэатра" адбылося больш чым 300 гадоў таму ў аўстрыйскім імператарскім палацы Шонбрун. А зусім нядаўна з ёю пазнаёміліся мінчане — упершыню ў нашай сталіцы гэта опера была выканана на сцэне Беларускай акадэміі музыкі.

Удзельнічалі тры студэнты-вакалісты, прычым для пяцікурсніцы І. Цімчанкі (клас Т. Ніжнікавай), якая выконвала ролю мадам Герц, гэтае выступленне сталася выдатнай здачай дзяржэкзамена. Ролю дырэктара тэатра Франка выканаў выкладчык кафедры опернай падрыхтоўкі БАМ А. Грабёнкін. У спектаклі таксама ўдзельнічалі выкладчык Акадэміі мастацтваў Г. Фамін (акцёр Буф), артыст Рускага тэатра імя М. Горкага У. Сцяпура (банкір Эйлер), артысты Дзяржаўнага музычнага тэатра.

Шкада, што аркестр не заўсёды гучаў па-моцартаўску мякка. Дырыжору В. Мнацаканаву даводзілася не толькі стаяць за пультам, але і прамаўляць маналогі. Наогул, размоўных мясцін у оперы шмат. Змест яе просты: дырэктар тэатра набірае трупу, і сярод артыстаў усчынаецца гаворка, у якой выяўляюцца іх амбіцыі, акцёрская рэўнасць, не заўсёды дарэчны гонар. Рэжысёр-пастаноўшчык оперы Б. Утораў зрабіў больш сучасную сцэнічную версію твора, каб спектакль зацікавіў сённяшнюю публіку.

Поспех не прымусіў сябе чакаць. Можна з упэўненасцю сказаць, што калі б у тэатра Акадэміі музыкі было памяшканне для рэгулярнага паказу сваіх работ, дык гэты спектакль карыстаўся б вялікай папулярнасцю ў гледачоў. Таму вельмі радуе паведамленне загадчыка кафедры опернай падрыхтоўкі БАМ М. Зданевіча:

— Нядаўна ў нас пабываў у гасцях Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, які пасля сустрэчы вырашыў адкрыць у 2008 годзе мінскі маладзёжны музычны тэатр акадэміі, нават у Міністэрстве культуры ўжо ёсць штатны расклад. І зараз усім нам, і ў першую чаргу цудоўнаму арганізатару, энергічнаму чалавеку, рэктару БАМ Міхаілу Казінцу трэба зрабіць усё, каб гэтае рашэнне ажыццявілася як мага хутчэй, можа, нават з апярэджваннем названага тэрміну адкрыцця тэатра.

Вера КРОЗ

Дыпламаты — песняру

Вершы Купалы,які, як слушна заўважыў паэт Леанід Дранько-Майсюк, падараваў беларусам пашпарт вечнасці, прагучалі ў Доме дружбы на кітайскай, французскай, польскай, чэшскай, рускай, украінскай мовах. Прадстаўнікі дыпламатычнага корпусу, што сабраліся, каб ушанаваць памяць паэта, падкрэслілі таксама сусветнае значэнне Купалы, яго паэтычны ўплыў на іншыя культуры і шчыльныя сувязі з прадстаўнікамі іншых літаратур. Перад прысутнымі выступілі пасол па асобых даручэннях Міністэрства замежных спраў Рэспублік Беларусь Уладзімір Шчасны, які гаварыў пра актыўную работу па прапагандзе творчасці Я. Купалы і Я. Коласа па-за межамі нашай краіны, народны артыст СССР Ігар Лучанок, песня якога "Спадчына" на словы Янкі Купалы прагучала ў выкананні заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Івана Краснадубскага, архітэктар Леанід Левін, намеснік старшыні прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі Ніна Іванова. У вечарыне прымалі ўдзел намеснік міністра культуры Валерый Гедройц, пісьменнікі Вольга Іпатава, Анатоль Вярцінскі, Валерый Стралко, Валянціна Паліканіна, Маргарыта Прохар. "Спеў дуброў" прагучаў у выкананні на цымбалах заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лявончыка, "Шумныя бярозы" выканаў студэнт Беларускай акадэміі музыкі Міхаіл Пузанаў.

М. Р.

Музы ў Доме Коласа

Цэнтр пазашкольнай работы Ленінскага раёна сталіцы "Маяк" цесна супрацоўнічае з Літаратурна-мемарыяльным музеем Якуба Коласа — сумесна праводзяцца дзіцячыя ранішнікі, сустрэчы з літаратарамі. Вясною выхаванцы цэнтра падрыхтавалі вельмі змястоўную і цікавую канцэртную праграму, падчас якой гучалі песні, вершы, драматычныя мініяцюры, прысвечаныя творчасці Песняра. Асабліва шчыравалі хлопцы і дзяўчаты з фальклорнага гуртка "Ранічка", якім кіруе апантаны чалавек і педагог Людміла Гоман.

Да 1 чэрвеня — Сусветнага дня абароны дзяцей — у музеі Коласа была наладжана выстаўка дзіцячых малюнкаў, зробленых паводле твораў класіка.

Дарэчы, у ёй прымалі ўдзел не толькі дзеці з ЦВР "Маяк", але і іх калегі з цэнтра эстэтычнага выхавання Заводскага раёна Мінска, а таксама дзеці з дзіцячага сада № 490 Кастрычніцкага раёна горада.

На суд гледачоў былі прадстаўлены не толькі малюнкі, а і творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — вырабы з лёну, саломкі, лазы, дрэва.

Вучні сярэдніх школ № 2, 59, 102, 134, 153, 222, 200 — удзельнікі конкурсу — не пакінулі раўнадушнымі членаў журы, якое ўзначальвала знакамітая мастачка, ілюстратар шматлікіх дзіцячых кніг Алена Лось.

Госці імпрэзы, а імі былі ў той дзень сын і ўнучка Якуба Коласа Міхась і Марыя Міцкевічы, паэт, галоўны рэдактар часопіса "Вожык" Міхась Пазнякоў, годна ацанілі і габелен "Мой родны кут" (дарэчы, гран-пры конкурсу), і серыю пано з саломкі "Ля бярозы", "Сымон-музыка", "Вясна прыйшла", выкананыя вучнямі СШ № 200 Заводскага раёна.

Дыпломы музея атрымалі: вучні 9 класа СШ № 200 (габелен "Мой родны кут"), Казлова Кацярына, СШ № 200 (пано "Сымон-музыка"), Дубадзелава Марына, СШ № 200 (малюнак "Лес"), Снегірова Каця, Сухан Зарына, СШ № 2 (малюнак "Новая зямля"), Капуста Дзяніс, СШ № 153 (малюнак "Сымон-музыка").

Асобнай старонкай конкурсу стала дэманстрацыя малюнкаў-шаржаў выпускніка СШ № 210 Мінска Юрася Раднова. Ён стыпендыят спецыяльнага Прэзідэнцкага фонду па падтрымцы таленавітай моладзі Беларусі, пераможца раённых, гарадскіх і Рэспубліканскіх літаратурных конкурсаў.

Юрась падрыхтаваў ужо некалькі кніжак-размалёвак па сюжэтах казак, апрацаваных Якубам Коласам. А спецыяльна для выстаўкі юны шаржыст намаляваў тры работы паводле казкі "Два маразы", вершаў "Дзед-госць" і "Дзед і зайчык".

Прадаўжаюць паступаць на конкурс (які праводзіцца на працягу ўсяго юбілейнага году) малюнкі і з рэгіёнаў Беларусі.

Г. ЗАЙЦАВА

ВІНШУЕМ!

26 чэрвеня споўнілася 70 гадоў вядомаму пісьменніку Давіду Сімановічу.

Нарадзіўся ён у Нароўлі Гомельскай вобласці, у 1950 г. паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які скончыў у 1955 годзе. Працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры Крынкаўскай сярэдняй школы Лёзненскага раёна, літаратурным супрацоўнікам газеты "Віцебскі рабочы", загадчыкам аддзела на Віцебскім тэлебачанні, старшынёю Віцебскага абласнога літаратурнага аб'яднання.

Д. Сімановіч піша на рускай мове, першы верш надрукаваў у 1948 г. Паэт выдаў кнігі лірыкі "Весенняя сказка", "Июнь-река", "Равноденствие", "Станции тревоги и любви", "Письмо тебе", "Встречные поезда" і інш., кнігу прозы "Подорожная Александра Пушкина". Ён з'яўляецца аўтарам тэлеп'ес, сцэнарыяў для тэлефільмаў, перакладае на рускую мову творы беларускіх паэтаў.

Віншуем Давіда Рыгоравіча з юбілеем і жадаем яму творчага плёну.

Давід СІМАНОВІЧ

•

І Шагал, як біблейскі Адам,
мовіў сумна, з жыццём развітваючыся:
«Засталася душа мая там"...
Зноў зрабіліся вочы блакітнымі.

Можа, яблынь забытых кара
нагадала той дом, што туліцца
да самоты гаспадара
на Вялікай Пакроўскай вуліцы.

Сохнуць на плытах гарлачы,
вокны ў свет — вачыма яўрэйскімі,
асядлалі дах скрыпачы,
козы скачуць рагатымі фрэскамі...

І ступаюць забытыя сны
па зямлі, спавітай дарогамі.
З Бэлай светла лятуць яны
па-над цэрквамі, сінагогамі.

Не забыты ўсміхаецца край
даваеннай Дзвіной незахмаранай.
І крычу я праз пекла, праз рай:
"Дык з вяртаннем Вас, Марк Захаравіч!"

Ёсць мяжа жыцця і пакут,
неўміручасць узнагародаю, —
засталася душа яго тут,
неразгаданая, першародная.

Пераклаў з рускай
Рыгор БАРАДУЛІН

•

У знаным аркестры
са скрыпкай з забытых надзей
застаўся на месцы
гэты апошні яўрэй.

Зала замёрла
перад узлётам смычка.
Цісне за горла
музыкі вечнай тута.

Шмат у аркестры
блізкіх было людзей,
застаўся на месцы
гэты апошні яўрэй.

Нехта ў Ізраіль
З'ехаў, іграе ў кафэ,
кагосьці прагналі
па сумнавядомай графе.

Музыкі крылы.
Зала знямела ў цішы.
Што ты зрабіла,
краіна,
сваёй душы?

Ці ж уваскрэснеш,
лепшых згубіўшы дзяцей?..
У знаным аркестры
застаўся апошні яўрэй.

Пераклаў з рускай
Уладзімір ПАПКОВІЧ

РАЗБІТАЕ СЭРЦА ВІТАЎТА

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 9)

сінія вочы, як на самы распаўсюджаны колер і, бадай, самы рамантычны.

Мой герой быў у яе шчыра і глыбока закаханы, як і ўсе мы. І яна, нашая каханая, сталася дзеля нас тым рамантычным прытулкам, дзе славутае мінулае, часткова рэальнае, часткова прыдуманае, нейкім чынам апраўдвала нашае ўбогае існаванне і давала хай і нетрывалую, але ўсё-ткі нейкую надзею на будучыню. І мы стараліся быць ёй і рыцарамі, і сынамі, і палюбоўнікамі — кожны адпаведна ўласных здольнасцяў.

Як я ўжо казаў, сваё жыццё мой герой ахвяраваў на беларушчыну. Мусіць, гэта не самая прыдатная для апрацоўкі і не самая ўдзячная ў сэнсе плёну глеба. І я ведаю нямала сярод маіх сяброў тых, хто жыве бясконцымі перабіваннямі з хлеба на ваду і з вады на хлеб. Сярод іх ёсць і добраахвотнікі, і тыя, хто плыняю рэчаў ці збегам абставінаў выракліся на стан блізкі да аскезы, але ўсё гэта можна вытрываць, толькі б "жила бы страна родная" (прашу дараваць за нягеглую спробу жарту). І быў рамантычны перыяд другое палавіны васьмідзесятых, і быў перыяд надзеі ў пачатку дзевяностых, калі падавалася: ну вось яшчэ трошачкі, ну вось яшчэ крыху, і Краіна абудзіцца, уздымецца, пойдзе насустрач годнасці, заможнасці, насустрач сваёй памяці, свайму поклічу, каб заняць годнае месца ў супольнасці цывілізаваных нацыяў — усё гэта, зразумела, паводле нашых уяўленняў. І мой лірычны герой лічыў, што нашая Радзіма заслужыла лепшае долі. І хто з нас мог падумаць, што на тым рэферэндуме нашая Радзіма не схоча бачыць сваім гербам сярэбранага вершніка. Усё гэта абрушыла нашыя надзеі і забіла беднага Андрэя Пяткевіча[3].

І яшчэ шмат мы будзем гаварыць пра той, будзем аналізаваць, спрачацца, плакаць, праклінаць, шукаць вінаватых, задняю датаю выпраўляць памылкі, але ўсе спадзяванкі будуць ужо звязвацца толькі з нейкаю сістэмаю. Я таксама маю некалькі варыянтаў вытлумачэнняў вынікаў таго дня, але цяпер пакіну іх убаку, бо адчуванне паказвае мне на ірацыянальнасць не толькі тых падзеяў, што наўпрост звязаныя з трэцяю расколінай у сэрцы майго героя, а наогул абсалютова ўсялякіх падзей, учынкаў ды і думак, якімі б лагічнымі яны нам ні падаваліся.

А мой герой змог перажыць гэтую здраду, а менавіта так ён трактаваў падзеі таго дня. Не. Ягоныя вочы не згаслі, можа толькі яшчэ цямнейшым стаў ягоны твар, і яшчэ гусцейшаю стала сівізна ў валасах. І можа, часцей ён стаў зазіраць на дно чаркі, каб знайсці выйсце ў іншую рэчаіснасць, далей ад вечных і надзённых праблемаў. Некаторыя могуць сказаць, што дачыненні майго героя з іншымі людзьмі сталі адначасова больш жорсткімі і няпэўнымі (у гэтым ёсць парадокс, але я і не абяцаў, што іх не будзе), а сам ён стаў больш рэзкім і нецярплівым у сваіх выказваннях, а ягоны давер да людзей зменшыўся да катастрафічнасці. Я, зразумела, магу з усім гэтым пагадзіцца, магу, зразумела, запярэчыць. Хаця ў словах маіх суразмоўцаў утрымліваецца каліва ісціны, і нават не каліва, а ўся яна цалкам. Але рэч у тым, што гэтая ісціна — толькі іхняя. Мая ісціна — у канстатацыі факта без аніякае па магчымасці прэтэнзіі на аналіз. А фактам тут ёсць толькі разбітае сэрца і мой лірычны герой, які спрабуе абараніць ягоныя рэшткі. І можа, гэта зусім не віна Вітаўта, што ён мае толькі такі набор, а не іншы, сродкаў для абароны, бо карыстаць іншыя яго не навучылі. Але — стоп! Я змушаны сябе перапыніць, бо калі я гэтага не зраблю, то мне давядзецца вярнуцца да пачатку расповеда аб разбітым сэрцы, а гэта ўжо цалкам заганна і нават смяротнанебяспечна для паэзіі, бо мэтаю, па шчырае праўдзе , з'яўляецца толькі яна сама. Усё астатняе ёсць толькі сродкам.

Але я ведаю, што недзе там, на глыбінях, сярод расколінаў жывуць Вера, Надзея, Любоў, і яны даўно ўжо не вядуць спрэчак аб уласным прыярытэце, а толькі гояць сэрца і рыхтуюць яго для новых выпрабаванняў. І, здаецца, патрэбна ж так мала — усяго што любоў плюс дараванне мінус гонар. Сапраўды, гэта так мала, што амаль немагчыма. Амаль немагчыма.

АПАЛОГІЯ

Сэрца чалавеку разбіваюць не толькі жанчыны і не аабвязкова трыядамі. І не абавязкова ў падобнае паслядоўнасці. І калі б мой лірычны герой быў рэальным жывым чалавекам, сучаснікам, сябрам, паплечнікам, знаёмцам, то мне абавязкова прыйшлося б паказваць на іншыя варункі, што прывялі ягонае сэрца да шматлікіх расколінаў, але тады тэкст сканаў бы, як факт літаратуры, а фантазія пераўтварылася б у хлусню, у самую банальную хлусню, і рэакцыя на яе была б адпаведнаю. А таму я прашу ўсіх, хто будзе чытаць гэты тэкст, паставіцца да яго як мага паблажліва і паспрабаваць зазірнуць у свае ўласныя расколіны. І яшчэ: я знарок не паказаў вам на тое, да чаго прывяло майго лірычнага героя ягонае разбітае сэрца, бо ўсё яшчэ будзе. Усё яшчэ наперадзе, бо ўсё яшчэ не падведзена рыса, а далягляд мае тэндэнцыю аддальвання пры набліжванні.

НЕКАТОРЫЯ НЕАБХОДНЫЯ ТЛУМАЧЭННІ

Ёсць меркаванне, што задачаю літаратуры ёсць хаваць, а не высвятляць; і што паказваючы нешта на святло, адначасова адводзіш у цень тое, што і не прызначалася на чужыя вочы. Але літаратура таксама дае магчымасць выказаць тое, што не прызначалася на чужыя вушы, не кажучы нічога.

Што ж, усё мае два бакі, і самое жыццё дае відавочныя прыклады дыялектыкі. Аўжо-ж! Калі б толькі два! І я, што зразумела, знарок не паказаў на іншыя варункі, што прывялі майго героя да іншых расколінаў, і абмежаваўся гаворкамі толькі пра жанчын. Аматары зацемненых сэнсаў могуць адразу з радасцю (о, як я разумею іхнюю радасць) тыцнуць пальцамі на Фрэйда альбо на Юнга, ці яшчэ магу прапанаваць пагаварыць пра Фурый, Парак, Грацыяў, у рэшце рэшт пра тры першакрыніцы — гэта ўжо ў залежнасці ад адукацыі і прыхільнасцяў, у тым ліку і палітычных.

І я тут сумысла засяроджваюся на жанчынах, бо яны ёсць для мяне ўвасабленне стыхіі ірацыянальнага, і зразумець жанчыну азначае зразумець сусвет, зразумець хаду гісторыі, зразумець мінулае, усвядоміць сённяшняе і зазірнуць у будучыню; зразумець жанчыну азначае зразумець самое жыццё і ў пэўным сэнсе наблізіцца да Стваральніка, бо Ягоныя ўчынкі для нас — незразумелыя, а таму часам непрымальныя да абурэння. І ўсё-ткі мы знаходзім імгненні экстазу перад Ягонымі цудамі, і нашае сэрца раскрываецца на любоў да жанчыны: любоў сынаву, мужаву, бацькаву. І раптам можа стацца так, што нават самае зашмальцаванае слова, самы банальны жэст, самы шэры краявід прымусяць нас да слязы. І ў гэтым таксама будзе віна жанчыны.

РАСШЫФРОЎКА ЛІЧБАЎ

1 — назву мне падказала выслоўе знанага нямецкага паэта Хайнрыха Хайнэ аб тым, што кожная расколіна праходзіць праз паэтава сэрца.

2 — прыношу прабачэнні свайму сябру, беларускаму празаіку і гісторыку Вітаўту Чаропку за выкарыстанне ў тэксце і назве ягонага імя і некаторых фактаў ягонае біяграфіі.

3 — непасрэднае і праўдзівае дачыненне да рэчаіснасці мае толькі беларускі паэт Андрэй Пяткевіч, сэрца якога, паводле сцвярджэнняў ягоных сяброў, не вытрывала вынікаў рэферэндуму.

ЗАМЕСТ АЛЬБО НАКШТАЛТ ПАСЛЯСЛОЎЯ

Некалі, як сцвярджаюць навукоўцы, ландшафты нашае планеты мелі зусім іншы выгляд. Выбухвалі вулканы, пасоўваліся платформы, мянялі абрысы басейны акіянаў, а між імі танулі і ўзнікалі цэлыя кантыненты: Гандвана, Лемурыя, Атлантыда... Ад некаторых не засталося анічога, апрача геалагічнае памяці, ад іншых — ланцужкі выспаў, а там, дзе праляглі расколіны, утварыліся праліўы... І навукоўцы кажуць, што працэс яшчэ далёка не завершаны, што мізэрныя тэктанічныя зрухі рыхтуюць, так бы мовіць, глебу для новых катастрофаў. А значыць, будуць захапляцца іхнімі краявідамі і ўздымаць новыя краіны.

І сэрца змяняе свой ландшафт, у асноўным у выніку катастрофаў. І колькі б яго ні даследавалі, заўсёды застаецца месца для новых адкрыццяў.

ПЕРАКЛАДЫ

ГОРНЫ АРОЛ

НАВЕЛА

Ганад Чарказян

Сівабароды стары сказаў аднадарожку свайму:

—Калі з бацькоўскага гнязда вываліцца арлінае птушанятка, дык сам арол не заплача.

—Тады ў чым мудрасць арлянятковага бацькі? — пацікавіўся ў мудраца суразмоўца.

—Выходзіць, чакаць яму давядзецца яшчэ доўга.

—Вядома, доўга, — адказаў стары, — але ж ён арол, а яны доўга жывуць. На сваім вяку яны ўсяго могуць дачакацца. А наогул, арлы не павінны плакаць. Бо якія ж яны тады арлы? І плачуць толькі таму, што традыцыя маецца — па страце трэба плакаць. І адужваючы гонар свой, плачуць не за сябе, а за суседа свайго. І традыцыі пільнуюцца, й годнасць сваю захоўваюць. Гэта я так думаю. А як думаюць арлы — тое толькі ім ведаць.

Гэтую размову двух аднадарожцаў чуў арол з параненым крылом, што паступова губляў сілу й не мог даць сабе аніякай рады.

І аднадарожцы пайшлі. І арол застаўся. Адзін на вяршыні гары, сам-насам са сваёю бядой.

За свой век ён шмат бачыў. З недасяжнай вольнай вышыні назіраў за ўсім, што дзеялася ў абсягу. Але не мог вырашыць для сябе, ці быў патрэбен камусьці ён — арол са сваімі недасяжнымі вышынямі. Мабыць, і сапраўды горы без яго глядзелі б сіротамі. А мабыць, і не так. Прынамсі, Творца меў на ўвазе, што ў прыродзе ўсё мусіць дапаўняць адно адное. Мусіць жыць і суіснаваць.

Крыло арлу зламаў знянацку каменяпад падчас ліўня, й гаспадар горных вяршыняў здагадаўся, што неба для яго стане ўжо мрояй. Хіба што ў канцы пашэнціць зноў узняцца над вяршынямі, і арліны позірк зноўку згледзіць здабычу на зямлі... І будзе ён зноў дзівіцца з людскіх бязглуздых учынкаў. Гэтакіх недарэчных, што нялоўка й сорамна зробіцца нават міжвольнаму сведку...

Арол паспрабаваў варухнуць крылом. Ад болю пацямнела ўваччу. Болей не спрабаваў. Боль не суціхаў, але арол заставаўся спакойны. І думаў пра людзей ды іхнія недарэчнасці. Параўноўваў арлоў з людзьмі.

Арлы любяць волю і, магчыма, таму жывуць удалечыні ад усяго. Там, дзе ніхто не можа асягнуць іхнюю вышыню. Арол ніколі не разбурыць чужога гнязда. Калі б ён зрабіў такое, дык ужо не быў бы арлом. А чалавек разбурае. Увесь час разбурае.

Арол лічыў сябе драбінкай гэтага дзівоснага свету. Але і драбінка мусіць служыць таму, каб захоўвалася раўнавага дабра й зла на зямлі. Так ён думаў.

Хоць паранены арол і цяміў, што век ягоны падыходзіць да канца, ды спадзяваўся, што яшчэ паспее перадумаць усё пра жыццё.

Думаючы пра людзей, ён паволі заплюшчваў вочы, якія гэтак шмат бачылі.

Гэта людзі, не маючы ў сябе ў хаце простай свечкі, ператвараюць у полымныя вогнішчы чужыя жытлішчы. Як быццам ім не стае зямлі, на якое льга мірна ствараць. Вялізныя жалезныя птахі лятуць са смяротным рыкам, а іх даганяюць вогненныя стрэлы й, сутыкаючыся пад неабсяжным небам, ператвараюцца ў жах апраметны для тых, хто чакае ад неба дажджу ці сонца. Мабыць, людзі хворыя, й хвароба гэтая называецца сквапнасцю. І арлу ўсплыло ўбачанае шмат гадоў таму.

За якуюсьці подласць ці здраду чалавек, як звычай, павінен быў атрымаць узнагароду. Зачастую ж за забойства іншапляменнікаў вывышаюць забойцу робяць з яго куміра. Каб прыклад быў. І вось такі шаленец атрымаў шанц мець гэтулькі зямлі, колькі да заходу сонца ён здолее абабегчы. І ён абабег. Ці многа, ці мала, адзін Бог ведае. Але ў апошняе імгненне, калі яго ўжо пакінулі сілы і ён упаў, выцягнуў рукі наперад і заскроб пальцамі... каб прыхапіць на той свет яшчэ хоць кузлачок зямлі, неўзабаве яго прыкапалі, ахкалі, вохкалі. Непажэры не стала, а зямля засталася. І застанецца назаўсёды — ці будуць жыць на ёй людзі, ці не. Ці палезуць са страху за ўчыненае зло ў глыбіню зямлі, а ці адлятуць на іншыя планеты вычвараць чарговыя вар'яцтвы альбо чарговыя брыдоты...

Арол адчуў, як вільготная аповалач засціла абсяг, у які ён гэтак уважліва ўглядаўся ды вывучаў бачанае доўгія гады. Яму зрабілася журботна, й ён нават крыху спалохаўся, што можа заплакаць. Далібог. Але гэта не са страху. А толькі ад безвыходнасці. Ад таго, што ён, можа, болей не адчуе шчасця ўзняцца на дасягнутыя вышыні ды спахапіць зіркам? Але потым арол уцяміў, што памыліўся. Слёзаў не было. Проста йшоў дождж. Яму зрабілася лягчэй.

І захацелася яму чамусьці, каб тыя двое, чыя размова вырвала яго з забыцця, вярнуліся. Каб пачуць яшчэ раз іх галасы й развагі, бо справядліва й пашанліва казалі пра арлоў. Ды яны ўжо даўно пайшлі, й марна чакаць, што пройдуць назад той жа сцяжынаю.

Потым ён скеміў, што, відаць, здакучыла людзям жыць у далінах і падаліся яны ў горы. Але тым, хто не закаханы ў горы, мейсца там няма. У гарах мейсца тым, хто імкнецца да волі. А воля заўсягды даецца нялёгка. Хто баіцца цяжкасці, ніколі вольным не стане. Горы й неба — гэта апошні прыстанак для вольных і смелых, што маюць мэту ў жыцці. А мэта кожнае істоты — знайсці вартае сябе мейсца ў гэтым бязладдзі, найменне якому — жыццё.

Арол пачуў далёкія галасы. Ён убачыў двух іншых хадыкаў, што падымаліся па той жа сцяжыне, якой прайшлі першыя. Цяжка рухаючыся, баючыся крануць параненае крыло, нахінуўся арол над абрывам. І ўгледзеў у руках гэтых хадыкаў стрэльбы. А першыя былі без іх, яны падаліся вышэй, туды, дзе растуць самыя рэдкія травы. Травамі гэтымі людзі лекуюць раны, якія маюць на шляху да волі. Тыя першыя былі падобныя да людзей, якія тоящца. Але чаму, каб назбіраць траваў на лекі, а значыцца, на здароўе, людзі мусяць таіцца? Чаму?

А гэтыя двое йшлі як на паляванне. І арол ужо выяўна чуў іхнюю размову. І была яна зусім іншай.

—Тут нікога няма, толькі арлы, — сказаў той, што йшоў наперадзе.

—І арлоў няма. І арлы не павінны тут жыць, — прамовіў другі, — трэба ачысціць горы ад усяго, у чым жыве дух сваволі... Нават ад арлоў.

Арол жа быў пэўны, што горы без арлоў і тых, хто любіць сваю радзіму, не змогуць жыць. Адабраць радзіму ў людзей ці арлоў ні ў кога не стане сілы. Як і горы не адабраць у неба. І калі дзе-небудзь на зямлі ўзнікне хоць адна гара без арла, без гнязда арлінага, без чалавека, які любіць вольную вышыню, гэта будзе проста мёртвая гара. І назавецца магілай гары.

—А ты казаў, што арлоў няма, — пачуўся голас хадыкі, што ўжо стаяў як не побач з арлом.

—Не ўзлятае, напэўна, паранены, адказаў другі, — яго б на пудзіла...

"Не выйдзе, — падумаў арол, — не натое жыў я ў гарах гэтулькі гадоў, каб здацца. Ніхто не даткнецца да мяне. Вядома, можна мяне забіць, але заняволіць— ніколі. Тут нарадзіўся я на волі й тут мушу свой век скончыць. Бо між намі — небам й гарамі, мной — заўсёды была згода".

Паранены арол апошнім высілкам кінуў сябе ў прорву й адно пашкадаваў, што падае, а не ўзлятае.

І ўсё-ткі, перамагаючы боль, паспрабаваў узмахнуць крыламі...

Пераклад з курдскай Рыгора БАРАДУЛІНА

ІМПРЭЗЫ

"Вязынка — 2002"

Купалаўскія юбілейныя святкаванні на філалагічным факультэце БДУ пачаліся 17 мая з паездкі ў Вязынку, арганізатары якой ласкава запрасілі дакрануцца да Купалавай калыскі, пахадзіць тымі сцежкамі, па якіх у свой час хадзіў юны Купала.

Інфармацыйна насычанай атрымалася афіцыйная частка. Каля помніку Песняру выступілі прэзідэнт Міжнароднага фонду імя Я. Купалы В. Рагойша, супрацоўнікі Дзяржаўнага літаратурнага музея Я. Купалы — галоўны захавальнік фондаў М. Чабатарэвіч, вучоны сакратар А. Бурбоўская. "Купала ў маім жыцці" — такую назву прапанаваў У. Рагойша для споведзі паэтэсы І. Багдановіч. Актыўна ўдзельнічалі ў свяце і студэнты-філолагі, з вуснаў якіх верш "А хто там ідзе?" прагучаў на рускай, украінскай, польскай, чэшскай, італьянскай, англійскай, нямецкай, кітайскай і інш. мовах.

У прысутнасці высокіх гасцей "Вязынкі — 2002" — выкладчыкаў літаратурных кафедраў філфака БДУ Л. Сіньковай, М. Хаўстовіча, Т. Казаковай, М. Кенькі, С. Крыловай і прадстаўнікоў адміністрацыі факультэта: намесніка дэкана П. Навойчыка і памочніка дэкана С. Важніка — адбыліся прэзентацыі зборніка студэнцкай паэзіі "Скрыпторый - 1", выдадзенага намаганнямі А. Пашкевіча, і дэбютнай кнігі прозы "Ляўша на тэнісным корце" студэнткі IV курса А. Бязлепкінай, а таксама знаёмства са студэнтамі з літаб'яднання Гродзенскага універсітэта "Наднёманскія галасы" пад кіраўніцтвам С. Тарасавай, якая падарыла на памяць некалькі асобнікаў аналагічнага студэнцкага зборніка "Vita".

Святлана САЧЭНКА, студэнтка IV курса філфака БДУ

У гонар музыканта

Урачыстая вечарына, прысвечаная 210-й гадавіне з дня нараджэння стваральніка сусветнавядомай оперы-буф, вялікага італьянскага маэстра Джаакіна Расіні, арганізаваная таварыствам дружбы "Беларусь—Італія" сумесна з пасольствам Італіі ў Рэспубліцы Беларусь, адбылася ў Доме дружбы. У канцэрце ўзялі ўдзел салісты Беларускай дзяржаўнай філармоніі і тэатра оперы і балета РБ Вольга Сотнікава, Дзмітрый Капілаў, Уладзімір Громаў, Ян Нелепа, Ілья Пеўзнер, Юлія Казіміровіч, Людміла Аляксандрава, Яўген Маркевіч, Вольга Бялкоўская, Таццяна Старчанка, Юлія Шчарбакова, канцэртмайстар Вольга Маркевіч. Прагучалі ўрыўкі з опер "Севільскі цырульнік", "Семіраміда", "Магамет II", "Вільгельм Тэль", "Папялушка". У суправаджэнні скрыпкі, фартэпіяна, кларнета слухачы маглі пачуць пранізлівыя і пяшчотныя дуэты, каваціны, арыі, рандо, квартэты, запальныя мелодыі знакамітага музыканта з Пезара. У зале прысутнічалі дыпламаты, акрэдытаваныя ў нашай краіне, а таксама прадстаўнікі грамадскасці.

М. Р.

Песня над Прыпяццю

У Петрыкаве жыве самабытны кампазітар, аўтар болей 60 песень і рамансаў — Георгій Кебец. Настаўнік музычнай школы, спявак царкоўнага хору, удзельнік святочных канцэртаў. Некалі ён быў дырэктарам РДК, загадчыкам аддзела райвыканкама. Але гэтыя пасады не давалі кампазітару дастатковай свабоды, часу і магчымасці займацца стварэннем музычных твораў.

Першая яго песня з'явілася на музычным небасхіле і прагучала на Беларускім тэлебачанні, калі Георгій быў яшчэ студэнтам Гомельскага музычнага вучылішча. І нават у арміі, служачы ў ансамблі песні і танца, ён працягваў песенную творчасць.

Валодаючы цудоўным голасам, тым не менш, першымі выканаўцамі песень Георгія Кебеца з'яўляюцца вучні петрыкаўскай музычнай школы і трыо літаратурна-музычнай гасцёўні. Шмат год петрыкаўскі кампазітар супрацоўнічае з паэтам Іванам Самахвалавым, які таксама стала жыве ў надпрыпяцкім горадзе і зачараваны прыгажосцю Палесся. Песні на вершы Івана Самахвалава кампазітар лічыць сваімі самымі ўдалымі творамі.

Вольга КЛЯШЧУК

Георгій Марчук

Афарызмы

Калі народ сам не захавае мову, ніякі ўрад яму гэта не зробіць.

●

О, вялікая навука дзіцячага наіву. Калі закрываюць парасон, дзіця плача: яму здаецца, што так парасон памірае.

●

Разбэшчаныя лянотаю, разбэшчаныя жанчынамі, разбэшчаныя грашыма, жахлівей за ўсё разбэшчаныя ўладаю.

●

Не будзь дурным, не кажы дурню, што ты пра яго думаеш.

●

Слабы той цар, гнеў якога бачыць народ.

●

"Пры капіталізме сумлення няма", — сказаў эмігрант, у якога і пры сацыялізме сумлення не было.

●

Старому чалавеку ўсё цяжэй і цяжэй быць шчаслівым.

●

Пытаем, чаму так узмоцнены спецслужбы пры таталітарных рэжымах? Каб хаваць заганы правадыроў і абслугоўваць свае ўласныя заганы.

●

У жыцці няма станоўчых і адмоўных бакоў, яны, гэтыя бакі, ёсць у людзей.

●

І маленькі сернік дае вялікі агонь.

●

Пра памяць усе ахвотна гавораць, але без карысці яе ніхто не трывожыць.

●

Для адных рукі патрэбны, каб цалаваць, для другіх, каб выкручваць.

●

Сацыялізм даўно мінуў, а некаторыя па-ранейшаму ўсё яшчэ лічаць сябе пісьменнікамі.

●

Адзін пісьменнік раіць другому: трэба ўсё спісваць з сябе. Але ж найперш гэта "сябе" трэба ўтварыць.

●

Шчасце, калі спраўдзіш сваю вартасць.

●

Прыгожыя не працуюць, на прыгожых працуюць.

●

Канфлікт паміж вернікамі і бязбожнікамі:
— Дай мне там, — просяць у Бога вернікі.
— Дай мне тут, — просяць бязбожнікі.

●

Няма такога чалавека, якога б не змяніла каханне.

ЧАСАПІС

Ён пераклаў "Пана Тадэуша"

Пятро Бітэль найбольш вядомы як перакладчык з польскай мовы твораў Адама Міцкевіча ("Пан Тадэуш", "Конрад Валенрод", "Гражына", "Дзяды", "Крымскія санеты", паэм і п'ес Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, аповесці Юзафа Ігнація Крашэўскага "Хата за вёскай". А друкавацца Пятро Іванавіч пачаў у 1929 годзе ў часопісе "Шлях моладзі" пад псеўданімам Леанід з-пад Вішнева. З таго часу свет пабачылі яго гістарычныя паэмы "Замкі і людзі" і "Сказанне пра Апанаса Берасцейскага", у якіх пісьменнік стварыў панараму рэалій Вялікага Княства Літоўскага. У 1990 годзе выдаў кнігу вершаваных аповесцяў "Дзве вайны".

Прайшло больш дзесяці гадоў, як Пятра Бітэля не стала. Але памяць пра яго на Валожыншчыне жыве. 14 чэрвеня ў Вішнеўскім Доме культуры адбылася літаратурная вечарына, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння Пятра Бітэля. На яе прыехалі з Мінска землякі паэта Віктар Шніп і Язэп Янушкевіч, з Маладзечна — дачка Пятра Іванавіча Ала Пятроўна, сын Андрэй Пятровіч і ўнучка Тамара Іванаўна з мужам. На вечарыну з Маладзечна краязнаўца і выдавец Міхась Казлоўскі прывёз нумар часопіса "Куфэрак Віленшчыны", які прысвечаны Пятру Бітэлю. Прысутныя змаглі паслухаць успаміны пра паэта, і яго творы, у выкананні школьнікаў Вішнеўскай школы. Кампазітар Уладзімір Гаркуша выканаў адну з песень на словы П. Бітэля. Арганізавалі вечарыну земляка валожынцы — раённы Цэнтр культуры і Цэнтральная бібліятэка.

Н.К.

"Праз церні і завалы..."

Споўнілася 90 гадоў з дня нараджэння паэта і перакладчыка Пятра Бітэля. Адпаведны і даце і постаці гэтага творцы падрыхтаваны ў Маладзечне падарунак: выдавец Міхась Казлоўскі прысвяціў Пятру Іванавічу Бітэлю пяты нумар гісторыка-краязнаўчага і літаратурна-мастацкага часопіса Віленскага краю "Куфэрак Віленшчыны".

Са спадчыны літаратара (асветніка, педагога, святара-пакутніка) прадстаўлены ўспаміны "Праз церні і завалы...", яго "Роздумы", урывак з гістарычнага рамана "Развал", перапіска... Не забыта і вершаваная творчасць Пятра Бітэля.

Своеасаблівай "падсветкай" для вызначэння пісьменніцкай і грамадзянскай службы гэтага магутнага духам чалавека выкарыстаны М. Казлоўскім рэцэнзіі Уладзіміра Караткевіча і Алега Лойкі. У раздзеле "Памяць" уражваюць матэрыялы Віктара Шніпа "І засталася між людзей душа...", а таксама "Успаміны пра настаўніка" Васіля Гарбачэўскага. "Цёплыя" ілюстрацыі А. Бярэзіна нагадваюць і воблік пашанотнага дзеяча нашай культуры, і навяваюць шкадаванне: не першаму чалавеку на нашым пакутным мацерыку мы не паспелі сказаць усё яшчэ пры жыцці.

Але тое, што зрабіў за сваіх суайчыннікаў галоўны рэдактар часопіса "Куфэрак Віленшчыны", прысвяціўшы юбілею Пятра Бітэля чарговы нумар свайго незвычайнага выдання, заслугоўвае падзякі. Цяпер не так сорамна за нашае спрадвечнае раўнадушша, "памяркоўнасць", вечны плач свой аб старонцы. Пятро Бітэль праз церні і завалы дайшоў да нас. А хто ж там, на далягляддзе? Заглянем у наступны "Куфэрак Віленшчыны".

Сяргей ПАНІЗНІК

АРХІВЫ

Крывёю сэрца

ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ УЛАДЗІМІРА КАРПАВА

Знаёмства з Уладзімірам Карпавым адбылося задоўга да сустрэчы з ім — праз ягоную кнігу "Нямігі крывавыя берагі". Месцамі пісьменнік так пранікнёна, прачула выпісаў эпізоды, што, чытаючы іх, на вачах выступалі слёзы, займала дых. Неўзабаве мною былі прачытаны раманы Уладзіміра Карпава "За годам год" і "Вясеннія ліўні". Сёння я не шкадую, што паспеў колькі добрых слоў сказаць пра яго кнігі нават у друку. Першая мая нататка пра Уладзіміра Карпава пачыналася з агульнавядомых біяграфічных фактаў: будучы пісьменнік нарадзіўся на беразе шырокай Волгі, дзіцячыя гады правёў у невялічкім горадзе Хвалынску, дзе, апрача рускай гаворкі, міжвольна насычаўся, як кожнае дзіця, вірлівым разнамоўем. У першыя паслякастрычніцкія гады, калі голад насунуўся на спустошаныя вайною, прыпаленыя сонцам прасторы Паволжа, калі жыць стала ўжо зусім невыносна, лёс прывёў У. Карпава ў Беларусь. У прыдняпроўскай вёсачцы Ёлча, што на Камарыншчыне, зжываўся, радніўся з барамі і пушчамі, захапляўся мовай беларусаў. І таму прызнанне крытыка Я. Герцовіча, што "слоўнікавы запас у пісьменніка даволі багаты", гучыць сёння як вялікая пахвала.

Скончыўшы сярэднюю школу К. Карпаў працаваў на лесапільным заводзе ў Рэчыцы. Здавалася б, дробязь, але ў пісьменніцкіх аўтабіяграфіях не часта сустрэнеш падобны факт. І, мусіць, не адзін бы твор напісаў У. Карпаў пра людзей Рэчыцы, калі б не Мінск, з якім знітаваўся лёс пісьменніка, сталіца дала найбагацейшы матэрыял, захапіла, акрыліла на творчасць. На маю думку, тэтралогію "Нямігі крывавыя берагі", "За годам год", "Вясеннія ліўні" і "Сотая маладосць" па ахопе падзей можна без перабольшання назваць мастацкім летапісам Мінска. Шырыня закранутых праблем і напал пачуццяў пры распрацоўцы вобразаў дазволілі мне яшчэ пры жыцці сказаць аўтару пра маштабнасць ягоных здзяйсненняў.

Першы з тэтралогіі У. Карпава раман "Нямігі крывавыя берагі" быў напісаны да таго, як шырокай грамадскасці сталі вядомымі факты з гісторыі барацьбы мінскага антыфашысцкага падполля, у якой самы актыўны удзел прымаў і сам пісьменнік.

Я цалкам згодзен з выказваннем пра раман "Нямігі крывавыя берагі" аўтара вядомых кніг пра мінскае падполле Іванам Новікавым, што, "чытаючы раман, я добра зразумеў, яе асабістае жыццё, асабістыя назіранні пісьменніка пераплаўляюцца ў мастацкую тканіну твора. Уладзімір Карпаў не з тых літаратараў, якія, "растекшись мыслью по древу", выдумляюць і баявыя эпізоды, і душэўныя перажыванні сваіх герояў. Ён не з тых, хто лічыць буйную, далёкую ад жыцця фантазію асноўнай крыніцай творчасці. Гартаю старонку за старонкай яго "Нямігу" і за кожным героем бачу жывы вобраз чалавека, які паслужыў прататыпам, бачу баявыя эпізоды, якія сапраўды адбываліся ў акупіраваным Мінску".

У рамане "За годам год", які, дарэчы, быў дэбютам Карпава ў вялікай прозе, пісьменнік запамінальна малюе вобраз Івана Зімчука, былога камісара партызанскай брыгады, на долю якога выпала аднаўляць разам з тысячамі патрыётаў-паплечнікаў па змаганні сталіцу Беларусі. Малюе праўдзіва, не ўтойваючы памылак героя, не прыгладжваючы рэчаіснасці.

Раман У. Карпава "Вясеннія ліўні" таксама чытаўся з вялікай увагай і цікавасцю. Мусіць, таму, што пісьменнік праўдзіва паказвае, што нават пасля гістарычнага XX з'езда КПСС нашай партыі, не ўсё стала на месца. Старыя звычкі і памылкі самі па сабе не адміраюць. Таму нейкі час на вытворчасці каламуцяць ваду людзі тыпу Кашына. Таму Міхаіл Шарупіч — прафорг цэха — шмат на якіх старонках рамана выглядае бязвольным, нерашучым.

Новыя творчыя мажлівасці выявіў У. Карпаў у рамане "Сотая маладосць", тэму якога сфармуляваў вельмі проста: "Чалавек і яго час, адказнасць кожнага з нас перад часам, залежнасць чалавека ад часу".

ПЕРАКЛАДЫ

"Маргер" па-беларуску

У "ЛіМе" за 12.04.2002 г. была надрукавана нататка С. Чыгрына "Невядомы аўтограф на кнізе Уладзіслава Сыракомлі". Працытую цалкам апошні абзац гэтай публікацыі: "Да сказанага вышэй хочацца дадаць, што паводле паэмы "Маргер" К. Горскім створана аднайменная опера. А на беларускую мову, на жаль, паэма Уладзіслава Сыракомлі яшчэ не перакладалася".

Так, сапраўды, паэма не перакладалася, але перакладзены некаторыя фрагменты тэксту оперы Канстанціна Кіпрыянавіча Горскага. Некалькі гадоў таму "Беларуская Капэла" падчас свайго фестывалю "Адраджэнне беларускай капэлы" паказала манаграфічную праграму з камерна-вакальных твораў кампазітара. У праграму былі ўлучаны і асобныя фрагменты оперы "Маргер". Пераклады на беларускую мову ажыццявіў наш выдатны паэт-перакладчык Васіль Сяргеевіч Сёмуха, які цяпер працуе над перакладам усяго тэксту лібрэта. Мне падалося, што чытачам "Літаратуры і мастацтва" было б цікава пазнаёміцца з асобнымі старонкамі гэтага адметнага твора. Але перш — слоўца пра кампазітара.

Канстанцін Горскі нарадзіўся ў Лідзе 13 чэрвеня 1859 года. Яго бацькі былі людзьмі адукаванымі, імкнуліся даць дзецям грунтоўную музычную адукацыю. Мараю бацькі — Кіпрыяна Горскага — было стварэнне сямейнага трыо. Паводле ўспамінаў сучаснікаў, сястра Канстанціна Ядвіга мела выдатныя піяністычныя здольнасці, брат Ян стаў віяланчэлістам. Канстанцін агульную адукацыю атрымаў у Віленскай філалагічнай гімназіі. Аднак цяга да музыкі была неадольная, і пасля гімназіі ён паступіў у Варшаўскі музычны інстытут, дзе вучыўся ў выдатнага польскага скрыпача Апалінарыя Концкага. Працягнуў вучобу ў Пецярбургскай кансерваторыі ў класе знакамітага прафесара Леапольда Аўэра. Паралельна вучыўся кампазіцыі ў класе прафесара М. Рымскага-Корсакава. У 1881 г. малады скрыпач бліскуча закончыў кансерваторыю са срэбным медалём і атрымаў дыплом на званне вольнага мастака...

...У 1919 г. К. Горскі як бежанец апынуўся ў Варшаве, дзе доўгі час безвынікова імкнуўся атрымаць пасаду выкладчыка ў кансерваторыі. Бліскучы скрыпач-канцэртант, каб не памерці з голаду, мусіў зарабляць на жыццё ігрой паміж сеансамі ў варшаўскіх кінатэатрах "Калізей" і "Вадэвіль". Толькі ў 1922 г. К. Горскі атрымаў месца, вартае свайго музыканцкага ўзроўню, — канцэртмайстра аркестра Вялікага тэатра ў Познані. Менавіта там адбылася прэм'ера яго оперы "Маргер" (13. 01. 1927 г.), аднак адбылася яна ўжо пасля смерці выдатнага музыкі, — ён памёр 31 мая 1924 г.

Кампазітарская спадчына Канстанціна Горскага багатая і разнастайная. Ён аўтар дзвюх опер: "Па хлеб" (паводле навэлы Г. Сянкевіча) і "Маргер" на лібрэта В. В. Вальгера (паводле "Маргера" и "Вешчага сну" У. Сыракомлі). Сюжэт апошняй пабудаваны на аснове падзей змагання Вялікага Княства Літоўскага з Тэўтонскім ордэнам. Не выключана, што кампазітар з'яўляецца і аўтарам лібрэта оперы, бо літаратара з імем "В. В. Вальгер" мы не ведаем. Хутчэй за ўсё, пад псеўданімам хаваецца імя самога К. Горскага, бо вядома, што на вершы Горскага пісалі музыку польскія і нямецкія кампазітары.

У часе другой сусветнай вайны загінула партытура оперы, захаваўся толькі яе клавір, выдадзены на пачатку XX ст. у Пецярбургу, з тэкстам лібрэта на польскай і рускай мовах.

Віктар СКОРАБАГАТАЎ,

мастацкі кіраўнік аб'яднання "Беларуская Капэла"

P. S. Аўтар гэтых радкоў скарыстаў даследаванне кандыдата мастацтвазнаўства Аляксандра Капілава пра жыццё і творчасць К. Горскага.

В.С.

Арыя Эгле

Я не люблю яго, о не!
Хто ж любіць ворага? А мне
Тым больш ніяк не выпадае, –
Мой бацька, – ён кіроўца краю,
Забараніў бы мне кахаць,
Не змог бы ён мне дараваць,
Бо лепей смерць, бо лепш загуба,
Чым ганьба ёй, дачушцы любай.

Мне ў сэрца жаль пранік глыбока,
Ахвотна б я дапамагла
Хоць у душы я зберагла
І жаль і літасць! Ён далёка,
І мне шкада, што моц тугі
На ім вісіць, як ланцугі.

Можа, маці недзе, можа, ёсць сястра,
Можа, слёзы льюць дарма!
Дзе яго зямля і Бог,
Там бы ён маліцца ў нядолі мог.
Пашкадуй яго, о добры Войча мой,
І хай рыцар слаўны вернецца дамоў!
І няхай пагодна заяснеюць дні,
Толькі... мне кахаць не будзе можна, не!

Арыя Рансдорфа

А заўтра, можа, смерць мяне з жыцця дастане,
Самкнуцца вочы і не ўбачу дня.
Яснее неба. Ах! Ды я не ўбачу дня,
Бо раніцой парвецца кола жыцця.
Аддаць жыццё гатоў — смерць у баі пачэсна,
Але ж не ў ганьбе — як стаптаны гад.
Нацешыцца яшчэ сваім юнацтвам рад
Пакуль змагання прагне маё цела.

Не адкрыты тут бой,
Каб плаціць нам уласнай крывёй,
Няма зброі ў руцэ
І далёка сябры, не са мной,
І падступны удар
З цела душу дастане мне.

Мушу гінуць як звер,
Што абраны на луп;
Будзе харчам мой труп,
Для здічэлых тых рэч,
Бо іх божышча смокча, як цмок,
Кроў з ахвяраў ліхіх перамог.

У край свой не вярнуся ўжо сваёй пары
І не пабачу больш бацьковай роднай хаты
На беразе; не мне гараць закаты
І ў моры тонуць водбліскі зары.

Бывайце ж, мілыя спакуслівыя панны,
З якімі успамін злучае слодыч кроз,
Нас рознымі павёў шляхамі звадны лёс,
Вам жыць далей, а мне... мне скон наканаваны.

О маці, маці! Табе ж бо колькі слёз
З вачэй пралье ліхая сына доля!
Усцеш яго, твая хай будзе воля
Ў апошнім сне, перш чым скарае лёс!

Дуэт Рансдорфа і Лютаса

ЛЮТАС

Дай клятву мне, што хоць ты не звязаны,
Уцёкамі не спляміш гонар свой
І сплаціш доўг удзячнасці тым самым.
Я за цябе заруку дам
Зарукай стану я за гонар твой.

РАНСДОРФ

Клянуся я!

ЛЮТАС

Я веру! Мы ужо не ворагі цяпер,
А можа долі зноў па волі Бога ты унікнуць зможаш,
І зменіцца прысуд, і ты дыхнеш лягчэй,
Надзеяй добраю абернецца трывога.

РАНСДОРФ

(пра сябе)

О, Эгле! Да глыбінь твая даброць кранае;
А чым жа, чым табе аддзячу я?

Нястомны ў сваіх пошуках, настойлівы ў барацьбе за новае, перадавое архітэктар Васіль Пятровіч Юркевіч. Ён ненавідзіць кар'ерыстаў, прайдзісветаў, што працуюць не галавою, а локцямі, каб трапіць у вучоны свет, кампраметацыяй іншых крыкам дабіваюцца сабе даброт, высокіх пасад...

Такія творы, зразумела, падабаюцца чытачам, выклікаюць на роздум, будзяць пачуцці, спрыяюць духоўнаму сталенню. І ўсё ж нярэдка можна пачуць — літаратура пра вайну не заўсёды глыбока, грунтоўна, праўдзіва паказваецца чалавек — змагар за волю, шчасце, незалежнасць. Таму зноў і зноў у кнігах і ў жыцці мы вяртаемся да тых першакрыніц, якімі з'яўляецца прачулае, узважанае і асэнсаванае слова непасрэдных удзельнікаў незабыўных падзей, непасрэдных здзяйсняльнікаў дзёрзкіх,гераічных аперацый. Іменна дакументам свайго часу, ваяўнічым сведкам барацьбы і перамог нашага народа ў гады вайны з'яўляецца кніга былога разведчыка, вядомага празаіка У. Карапава "Прызнанне ў нянавісці і любові". Цікава і захапляюча чытаюцца ўспаміны і апавяданні, што складаюць яе змест. У памяці ўзнаўляюцца гераічныя старонкі з жыцця і барацьбы мінскіх падпольшчыкаў, дыверсійных груп, якія "Вялікая зямля" засылала на акупіраваную тэрыторыю, у тыл ворага. Арганізоўвае, яднае матэрыял у цэласны твор дзейсная мужная асоба аўтара...

Так пачыналася тэлевізійная перадача па кнізе У. Карпава "Прызнанне ў нянавісці і любові", у якой прымалі ўдзел Герой Савецкага Саюза Марыя Осіпава і былы падпольшчык Алесь Матусевіч. Гледачы потым даслалі шмат добрых водгукаў на перадачу. Быў задаволены і Уладзімір Барысавіч, многа смяяўся, як чалавек, які выйграў чарговую бітву ў нялёгкай барацьбе. У гэтыя хвіліны ён быў нейкі абыякавы да таго, што пра яго пісалі або гаварылі крытыкі, сярод якіх было нямала нядобразычліўцаў, а то і проста непрыхаваных праціўнікаў.

Неяк з Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР паведамілі, што арганізуецца аўтарскі вечар Уладзіміра Карпава. Я з ахвотай пагадзіўся зрабіць тэлерэпартаж з яго. Тым больш, набліжалася дата вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. А ён жа, Карпаў, столькі зрабіў для набліжэння таго незабыўнага дня.

Адно мяне хвалявала: хто апрача падпольшчыкаў і партызан прыме ў ім удзел з пісьменнікаў, бо тэлевізійная перадача ў большасці выпадкаў выйграе за кошт цікавых яе ўдзельнікаў. І што вы думаеце: на вечар прыйшлі народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін, народная артыстка БССР Марыя Захарэвіч, паэты і празаікі Іван Новікаў, Мікола Аўрамчык, Іван Грамовіч, Алесь Асіпенка, Алесь Савіцкі... Якая то была цікавая, змястоўная сустрэча!

Крыху пазней дамовіліся сустрэцца з Уладзімірам Барысавічам адзін на адзін, каб пагаварыць пра асабістыя справы. Ды мне выпаў чарговы адпачынак. Паехаў я ў родную сваю вёску, пішу сабе аповесць пра землякоў, здабываю сена цешчанай карове, паліва на зіму. А тут горкая навіна: "Звязда" паведаміла — памёр Уладзімір Барысавіч Карпаў. Газета прыйшла са спазненнем...

У Карпава здало сэрца. Ён пісаў раман. Ён меўся адкрыць для гісторыі некалькі амаль невядомых старонак з гісторыі падпольнай барацьбы ў гады вайны ў Мінску. Пісаў, як заўсёды, натхнёна, з запалам, можна сказаць, крывёю сэрца...

Валянцін МЫСЛІВЕЦ

АСОБЫ

Нашанівец Адвард Будзька

Пачынальнікамі беларускай нацыянальнай перыёдыкі сталі газеты "Наша доля" і "Наша ніва". Першая на шостым нумары была зачынена за рэвалюцыйны змест, а другая, хаця і з вялікімі перашкодамі, выходзіла да 1915 года. У "Нашай ніве" пачыналі Максім Багдановіч, Максім Гарэцкі, Алесь Гарун, Цішка Гартны, Змітрок Бядуля, Алесь Гурло. Друкаваліся тут і малавядомыя сёння аўтары. Па пэўных прычынах, страхуючыся ад нападкаў цэнзуры, некаторыя хаваліся пад рознымі псеўданімамі. Звестак з іх жыцця амаль не захавалася, часам невядомае нават сапраўднае прозвішча, творчая спадчына згублена і забыта, за выключэннем газетных вершаў і апавяданняў, змешчаных найбольш у "Нашай ніве". Парознаму складалася іх жыццё, не ўсім удалося стаць вядомымі пісьменнікамі і паэтамі. Але варта прыгадаць некаторыя імёны, раскрыць іх псеўданімы, бо яны былі адраджэнцамі, пачынальнікамі грамадска-літаратурнага і культурнага руху на пачатку новага стагоддзя. Сярод іх — Адвард Будзька, пачынальнік беларускага школьніцтва, незаслужана аб'яўлены ворагам народа.

Нарадзіўся Адвард (Эдвард) Будзька ў Будславе Вілейскага павета (цяпер Мядзельскі раён Мінскай вобласці). Закончыў чатырохкласную школу, паехаў у Рыгу, паступіў у політэхнічны інстытут, але з-за недахопу фінансавых сродкаў вымушаны быў пакінуць вучобу. Дарэчы, многія з будслаўскай моладзі ехалі ў Рыгу вучыцца і працаваць. Так, Паўліна Мядзёлка, далёкая сваячніца і суседка Адварда Будзькі, таксама вучылася ў Рызе разам з яго будучай жонкай Валерыяй. За ўдзел у антыўрадавым мітынгу Будзьку пасадзілі ў астрог, пасля чаго ён пераехаў у Вільню.

З першых нумароў "Нашай нівы" Адвард Адамавіч быў яе актыўным супрацоўнікам. Ён дасылаў карэспандэнцыі пра жыццё будслаўскіх местачкоўцаў, справы беларусаў у Рызе. Займаўся літаратурай. Сябра Міхась Белямук успамінае: "Ягоныя вершы "Лес", "Восень", "Шпак", "Час ляціць", "З турмы" былі надрукаваныя, але ён у Чыкага расказваў, што некалькі яго вершаў было ў папках рэдкалегіі, і ён не дамагаўся, каб іх друкавалі, бо былі іншыя паэты, якія, як казаў Будзька, "лепшыя за мяне, не кажучы пра Янку Купалу і Якуба Коласа, з якімі я быў асабіста знаёмы". На жаль, тыя вершы і артыкулы, якія ён у рэдакцыю не аддаў, загінулі падчас апошняе вайны".

На пачатку першай сусветнай вайны сям'я Будзькаў выехала ў Пецярбург. Там разам з Цішкам Гартным Адвард Адамавіч выдаваў "Дзянніцу", у якой змяшчаў артыкулы пад псеўданімам Акцюб ці ініцыяламі А.Б., Э.Б., Е.Б.

У 1916 г. ён быў рэдактарам-выдаўцом штотыднёвіка грамадска-палітычнай газеты ліберальна-асветніцкага накірунку "Светач", якая прапагандавала ідэі культурна-нацыянальнага адраджэння Беларусі, выступала за пашырэнне беларускамоўных школ. У снежні 1917 г. Будзька стаў удзельнікам Першага Усебеларускага Кангрэсу, увайшоў у раду Беларускай Народнай Рэспублікі.

У той час Беларускі настаўніцкі саюз выказаў патрэбу ў "нацыяналізацыі беларускай школы", арганізацыі беларускіх школ, настаўніцкіх курсаў. Сялянскі сход адобрыў ідэю будаўніцтва гімназіі ў Будславе. Будынак валаснога ўпраўлення пастанавілі забраць пад школу, выбралі камітэт, які ўзначаліў А. Будзька. Інжынер Лявон Вітан-Дубяйкоўскі, знаёмы Будзькі па Вільні, распрацаваў план двухпавярховага будынка ля гімназіі. Восенню 1918 г. ён быў амаль гатовы. А сама гімназія пачала дзейнічаць зімой 1917 г. у будынку валаснога ўпраўлення. З дапамогай А. Будзькі тут выходзіў часопіс "Светач", дзейнічалі аркестравы, танцавальны, харавы гурткі, а таксама культурна-асветны гурток "Вяночак", драматычная секцыя якога ладзіла ў мястэчку спектаклі па п'есах "Паўлінка" Янкі Купалы, "Па рэвізіі", "Пашыліся ў дурні" М. Крапіўніцкага, "Як яны жаніліся" А. Валодзькі і іншыя. Для пазашкольнай моладзі пры гімназіі арганізавалі вячэрнія асветныя лекцыі.

Восенню 1919 г. у Будслаў прыйшлі польскія салдаты, гімназію зачынілі, а Будзька выехаў у Вільню, бо яму пагражала пакаранне за скарыстанне лесу пана Аскеркі на пабудову гімназіі.

У 1920 г. асабістым коштам А. Будзькі і друкара У. Знамяроўскага выйшла ў свет "Гісторыя беларускай літаратуры" М. Гарэцкага.

У Вільні Адвард Адамавіч быў сябрам управы Віленскага Саюза кааператараў і працаваў там кантралёрам. Ён хацеў палепшыць жыццё на вёсцы праз кааператыўныя прадпрыемствы. Аднак польскія ўлады адшукалі яго там, і ён пераехаў у Коўна, потым у Дзвінск. Па яго ініцыятыве ў Дзвінску ствараецца культурна-асветніцкае таварыства "Бацькаўшчына", пачынаецца падрыхтоўка да адкрыцця беларускай гімназіі.

Напярэдадні 1939 г. Будзька разам з сям'ёй пераязджае ў Будслаў, каб стала пасяліцца там. Купіў зямлю і лес для будаўніцтва хаты, але ў 1939 г. савецкая ўлада ўсё забрала. Прыйшлося пераехаць у Вілейку, уладкавацца на працу бухгалтарам. Паводле ўспамінаў ягоных дачок, "бацька ў 1940 годзе па справах працы ездзіў у Мінск, дзе наведаў сваіх старых сяброў: Купалу, Бядулю, здаецца, Коласа. Вярнуўся ён з гэтай паездкі падаўленым. Першы раз бачылі бацьку ў такім стане. Ён не мог забыць сваёй сустрэчы з Купалам, які быў яго добрым сябрам. Бацька шчыра расказваў пра падзеі, пра жыццё, Купала ўсё ж маўчаў. Адчувалася, што той напалоханы бацькоўскай шчырасцю і нечага баяўся. З. Бядуля пасля гутаркі з ім ціха запытаўся: "Дык ты з усімі так гаворыш? Глядзі, больш нікому так не кажы". Бацька быў вельмі здзіўлены, бо ён гаварыў тое, аб чым думаў".

У пачатку вайны Адвард Будзька працаваў у Мінску інспектарам гарадской управы, настаўнічаў у Баранавічах. З наступленнем савецкай арміі мусіў адправіцца з жонкай у Варшаву, адтуль у Заходнюю Германію (Ватэнштэцкі лагер для перамешчаных асоб). У 1950 годзе выехаў у ЗША. Пасля выхаду на пенсію актыўна займаўся грамадскай працай. Памёр 14 жніўня 1958 года.

У мястэчку Будслаў на вуліцы Зялёнай захавалася хата на высокім падмурку, у ёй калісьці жыў беларускі паэт, публіцыст, выдавец Адвард Будзька. Тут жа побач, на гэтай вуліцы, прайшлі апошнія гады жыцця яшчэ адной славутай дачкі нашай Бацькаўшчыны —Паўліны Мядзёлкі. Яна пахавана на старых Будслаўскіх могілках побач са сваім бацькам. А. Будзька, які так марыў жыць і памерці дома, — у далёкім Чыкага на могілках святога Вайцэха.

Ірына САМАТОЙ
г. Віцебск

Калектыў кафедры беларускай літаратуры XX стагоддзя БДУ выказвае шчырае спачуванне Любові Аляксандраўне Ламецы ў сувязі з вялікім горам — смерцю маці.

Саюз беларускіх пісьменнікаў выказвае глыбокае спачуванне празаіку Леаніду МАРАКОВУ з прычыны напаткаўшага яго вялікага гора — смерці маці.

Рэдакцыя штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва" выказвае спачуванне нашаму актыўнаму аўтару пісьменніку Леаніду МАРАКОВУ з прычыны вялікага гора — смерці маці.

Выдавецтва "Сучасны літаратар" выказвае спачуванне Уладзіміру СЦЯПАНУ і ягонай сям'і ў сувязі са смерцю бацькі.

З цялесных путаў дух мой вызваляе,
Ахвярай будзе хай душа твая.

РАНСДОРФ

(разам з Лютасам)

А мне спачыць пара ад цяжкіх бітваў
Мой дух зачэрпне сіл з малітвы слоў,
Цярплівасць я, знайду я у малітвах,
Забуду клопаты, як Эгле ўбачу зноў.

ЛЮТАС

(разам з Рансдорфам)

Табе спачыць пара ад цяжкіх бітваў
І сіл зачэрпнуць з душацешных сноў;
З крывавых ран здымі ярмо малітвай,
І хутка мужнасць ты здабудзеш зноў!

Арыя Лютаса

Коцяцца Нёмана воды,
Шэпча таемна іх шум,
Рэхам прадаўняй прыгоды
Голас паданняў-і дум.

Нёман! Ты помніш, як орды
Ворагаў тут пераймаў,
Як у кіпучыя воды
Стрэламі бітых прымаў.

Тут гартаваў я у бітвах
Меч на крыві крыжакоў,
Ах! Ды пакінуў я многа,
Многа магілаў братоў.

Дзе ж вы, сябры баявыя,
Верныя, мужныя воі!
Дзе вашы душы жывыя,
Дух дзе лунае, героі!

Можа мне наканавана
Коштамі вашага болю
Зведаць тут позна ці рана
Роднай Літвы маёй волю.

Веру ў святасць нашай справы
Веру ў светлы дзень,
Як Літва у поўні славы
Ворагаў змяце.

І убачыць люд хрышчоны,
Што жыве ліцвін,
Вольналюбны і нязломны,
Хрысціянскі сын,

Што ліцвін зусім не гіне
Ад няўдач і скрух,
Бо жыве ў адважным сыне
Прабацькоўскі дух.

Можна ўліць у веру смуты,
Зманлівых аблуд,
А накінуць нельга путы
На ліцвінскі люд.

Як бацькі, так сёння дзеці
Хочуць вольна жыць,
Лепш памерці, вольнымі памерці,
Чым у рабстве быць.

Пераклад Васіля СЁМУХІ

Фестывалі

Свята гісторыі ў "Наваградзкім замку"

29-30 чэрвеня ў старажытным Наваградку адбудзецца II сярэднявечны фэст "Наваградзкі замак". Першая буйнамаштабная сярэднявечная імпрэза пад гэтай назвай праводзілася на Беларусі ў 2000-м годзе. Тады фэст сабраў велізарную колькасць удзельнікаў і гасцей, што дазволіла арганізатарам з поўным правам назваць яго буйнейшым сярэднявечным відовішчам ва Усходняй Еўропе. Зараз колькасць удзельнікаў значна павялічыцца — заяўкі падалі каля 800 чалавек з васьмі краін Еўропы.

Сёлета фестывальная праграма будзе яшчэ больш разнастайнай і насычанай, чым у пазамінулым годзе. Рыцарскі турнір, у гэтым годзе вырашана было назваць турнірам караля Міндоўга — у гонар першага прызнанага караля гэтых земляў. Рыцары будуць спаборнічаць у двух намінацыях: "ратнае кола" (IX-XIIстст.) і рыцарскі турнір (XIII-XVIстст.). Пераможцы, адпаведна традыцыі, атрымаюць каштоўныя прызы. У нядзелю адбудзецца цэнтральная падзея фэста — інсцэніроўка бітвы 1394 года. Падчас штурма замкавых муроў плануецца выкарыстанне рэканструяванай сярэднявечнай артылерыі. На самой Замкавай гары будуць узведзеныя часовыя драўляныя канструкцыі, каб зрабіць штурм больш відовішчным. Яшчэ адна ваенная забава — групавая сутычка (бугурт), які з`яўляецца фірмовай імпрэзай Наваградзкага фэсту. Ён традыцыйна адбываецца ў цёмную пару сутак пад жывую сярэднявечную музыку ў святле паходняў і ліхтароў. Аматары больш спакойных забаў пабачаць пастановачныя паядынкі і тэатралізаваныя праграмы, ваярскія гульні, паслухаюць выступы музычных гуртоў, азнаёмяцца з тэхналогіямі старадаўніх рамёстваў, навучацца танцаваць сярэднявечныя танцы ў межах праекта "Танчым разам!". Не абыдзецца свята і без вясёлага кірмаша са сцэнкамі, атракцыёнамі, забавамі — прымеркай сярэднявечных даспехаў і строяў з фатаграфаваннем, сярэднявечнымі "катаваннямі", жанглёрамі, акрабатамі ды інш. За два фестывальныя дні гурт мастакоў пад кіраўніцтвам Гэніка Лойкі выявіць з пяску двухметровую скульптуру караля Міндоўга. У суботу адбудзецца тэатралізаваная каранацыя Міндоўга — у гонар 750-годдзя з часу гэтай важнай для нашай краіны гістарычнай падзеі.

Арганізатарамі фэста сярэднявечнай культуры сталі Міжнародная сярэднявечная ліга, мінская Унія "Меч і Крумкач" і Наваградзкі райвыканкам.

Юлія ПАЛАЧАНІНА

Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ У 2002 ГОДЗЕ

У Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі (далей — АМ) для атрымання бясплатнай вышэйшай адукацыі (калі яна атрымліваецца ўпершыню) прымаюцца на падставе сярэдняй спецыяльнай адукацыі і на конкурснай аснове грамадзяне РБ і беларусы, якія пражываюць за яе межамі, грамадзяне Казахстана, Кыргызстана, Таджыкістана, а таксама асобы, якія пастаянна пражываюць у Беларусі або маюць статус бежанца.

Абітурыенты, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсе на планавыя месцы, грамадзяне іншых (акрамя пералічаных) дзяржаў СНД, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, могуць быць залічаны ў АМ (толькі на дзённую форму навучання) па кантракце на ўмовах поўнай кампенсацыі выдаткаў на навучанне ў межах колькасці месцаў для платнага навучання, вызначаных прыёмнай камісіяй па кожнай спецыяльнасці і кірунку. Калі колькасць заяў на платнае навучанне перавышае колькасць выдзеленых месцаў, паміж абітурыентамі праводзіцца конкурс па выніках уступных экзаменаў.

Замежныя грамадзяне могуць быць залічаны па выніках праслухоўвання з аплатай навучання згодна асобных кантрактаў (толькі на дзённую форму навучання або на стажыроўку). Для атрымання другой і наступнай вышэйшай адукацыі могуць быць залічаны асобы на ўмовах поўнай аплаты навучання (акрамя спецыянальнасцей "Кампазіцыя", "Спевы", "Оперна-сімфанічнае дырыжыраванне") юрыдычнымі або фізічнымі асобамі. Умова прыёму і навучання вызначаюцца адпаведным палажэннем.

Прыём ажыццяўляецца па наступных спецыяльнасцях і спецыялізацыях:

Фартэпіяна
Кампазіцыя
Музыказнаўства
Музычная беларусістыка
Скрыпка
Альт-віяланчэль-кантрабас-арфа (адзіны конкурс)
Флейта
Габой
Кларнет
Фагот
Саксафон
Труба-валторна-трамбон-туба-ударныя інструменты (адзіны конкурс)
Баян-акардэон
Цымбалы
Балалайка
Домра
Гітара
Харавое дырыжыраванне
Оперна-сімфанічнае дырыжыраванне
Спевы — мужчынскія галасы
Спевы — жаночыя галасы
Харэаграфічнае мастацтва

Абітурыенты здаюць наступныя экзамены: спецыяльнасць; беларуская або руская (па выбары) мова і літаратура (пісьмовы пераказ).

Экзамен па спец. складаецца з раздзелаў, кожны з якіх ацэньваецца асобнай ацэнкай: выкананне праграмы "Дырыжыраванне", выканальніцкія спецыяльнасці, "Спевы"); дырыжыраванне аркестрам (спец. "Оперна-сімфанічнае дырыжыраванне"); выкананне ўласных твораў (спец. "Кампазіцыя"); музычная літаратура ("Музыказнаўства"); гармонія (усе спецыяльнасці, акрамя "Спевы"); элементарная тэорыя музыкі ("Спевы"); сальфеджыо (усе спец.); фартэпіяна ("Музыказнаўства", "Кампазіцыя", "Дырыжыраванне"); калёквіум (усе спец.)

Экзамен па спецыяльнасці для паступаючых на спец. "Харэаграфічнае мастацтва" ўключае экзерсіс ля станка і на сярэдзіне ў аб'ёме харэаграфічнага вучылішча; метадычную раскладку рухаў урока класічнага танца; калёквіум.

Спец. "Кампазіцыя", "Спевы", "Харэаграфічнае мастацтва", "Музычная беларусістыка", "Оперна-сімфанічнае дырыжыраванне" — прыём толькі на дзённае навучанне. Па астатніх спец. і кірунках прыём праводзіцца на дзённую і завочную формы навучання.

Прыём на філіялы кафедр АМ на базе Брэсцкага дзяржаўнага музычнага каледжа і Гродзенскага муз. вучылішча — па наступных спецыяльнасцях і кірунках.Брэсцкі МК — фартэпіяна, скрыпка, духавыя інстр., баян-акардэон, гітара; Гродзенскае МВ — харавое дырыжыраванне, ф-на, скрыпка, гітара. Паступаць на філіялы кафедр АМ на базе Брэсцкага МК і Гродзенскага МВ маюць права асобы з мэтавымі накіраваннямі адпаведна Брэсцкага і Гродзенскага абл. упраўленняў культуры.

Залічэнне праводзіцца па конкурсе толькі сярод асоб, якія прадставілі ў прыёмную камісію ў тэрмін да 15 ліпеня 2002 г. арыгінал дакумента дзяржаўнага ўзору аб сярэдняй адукацыі, а таксама арыгінал сертыфіката цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай або рускай мове (для тых, хто ў ім удзельнічаў).

Асобы, якія скончылі сярэднюю агульнаадукацыйную навучальную установу з залатым (сярэбраным) медалём, вучэбны комплекс гімназія-каледж, ССНУ (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай, а таксама лаўрэаты і дыпламанты міжнародных юнацкіх і дарослых конкурсаў па выканальніцкіх спец. (у якасці салістаў), конкурсаў па кампазіцыі; лаўрэаты нацыянальных конкурсаў па выканальніцкіх спец. (рангам ні ніжэй, чым конкурс сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, у якасці салістаў), конкурсаў па кампазіцыі (перамогі на вышэйпералічаных конкурсах павінны быць атрыманы ва ўзросце не маладзей за 16 гадоў) здаюць раздзел экзамена па спец. "выкананне праграмы" або "выкананне ўласных твораў". Пры атрыманні ацэнкі ніжэй за "5" яны здаюць усе астатнія экзамены. Да ўдзелу ў конкурсе на спецыяльнасць "Кампазіцыя" дапускаюцца толькі абітурыенты, якія атрымалі на раздзеле экзамена па спецыяльнасці "выкананне ўласных твораў" адзнаку "4", "чатыры з паловай" або "5".

Абітурыенты, якія скончылі сярэднюю агульнаадукацыйную навучальную установу з залатым (сярэбраным) медалём, вучэбны комплекс гімназія-каледж, ССНУ (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай, паступаючыя на спец. "Харавое дырыжыраванне", пры атрыманні адзнак "5" на раздзелах экзамена па спец. "выкананне праграмы", "сальфеджыо", "гармонія" вызваляюцца ад наступных экзаменаў.

Абітурыенты, паступаючыя на "Музыказнаўства", "Харэаграфічнае мастацтва", якія скончылі сярэднюю агульнаадукацыйную навучальную ўстанову з залатым (сярэбраным) медалём, вучэбны комплекс гімназія-каледж, ССНУ (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай, вызваляюцца ад экзаменаў па мове і літаратуры пры атрыманні адзнак "5" па ўсіх раздзелах экзамена па спец.

Пераможцы міжнародных рэспубліканскіх (I, II, III месца) прадметных алімпіяд навучэнцаў ССНУ па беларускай ці рускай мове і літаратуры, праведзеных Міністэрствам адукацыі РБ у бягучым навучальным годзе, вызваляюцца ад здачы ўступнага экзамену па мове і літаратуры з выстаўленнем ацэнкі "5".

Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых ацэнак на ўступных экзаменах па ўсіх формах навучання залічваюцца:

— воіны-інтэрнацыяналісты;

— дзеці-сіроты і дзеці, што засталіся без апекі бацькоў;

—дзеці з сем'яў вайскоўцаў або рабочых і служачых, што займалі штатныя пасады ў вайсковых часцях, якія загінулі (памерлі) ці сталі інвалідамі ў час ваеннай службы або працы ў складзе савецкіх войск на тэрыторыях дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама дзеці з сем'яў вайскоўцаў, якія загінулі (памерлі) у мірны час пры праходжанні ваеннай службы;

— дзеці ў сем'яў асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, якія загінулі (памерлі) або сталі інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама якія загінулі (памерлі) у мірны час пры выкананні службовых абавязкаў;

—дзеці з сем'яў асоб начальніцкага і радавога складу органаў фінансавых расследаванняў РБ, якія загінулі (памерлі) пры выкананні службовых абавязкаў;

— інваліды I і II груп, а таксама дзеці-інваліды, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне і якія могуць наведваць заняткі;

— асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 18 закона РБ "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на ЧАЭС". Абітурыенты гэтай катэгорыі, якія закончылі навучальныя ўстановы з дыпломам "з адзнакай" (з выдатнымі ацэнкамі), залічваюцца ў АМ па выніках (пры атрыманні станоўчай ацэнкі) раздзела экзамена па спец. "выкананне праграмы", або "выкананне ўласных твораў", або "гармонія" і "сальфеджыо" (па спец. "Музыказнаўства", "Харавое дырыжыраванне");

— беларусы замежжа па рэкамендацыях беларускіх суполак ці навучальных устаноў на спецыяльна вылучаныя органамі дзяржаўнага кіравання месцы ў межах кантрольных лічбаў прыёму ў ВНУ, якія фінансуюцца за кошт сродкаў бюджэту.

Пераважнае права на залічэнне па ўсіх формах навучання пры аднолькавай колькасці конкурсных балаў маюць: інваліды III групы пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў; асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 19, 20, 23, 24, 25 закона РБ "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на ЧАЭС"; звольненыя ў запас вайскоўцы, якія маюць ільготы, устаноўленыя заканадаўствам, і рэкамендацыі воінскіх часцей; асобы з балам за выкананне праграмы або ўласных твораў.

У выпадку роўнасці належных балаў, перавагай пры залічэнні карыстаюцца абітурыенты, якія атрымалі больш высокі бал на экзамене па мове і літаратуры (пісьмовы пераказ).

Залічэнне абітурыентаў на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў ажыццяўляецца на філіялы кафедр АМ на базе Брэсцкага МК і Гродзенскага МВ, а таксама на завочную форму навучання па асобным конкурсе.

Абітурыенты прадстаўляюць у прыёмную камісію наступныя дакументы:

— заява ўстаноўленага ўзору на імя рэктара;

— арыгінал або яго натарыяльна завераная копія ці ксеракопія:

—дакумента дзяржаўнага ўзору аб сярэдняй адукацыі,

—сертыфіката цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай або рускай мове і літаратуры (для тых, хто ў ім удзельнічаў);

— медыцынскай даведкі па форме 086У (абавязкова — праходжанне ўсіх прышчэпак),

— даведкі ўрача-фаніятра (спец. "Спевы", "Харавое дырыжыраванне"),

— заключэння ўрачэбна-кваліфікацыйных камісій (для інвалідаў I-III груп, а таксама дзяцей-інвалідаў),

— выпіскі з працоўнай кніжкі (для тых, хто працуе),

— даведкі службы занятасці насельніцтва (для тых, хто на яе ўліку),

— даведкі выканкама сельсавета, што пацвярджае пастаяннае пражыванне ў сельскіх населеных пунктах на менш за два гады (для паступаючых на падрыхтоўчае аддзяленне па спец. "Спевы";

— мэтавае накіраванне (для адпаведнай катэгорыі абітурыентаў);

— 6 фотакартак памерам 3х4 см;

— дакументы, якія пацвярджаюць права абітурыента на льготы, устаноўленыя заканадаўствам РБ;

— дакументы, якія пацвярджаюць перамогі ў музычных конкурсах, у арыгінале.

— Пашпарт або іншае пасведчанне асобы, выдадзенае органамі МУС Беларусі (прад'яўляецца абітурыентам асабіста).

Абітурыенты, якія паступаюць не ў год атрымання сярэдняй адукацыі, абавязаны прадставіць дакументы, якія пацвярджаюць іх вучобу ці работу за гады, што папярэднічалі паступленню (дыплом, выпіска з працоўнай кніжкі або даведка службы занятасці насельніцтва, інш.).

Прыём дакументаў на дзённую форму навучання з 17.06 па 30.06 з 10.00 да 16.00, акрамя нядзелі 23.06, на філіялах кафедр АМ у Брэсце і Гродне — з 17.06 па 5.07 да 13.00 гадзін.

Прыём дакументаў на завочнае навучанне і на "Оперна-сімфанічнае дырыжыраванне" — з 9.09 па 14.09 з 10.00 да 16.00.

Кансультацыі для абітурыентаў дзённай формы навучання — з 28 па 30 чэрвеня.

Уступныя экзамены на дзённую форму навучання — з 1 па 15.07; на філіялы кафедр АМ у Брэсце і Гродне — з 5 па 15 ліпеня.

На перыяд уступных экзаменаў абітурыентам дзённай формы навучання даецца інтэрнат (з 28.06, толькі для абітурыентаў факультэтаў АМ у Мінску) з аплатай кошту пражывання.

Уступныя экзамены на завочную форму навучання і на "Оперна-сімфанічнае дырыжыраванне" — з 16.09 па 23.09; кансультацыі для абітурыентаў завочнай формы навучання — 13-14 верасня. На завочную форму навучання маюць права паступаюць толькі асобы з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія працуюць па спецыяльнасці. Паступаючыя на месцы мэтавага прыёму павінны мець накіраванні абласных упраўленняў культуры.

На падрыхтоўчае аддзяленне "Спеваў" здаюць адзін экзамен па спец. з двух раздзелаў, кожны з якіх ацэньваецца асобнай адзнакай ("пяць" (5), "чатыры з паловай" (4,5), "чатыры" (4), "тры з паловай" (3,5), "тры) (3), "два" (2); першы раздзел — у класе, другі — канцэртнай зале.

Паступаючыя на падрыхтоўчае аддзяленне "Кампазіцыі" (прымаюцца толькі асобы з сярэдняй спец. муз. адукацыяй) прадстаўляюць уласныя творы, якія ацэньваюцца ацэнкамі: "пяць" (5), "чатыры з паловай" (4,5), "чатыры" (4), "тры з паловай" (3,5), "тры) (3), "два" (2). Залічваюцца абітурыенты з найбольш высокім балам.

Гэтая абвестка друкуецца са скарачэннямі. Азнаёміцца з правіламі прыёму ў акадэмію і атрымаць кансультацыю па іншых пытаннях можна па адрасе:

— 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30, Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі. Тэл. прыёмнай камісіі: 206-59-60.

— 212000, г. Магілёў, вул. Крыленкі, 12. Педагагічны факультэт БАМ. Тэл. (0222)25-28-14.

— 224000, г. Брэст, вул. Гогаля, 7, музычны каледж імя Р. Шырмы,

— 230015, г. Гродна, б-р Ленінскага камсамолу, 23, музычнае вучылішча.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА ЛіМ ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

ЗАСНАВАЛЬНІК

Саюз беларускіх пісьменнікаў

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

У 1982 годзе ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

Галоўны рэдактар

Алесь ПІСЬМЯНКОЎ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Вольга БАРАБАНШЧЫКАВА,
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Алесь ГАЎРОН — *адказны сакратар,*
Уладзімір МАРУК — *намеснік галоўнага рэдактара,*
Яўген РАГІН,
Людміла РУБЛЕЎСКАЯ,
Віктар ШНІП — *першы намеснік галоўнага рэдактара*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:

220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:

прыёмная рэдакцыі — 284-8461
намеснікі галоўнага рэдактара — 284-8525, 284-7985

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-8204
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-7985
літаратурнага жыцця — 284-8462
крытыкі і бібліяграфіі — 284-7985
паэзіі і прозы — 284-7985
музыкі — 284-8153
тэатра, кіно — 284-8153
выяўленчага мастацтва — 284-8462
фота-карэспандэнт — 284-8462
бухгалтэрыя — 284-8462
Тэл./факс — 284-7965

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра тыднёвіка "ЛіМ"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"

(г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79)

Індэкс 63856 Наклад 2217

Нумар падпісаны ў друк 28.06.2002 г. у 17.30

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715

Заказ 1501

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12